Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЖНІЎНЯ 2016 г. СУБОТА № 165 (28275)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Будні ўчастковага інспектара**

СТАР. 7



**Пакліканне жыць з радасцю**

СТАР. 8



**Ці лёгка прадаць антыкварыят**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**282,7 рубля**

*склаў сярэдні памер пенсій у краіне ў ліпені бягучага года, што ў 2,2 раза перавышае бюджэт пражытковага мінімуму. Сярэдні памер пенсій па ўзросце ў ліпені гэтага года склаў 291,2 рубля. У органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў ліпені на ўліку стаяла 2 603,7 тыс. пенсіянераў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9511 | ▼ |
| Еўра | 2,2022 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0301 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0766 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Летні дзень год корміць

## Як жыве пчаляр і сыраробі з Гаці

Самы адказны і клопатны час на падворку Брэкманаў — раніца і вечар. Здаецца, жыццё вясковай сям'і цалкам залежыць ад гэтых дзвюх фаз сутак, якія быццам дыктуюць гаспадарам свае непахісныя правілы і ўмовы. Сяргей і Тамара Брэкманы з вёскі Гаць вядуць традыцыйны сялянскі лад жыцця, у іхняй натуральнай гаспадарцы шмат свойскай жывёлы і птушак. І гэта вымагае асаблівага распарадку. Сустракаць дзень на досвітку ў вёсцы — няпісаны закон. Прачынацца з пеўнямі — не даніна модзе, а неабходнасць, выпрацаваная з маладых гадоў прывычка. «Хто рана ўстае, таму Бог падае!» — за народнай мудрасцю паўтараюць гаспадары.

СТАР. 5



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Круглы стол

## ЯК НАСТРОІЦЦА НА ШКОЛУ?

**Хтосьці з дзяцей сёлета пойдзе ў першы клас, а нехта выходзіць на фінішную прамую. У кожнага дзіцячага ўзросту — свае асаблівасці. Аднак агульным для ўсіх школьнікаў застаюцца правільныя стасункі паміж самімі дзецьмі, бацькамі і настаўнікамі, рэжым дня, асаблівасці харчавання, неабходнасць пазбягаць перанапружання, зацікаўленасць у працэсе пазнавання новага... Як высвятляецца, школа сёння робіць па ўсіх гэтых накірунках нямала, а бацькі думаюць, дастаткова толькі касцюм з алоўкамі прыдбаць. Дарэчы, і гэта трэба зрабіць з розумам. Аб тым, што вы, магчыма, упусцілі з віду, але хацелі б даведацца (каб не прывесці сваё дзіця да фінішу вучобы хворым і няшчасным), разважалі падчас «круглага стала» намеснік начальніка аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Тацццяна ХАРУЖАЯ, галоўны пазаштатны спецыяліст па медыцынскім забеспячэнні дзяцей у арганізаваных калектывах камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Аксана ПЯЦЭВІЧ, намеснік дырэктара гімназіі №6 г. Мінска Тацццяна БЯЛТ, педагог-псіхолаг ясляў-садка №408 г. Мінска Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ, псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Юлія ЕЎЛАШ.**

СТАР. 10

■ Выбары-2016

**Мікалай ЛАЗАВІК:**

## «МЫ ЎЛІЧЫЛІ ДАСТАТКОВА ШМАТ РЭКАМЕНДАЦЫЙ АБСЕ»

**Чаму празрыстыя скрыні — не панацэя? Як падлічваюць галасы за мяжой? Ці можна чакаць, што праз некалькі гадоў у нас будзе ўведзена электроннае галасаванне? Пра гэта і многае іншае карэспандэнту «Звязды» расказаў Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.**



***— Хутка ўжо пачнецца папярэдняе галасаванне. Калі камісіі ў рэгіёнах пачнуць заказваць бюлетэні?***

— Яны гэта пачнуць рабіць тады, калі ў іх будзе дакладная яснасць па зарэгістраваных кандыдатах. Зараз працэс рэгістрацыі кандыдатаў скончыўся, але некаторыя кандыдаты праяўляюць пэўную пасіўнасць. Яны не адкрываюць выбарчыя фонды, не аддаюць матэрыялы для публікацый сваіх перадвыбарных праграм у газеты. Гэта можа навесці на думку, што асобныя кандыдаты не збіраюцца ісці па цярністым перадвыбарным шляху да канца і можа так атрымацца, што яны здымуць свае кандыдатуры напярэдадні галасавання. Таму, натуральна, бюлетэні павінны быць дастаўлены на выбарчыя ўчасткі за дзень да пачатку папярэдняга галасавання — гэта значыць за шэсць дзён да пачатку выбараў.

СТАР. 2

■ Эканоміка

# АДЗІНЫ АНТЫМАНАПОЛЬНЫ

**Указам кіраўніка нашай дзяржавы Міністэрства гандлю афіцыйна перайменавана ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Указ уступае ў сілу сёлета з 8 верасня.**

Дакумент таксама зацвярджае эмблему і сцяг ведамства, якія адрозніваюцца ад ранейшых толькі надпісам. Рашэнне аб стварэнні адзінага антыманапольнага органа на базе Міністэрства гандлю Беларусі было прынята Прэзідэнтам краіны яшчэ 3 чэрвеня. Вядома, што ў склад новага ведамства перадаюцца Дэпартамент цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі, а таксама ўпраўленні антыманапольнай і цэнавай палітыкі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Цяпер на гэты антыманапольны орган ускладзены функцыі па супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі на таварных рынках краіны, у тым ліку функцыі органа рэгулявання дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій, рэгулявання цэн і тарыфаў, кантролю і рэгулявання спажывецкага рынку, у галіне дзяржзакупак, рэкламнай дзейнасці і абароны правоў спажыўцоў. «Ключавой мэтай новага міністэрства з'яўляецца вырашэнне праблемы абароны ўнутранага рынку краіны шляхам стварэння роўных канкурэнтных умоў для ўсіх яго ўдзельнікаў», гаворыцца ў паведамленні, якое ўчора было размешчана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# «МЫ ЎЛІЧЫЛІ ДАСТАТКОВА ШМАТ РЭКАМЕНДАЦЫЙ АБСЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі ж бюлетэні даставяць вельмі рана, то можа так здарыцца, што ў іх акажуцца тыя кандыдаты, якія знялі свае кандыдатуры. Таму спяшацца з бюлетэнямі не трэба. А каб выбаршчыкі ведалі, хто будзе балатавацца па выбарчай акрузе, у кожную паштовую скрыню будзе дастаўлена інфармацыйная лістоўка са звесткамі пра ўсіх кандыдатаў, што балатуюцца па выбарчай акрузе.

***— Ёсць шэраг рэкамендацый ад міжнародных назіральнікаў па выніках прэзідэнцкіх выбараў мінулага года, якія Цэнтральная камісія прыняла ўжо напярэдадні парламенцкай кампаніі. Што гэта за рэкамендацыі?***

— Калі казаць пра рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ, то іх у нас улічана — хаця б часткова —дастаткова шмат. Першае, пра што хачу сказаць, — гэта парадак фарміравання выбарчых камісій. Шмат заўваг было з боку міжнародных назіральнікаў: маўляў, часам фармальна праходзіць іх фарміраванне. Таму цяпер і тэрытарыяльныя, і акруговыя камісіі, і ўчастковыя фарміраваліся з максімальнай галоснасцю, адкрытасцю і пры абмеркаванні ўсіх прадстаўленых кандыдатур. Больш за тое, мы рэкамендавалі выканкамам і прэзідыумам Саветаў, якія фарміруюць выбарчыя камісіі, запрасіць на свае пасяджэнні назіральнікаў. Згодна з законам, назіральнікі могуць прысутнічаць менавіта на пасяджэннях выбарчых камісій, а камісій напачатку выбарчай кампаніі яшчэ няма. У той жа час некаторыя арганізацыі, якія пастаянна займаюцца маніторынгам выбараў, — напрыклад, Хельсінкскі камітэт — выказалі жаданне прысутнічаць на пасяджэннях выканкамаў і прэзідыумаў Саветаў. Мы рэкамендавалі, каб іх дапусцілі да гэтага назірання.

Другое, на пасяджэнні па фарміраванні камісій былі запрошаны ўсе суб'екты, якія прапаноўвалі кандыдатаў у склад камісій. Ім было прадастаўлена слова, яны маглі далажыць аб дзелавых і арганізацыйных якасцях тых прэтэндэнтаў, якіх яны рэкамендавалі ў склад камісій. Пасля па кожнай кандыдатуры праводзілася рэйтынгавае галасаванне — то бок тут была ўжо поўная адкрытасць, галоснасць пры фарміраванні выбарчых камісій.

Усе рашэнні выбарчых камісій па выбарчых спрэчках даводзіліся да ведама грамадскасці — гэта значыць размяшчаліся ў сетцы інтэрнэт. Акрамя гэтага, суды ўзялі на сябе абавязацельствы: публікаваць на сваіх сайтах рашэнні па ўсіх выбарчых спрэчках — гэта таксама павышае галоснасць выбарчага працэса.

Мы рэкамендавалі выбарчым камісіям падчас датэрміновага галасавання апламбаваць скрыні для галасавання аднаразовымі пластыкавымі пломбамі, але рэкамендацыя гэта для тых, у каго ёсць магчымасці.

***— Гэта залежыць ад таго, наколькі «багатая» ўчастковая камісія?***

— Так. Наступная рэкамендацыя — прадаставіць назіральнікам магчымасць атрымліваць у дні датэрміновага і асноўнага галасавання інфармацыю аб колькасці выбаршчыкаў, што ўключаныя ў спісы. Па законе такога права ў назіральнікаў няма, і на гэтай падставе ў некаторых камісіях не паведамляюць адпаведную інфармацыю назіральнікам. Зараз мы настойліва рэкамендуем, каб гэтую інфармацыю прадастаўлялі. Акрамя гэтага, просім, каб давалі інфармацыю і пра колькасць выбаршчыкаў, якія ўжо прагаласавалі, прынялі ўдзел у галасаванні. Мы рэкамендуем дазволіць назіральнікам прысутнічаць у акруговых камісіях пры прыёмцы пратаколаў ад участковых камісій. Справа ў тым, што назіральнікі прысутнічаюць на пасяджэнні камісіі. Калі ж прымаюцца пратаколы, то пасяджэння як такога няма. Але калі ў назіральнікаў ёсць інтарэс, то няхай сабе прыходзяць і на прыём пратаколаў.

Пры падліку галасоў на выбарчым участку члены ўчастковай выбарчай камісіі павінны размяшчацца з трох бакоў стала, за якім ідзе падлік галасоў, пакідаючы адзін бок, які павернуты да назіральнікаў, адкрытым — каб назіральнікі рэальна маглі назіраць за працэсам падліку галасоў.

Гэта асноўныя нашы рэкамендацыі акруговым і ўчастковым камісіям, якія грунтуюцца на рэкамендацыях БДІПЧ АБСЕ.

***— Чым падлік галасоў у нашай краіне адрозніваецца ад падліку галасоў за мяжой?***

— У кожнай краіне свой парадак. Ёсць краіны, дзе на ўчастку, напрыклад у Польшчы — я там быў на выбарах — пры падліку галасоў не прысутнічае ніхто, акрамя членаў участковай камісіі. Ні назіральнікі, ні кандыдаты, ні давераныя асобы, ні журналісты. Толькі члены камісій — і ніхто іншы.

У некаторых краінах права дазволіць або не дазволіць назіральнікам прысутнічаць пры падліку галасоў належыць участковай камісіі. Напрыклад, будучы на выбарах у Славакіі, я звярнуў увагу, што там па законе менавіта камісія вызначае: дапусціць ці не дапусціць назіральніка на падлік галасоў.

Ёсць краіны, дзе на выбарчым частку галасы нават не падлічваюцца. Скрыні з бюлетэнямі звозяцца ў цэнтр акругі — і там ужо вядзецца падлік галасоў. То бок у кожнай краіне гэта працэс своеасаблівы і рэгламентуецца нацыянальным заканадаўствам.

***— Калі параўнаць краіны постсавецкай прасторы... Як у іх і як у нас? Ці падобныя нашы сістэмы падліку галасоў?***

— Сістэмы падліку галасоў у нас таксама даволі разнастайныя. Дапусцім, у Грузіі, Малдове кожны бюлетэнь паказваецца ўсім прысутным у зале і прагаворваецца, за каго там пастаўлена адзнака. У іншых краінах працэдура падліку галасоў прыкладна такая ж, як і ў нас.

***— Вопыт якіх краін можа быць карысным для нашай краіны пры правядзенні ўжо не бягучай выбарчай кампаніі, але будучых? Можа, ужо настаў час пагаварыць пра электроннае галасаванне?***

— Вопыт любой краіны можа быць карысны. Ён можа быць або станоўчым, або адмоўным — гэта значыць, нешта трэба пераняць, а нешта — непажадана. Так што вывучэнне вопыту любой краіны пойдзе на карысць.

Што да больш прагрэсіўных формаў галасавання, такіх, як электроннае галасаванне, галасаванне з выкарыстаннем мабільных тэлефонаў... Ведаеце, наша Акадэмія навук у свой час распрацавала сістэму для электроннага галасавання. Але мы яе не закупілі з той простай прычыны, што выбары ў нас праводзяцца нячаста, а сама сістэма аказалася вельмі дарагой. Мы парэкамендавалі гэту сістэму Казахстану. Ён пачаў яе выкарыстоўваць, але праз некаторы час адмовіўся. Адной з асноўных перашкод на шляху ўкаранення электроннай сістэмы з'яўляецца недавер выбаршчыкаў да электронікі — асабліва выбаршчыкаў старэйшага пакалення. Моладзь з большым даверам успрымае розныя гаджэты — у тым ліку і сістэму электроннага галасавання. А сталыя людзі хочуць усё-такі патрымаць у руках бюлетэнь і апусціць яго ў скрыню для галасавання.

Забараніла электронную сістэму галасавання Германія — на ўзроўні Канстытуцыйнага суда было прынята рашэнне адмяніць электроннае галасаванне і вярнуцца да старой традыцыйнай формы галасавання. Самая вялікая прэтэнзія з боку спецыялістаў заключаецца ў тым, што магчымы пэўны ўплыў пры дапамозе сучасных камп'ютарных тэхналогій на выніку электроннага галасавання. Гэта значыць, чалавек галасуе за кандыдата №1, а сістэма аддае гэты голас кандыдату №2. Выбаршчыкі нават не падазраюць пра гэта. У двух штатах Злучаных Штатаў Амерыкі была ўзбуджана справа наконт таго, што рэальныя вынікі галасавання былі цалкам адрозныя ад тых, што выдала камп'ютарная сістэма. Гэта значыць, праграма загадзя аддавала перамогу той партыі, да якой належаў кіраўнік фірмы, што выраблялa сістэмнае забеспячэнне для галасавання. Ды і хакерскія атакі магчымыя.

***— Вельмі папулярнымі апошнім часам сталі празрыстыя скрыні для галасавання. А вы асабіста вітаеце іх з'яўленне?***

— Я не стаў бы іх ідэалізаваць. Яны нядрэнна глядзяцца, я не маю нічога супраць празрыстых скрынь. Але гэта не рашэнне праблемы празрыстасці выбарчага працэсу.

**Пры падліку галасоў на выбарчым участку члены ўчастковай выбарчай камісіі павінны размяшчацца з трох бакоў стала, за якім ідзе падлік галасоў, пакідаючы адзін бок, які павернуты да назіральнікаў, адкрытым — каб назіральнікі рэальна маглі назіраць за працэсам падліку галасоў.**

***— Ці ёсць у Цэнтральнай камісіі інфармацыя пра тое, на якой колькасці ўчасткаў ёсць такія скрыні?***

— На мінулых выбарах амаль па ўсёй Віцебскай вобласці былі ўстаноўлены гэтыя скрыні. Ды і па краіне вельмі шмат было празрыстых скрынь. Але, паўтараю, гэта не рашэнне праблемы.

***— Вы ўжо казалі пра тое, што і аднаразовыя пластыкавыя пломбы для запячатвання скрынь для галасавання, і празрыстыя скрыні па жаданні набываюць камісіі. А хто фінансуе камісіі?***

— Справа ў тым, што ў нас некаторыя «прасунутыя» палітыкі кажуць, што, маўляў, можна выкарыстаць і заходнюю дапамогу, і прафінансаваць пэўныя выдаткі з уласнай кішэні... Выбарчая кампанія ў Беларусі фінансуецца толькі з дзвюх крыніц. Першая — дзяржаўны бюджэт. З яго фінансуецца работа камісіі, абсталяванне памяшканняў для работы камісіі, выданне метадычнай і інфармацыйнай літаратуры... Выкарыстанне нейкай замежнай дапамогі і нейкіх спонсарскіх сродкаў для абсталявання памяшканняў камісіі і іншага законам забаронена. Другая крыніца — сваю агітацыйную кампанію кандыдат вядзе за кошт сродкаў свойго асабістага выбарчага фонду. Натуральна, спонсарская дапамога можа выкарыстоўвацца самімі кандыдатамі для фарміравання свайго выбарчага фонду, але, зноў жа, гэта не павінна быць замежная дапамога.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95.

Лот №1. Капитальное строение с инв. №200/С-53085 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, д. 14А, площадью 957,5 кв.м, наименование: здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым №240100000001000491 площадью 0,1972 га. Капитальное строение с инв. №200/С-96572 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, хозяйственно-бытовая канализационная сеть от здания 14А, протяженность – 64,8 метра, наименование: хозяйственно-бытовая канализационная сеть. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 415 588,94/4 155 889 400 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 41 558,89/415 588 900 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. №200/С-52577 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Суворова, д. 12 площадью 508 кв.м, назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административное здание, на зем. участке с кадастровым № 240100000001000329 площадью 0,0526 га, здание является памятником архитектуры 2-й категории. Капитальное строение с инв. №200/С-96657 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тепловая сеть к зданию №12 протяженность 28,1 м, наименование: тепловая сеть. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 529 701,50/5 297 015 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 52 970,15/529 701 500 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **27.09.2016 в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 16.07.2016.

Лот №1. Капитальное строение с инв. №200/С-84139 с составными частями и принадлежностями по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Медицинская, 12, площадью 724,5 кв.м, расположенное на земельном участке с кадастровым №240100000003006276, площадью 0,1852 га. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 1 679 906,15/16 799 061 500 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 167 990,61/1 679 906 100 бел. руб.

Аукцион состоится **27.09.2016 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Срок внесения задатков и приема документов: **с 29.08.2016 с 8.30 по 26.09.2016 до 17.30.** Срок заключения договора купли-продажи: 10 календарных дней со дня проведения аукциона. Условия аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Витебский завод электроизмерительных приборов» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, в составе:**

**Лот № 1:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-50253 | Производственный корпус № 3 (в т.ч. кран-балка, инв. № 143798) | 808,5 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/1 |

**Начальная цена с НДС 20% – 219 230,33 BYN (2 192 303 280 BYR). Снижена на 40%**

**Лот № 2:**

**База отдыха «Вышедки», расположенная по адресу: Витебская область, Городокский район, Стодолищенский с/с, 0,5 км. южнее д. Вышедки, 1, в составе:**

| № п/п | Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь (кв.м) |
|---|---|---|---|
| 1 | 201/С-10553 | корпус № 1 | 52 |
| 2 | 201/С-10554 | корпус № 2 | 51,3 |
| 3 | 201/С-10555 | корпус № 3 | 51,7 |
| 4 | 201/С-10556 | корпус № 4 | 51,2 |
| 5 | 201/С-10557 | корпус № 5 | 50,9 |
| 6 | 201/С-10558 | корпус № 6 | 52 |
| 7 | 201/С-10559 | корпус № 7 | 75,3 |
| 8 | 201/С-12691 | здание неустановленного назначения | 23 |
| 9 | 201/С-12692 | туалет | 3,1 |

А также: воздушная линия электропередачи ВЛ-10 кВ, протяженность 945 м.п., инвентарный номер 201/С-12702, с трансформаторной подстанцией КТП; наружное освещение инвентарный номер 201/С-12689

**Начальная цена с НДС 20% – 44 278,92 BYN (442 789 200 BYR). Снижена на 45%**

**Лот № 3:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-78931 | Склад | 487,5 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/2 |

**Начальная цена с НДС 20% – 230 366,69 BYN (2 303 666 874 BYR)**

**Сведения о земельных участках:** Лоты №№ 1,3 расположены на земельном участке пл. 3,1357 га, предоставленном в общую долевую аренду по 10.04.2065, для содержания и обслуживания производственных помещений.
Лот № 2 расположен на земельном участке площадью 1,9683 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для использования под базу отдыха. Земельный участок пл. 1,0141 га предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания воздушной линии ВЛ-10; земельный участок пл. 0,0293 га, предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания КТП-568. Земельные участки имеют ограничения в пользовании – водоохранная зона вне прибрежной полосы озера Вышедское

**Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты недвижимости производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.05.2016

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Аукцион состоится **28.09.2016 года в 14.00** по адресу: г. Витебск, ул. Ильинского, 19/18, корпус № 8, 3-й этаж, помещение 309, ОАО «ВЗЭП». Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.09.2016** года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71. auction@cpo.by. www.cpo.by.**

# УДАЧНЫХ СТАРТАЎ!

## Паралімпійцаў праводзілі ў Рыа

**У Нацыянальным алімпійскім камітэце адбыліся афіцыйныя провады нашых спартсменаў у Бразілію, дзе ўжо праз дзесяць дзён стартуюць Паралімпійскія гульні-2016. Спаборніцтвы пройдуць з 7 па 18 верасня, у турніры возьме ўдзел 21 беларускі атлет, яны будуць змагацца за медалі ў пяці відах спорту. Сярод найбольш тытулаваных у складзе нашай дэлегацыі плывец Ігар Бокій і Людміла Волчак, якая выступіць у акадэмічным веславанні.**

**Першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ** падчас праводаў дэлегацыі ў Рыа адзначыў, што для НАК няма адрозненняў паміж алімпійскай і паралімпійскай зборнымі.

*— Вы ўсе для нас адна каманда. Ваш лозунг «Yes, I can!» адлюстроўвае стыль вашага жыцця. У Бразіліі вы яшчэ раз дакажаце, што ўсё зможаце і з'яўляецеся найлепшымі ў сваіх відах спорту,* — сказаў Максім Уладзіміравіч.

Сцяганосцам беларускай зборнай на Паралімпійскіх гульнях у Рыа будзе заслужаны майстар спорту, лёгкаатлет Аляксандр Трыпуць. Капітанам зборнай абрана майстар спорту міжнароднага класа, лёгкаатлетка Ганна Канюк.

Поспехаў і добрых выступленняў спартсменам пажадала **віцэ-прэм'ер Наталля КАЧАНАВА.**

*— Ведучы актыўны лад жыцця, з'яўляючыся ўдзельнікамі галоўных стартаў чатырохгоддзя, вы ўжо пераможцы, на якіх варта раўняцца астатнім. За вас будзе хварэць уся Беларусь,* — адзначыла яна.

Беларускія паралімпійцы будуць прадстаўляць краіну ў спаборніцтвах па плаванні, лёгкай атлетыцы, дзюдо, акадэмічным веславанні і фехтаванні. Нагадаем, што нашы спартсмены выступаюць у Паралімпійскіх гульнях з 1988 года. Усяго атлетамі заваявана 124 узнагароды, 39 з якіх залатыя.





Фота БЕЛТА.

**Намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА ўручае сцяг беларускай зборнай Аляксандру Трыпуцю.**

*— Многія спартсмены-паралімпійцы з'яўляюцца кумірамі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі,* — падкрэсліла **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА.** *— У Беларусі 29 тысяч дзяцей-інвалідаў, і ваш прыклад стойкасці і мужнасці, імкнення дамагацца самых высокіх мэтаў — для іх паказальны. Прадэманструйце на Паралімпіядзе свае лепшыя якасці, каб увесь свет ацаніў, як развіты спорт у Беларусі.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## Зачапіла




### Н.НІКАЛАЕВА
**«НА КРОК НАПЕРАДЗЕ»**
*(«Звязда» за 18 жніўня)*

Давайце будзем шчырымі: прафесія настаўніка не ўваходзіць ні ў пяцёрку, ні нават у дзясятку прэстыжных у нашай краіне, у адрозненне ад праграміставаў, лагістаў, юрыстаў, маркетолагаў і нават урачоў, хоць і медыцынскія работнікі таксама актыўна скардзяцца на свае заробкі. Але мне вельмі крыўдна чуць, што ў педагагічны ўніверсітэт паступаюць адны няўдачнікі. Многія нават не дапускаюць думкі, што хтосьці (як, напрыклад, я) марыў з дзяцінства стаць педагагам. Вось і пасля ўвядзення для школьных медалістаў права паступлення на педагагічныя спецыяльнасці без здачы ЦТ іх сталі падазраваць у карысці. Маўляў, паступаюць туды, куды прасцей прайсці без конкурсу. Цікава, канешне, будзе паглядзець праз колькі гадоў, якія з іх атрымаюцца настаўнікі і колькі з іх застанецца працаваць у школе...

Жыццё паказвае, што месца настаўніка можа заняць амаль кожны, але быць сапраўдным настаўнікам здольныя далёка не ўсе. Не да ўсіх педагогаў дзеці ставяцца з павагай, а некаторых яны, мякка кажучы, проста ігнаруюць.

Педагогам сёння быць значна цяжэй, чым калісьці, але разам з тым і цікавей. Сучасны настаўнік абавязкова павінен быць крэатыўным і не замыкацца ў рамках свайго прадмета. Каб быць аўтарытэтам для дзяцей, педагог проста абавязаны разумець тыя праблемы, якія іх хвалююць. Як бы педагог ні ставіўся да вучня, пры ацэнцы выключаў яго вучобы і паводзінаў гэта ніяк не павінна адбівацца. Сутыкнуўшыся з няшчырасцю настаўніка, дзіця наўрад ці будзе даверацца яму ў далейшым. Кожны вучань, прычым у кожнага настаўніка, павінен мець магчымасць атрымаць добрую ці выдатную адзнаку. Гэта не толькі мой настаўніцкі прынцып, але і бацькоўская крыўда на некаторых гора-настаўнікаў.

Трэба пераканаць дзяцей у тым, што вы жадаеце ім дабра, імкнецеся навучыць іх адказна ставіцца да вучобы, даручэнняў, сваіх учынкаў. У школе павінны падтрымліваць цікаўнасць да вучобы, а не пагоня за адзнакамі.

Педагогі павінны спрыяць сацыяльнай мабільнасці сваіх выхаванцаў, вучыць дзяцей прымаць самастойныя рашэнні і несці за іх адказнасць. А многія настаўнікі проста выганяюць дзіця з урока і выклікаюць бацькоў на бескарысныя часам размовы. А потым чакаюць, што вучні будуць іх паважаць. І разважаюць пра непрэстыжнасць сваёй прафесіі.

**Алена Р.**, *г. Барысаў.*

### Ілья КРЫЖЭВІЧ
**«ЗЯМЛЮ НЕ ПАДМАНЕШ»**
*(«Звязда» за 24 жніўня)*

Шкада, што і сёлета надвор'е зноў дрэнна паўплывала на жніво. Прызнаюся, я нячаста сачу за навінамі з палёў, аднак матэрыял «Зямлю не падманеш» атрымаўся рэзанансным і цікавым, на мой погляд. Мне спадабалася як адкрыта выказвае сваю пазіцыю Фёдар Прывалаў. Ён паказвае відавочныя недахопы галіны ў кіраванні гаспадаркай з пункту гледжання здаровага сэнсу і навукі. Таксама я не задумваўся ніколі, што краіне патрэбна на год усяго каля 1 млн тон збожжа для таго, каб спячы хлеб. Маю ўвагу таксама прыцягнулі тыя распрацоўкі, якімі займаюцца сёння навукоўцы-селекцыянеры. Памятаю ў юнацтве падпрацоўваў тым, што загружаў вагоны ў тым ліку і збожжам. І сапраўды, тады ўсё збожжа складзіравалі без разбору. Я вельмі здзівіўся, калі даведаўся, што цяпер селекцыя блізкая да таго, каб кожны гатунак збожжа быў пэўнага колеру. Думаю, гэта сапраўды навядзе некаторы парадак у сельскай гаспадарцы і астатніх галінах накшталт хлебапячэння ці жывёлагадоўлі.

**Сяргей Соркін**, *г. Маладзечна.*

### Н. Лубнеўская
**«АДКАЗНАСЦЬ ЗАЎСЁДЫ НА ТЫМ, ХТО Б'Е»**
*(«Звязда» за 25 жніўня)*

Не верыцца мне, што сапраўдны дамашні тыран добраахвотна вырашыцца здацца псіхолагам. Ды ён нават сябрам не прызнаецца, што збівае жонку: раптам у міліцыю на яго заявяць? А тут прыйсці ў афіцыйную дзяржаўную ўстанову, так бы мовіць, з павіннай... Таму згодна з псіхолагам: накіроўваць на тэрапію трэба прымусова. Можа, пасля размоў са спецыялістамі штосьці праясніцца ў такога мужчыны ў галаве. Дый жанчынам, якія жывуць з гвалтаўнікамі, таксама да псіхолага звярнуцца не будзе лішнім. Здаровы чалавек не будзе дазваляць сябе біць і здзекавацца з сябе.

**Марыя**, *Мінск.*

## Пытальнік

### «Пасля гутаркі заяўнік схіліўся да заключэння дагавора на вываз бытавых адходаў»

***Паважаная рэдакцыя, да вас звяртаюцца многія пенсіянеры па пытаннях вывазу цвёрдых бытавых адходаў. У нас такіх — ні цвёрдых, ні мяккіх — няма. Калі якая паперчына з'яўляецца, мы выкарыстоўваем яе для распальвання печкі. У нас усё ж вясковыя дамы, а не гарадскія кватэры. Каму гэтыя паслугі па вывазе адходаў былі патрэбныя, тыя ўжо заключылі дагаворы і карыстаюцца імі. Нам шлюць паведамленні аб налічэннях, пішуць, што калі не заплацім, сума будзе спаганяная праз суд у прымусовым парадку... Няўжо мяне ў 73 гады будуць судзіць? Плаціць мне няма за што, я ні разу не карыстаўся гэтымі паслугамі і не буду, бо мне няма чаго выкідваць. Няхай абследуюць мой дом і прысядзібную тэрыторыю. Дагавор я адмовіўся заключаць, майго подпісу нідзе няма. Адмову накіроўваў у ЖКГ, але ніхто і слухаць не хоча.***

**Уладзімір Іванавіч РАЎЛУШЭВІЧ,**
*вёска Воранаўка Воранаўскага раёна.*

Ліст чытача мы прыводзім са скарачэннямі, бо, як цалкам справядліва заўважае сам заяўнік, пісьмаў у рэдакцыю жыхары сельскіх населеных пунктаў колькі часу таму звярталіся сапраўды шмат. Таму напачатку коратка нагадаем тое, пра што ўжо неаднойчы пісалася. Некалькі гадоў таму ў краіне пачала ўвасабляцца ў жыццё дзяржаўная праграма, мэтай якой быў 100-працэнтны ахоп менавіта сельскага насельніцтва паслугамі па вывазе і абясшкоджванні камунальных адходаў. Калі ў гарадах гэтая задача вырашаецца ўжо даўно, у вёсках названая праблема часам пераўтваралася ў сапраўднае бедства, калі вакол вёсак, у лясах, на берагах вадаёмаў узнікалі стыхійныя звалкі бытавых адходаў. Што б там не гаварыў паважаны Уладзімір Іванавіч (як і ўсе ранейшыя заяўнікі, што звярталіся ў рэдакцыю па «гарачай лініі»), але наша сучаснае жыццё ўжо нельга ўявіць без такіх жа сучасных рэштак чалавечай жыццядзейнасці. Няхай нават у невялікай колькасці, але адходы абавязкова будуць: поліэтыленавыя пакеты, абгорткі ад прадуктаў, пластыкавыя бутэлькі, шкло... І далёка не ўсё можна спаліць у печы, а некаторыя адходы і ўвогуле з розных прычын (ад пажарных да экалагічных) рызыкоўна спальваць не толькі ў хаце, але і на прысядзібным участку. Як і ўтылізаваць іх, напрыклад, закапаўшы на тым агародзе. І якое выйсце застаецца ў гэтай сітуацыі? Правільна, ахоп насельніцтва паслугамі па зборы і вывазе бытавых адходаў. Ён можа весціся рознымі спосабамі: праз устаноўку кантэйнераў для смецця, праз аб'езд вуліц спецаўтатранспартам у пэўны час.

Менавіта па другім варыянце арганізаваны вываз бытавых адходаў у вёсцы Воранаўка, паведаміла рэдакцыі **старшыня Пераганцаўскага сельвыканкама Людміла ДЗЕКАН**. Іх спецаўтатранспарт забірае чатыры разы на месяц — раз на тыдзень. Кошт паслугі — крыху больш за 1,2 рубля з чалавека ў месяц. Пагадзіцеся, і зручна, і нядорага.

— Работнікі ЖКГ абыходзілі дамы ў Воранаўцы з прапановамі заключыць дагаворы на вываз бытавых адходаў. Пасля разаслалі паведамленні, што з ліпеня будзе налічвацца плата за гэтую паслугу. Ваш заяўнік сапраўды адмовіўся заключаць дагавор, — расказала Людміла Станіславаўна.

Далей па просьбе рэдакцыі работнікі сельвыканкама наведалі падворак Уладзіміра Іванавіча, каб непасрэдна на месцы разабрацца ў прычынах такога кроку вяскоўца. Па словах Людмілы Станіславаўны, з ім адбылася размова прыкладна такога зместу. «Вось вы набылі ў краме тавар у шкляной тары. Куды вы яе падзелі? — прагучала пытанне. «Вынес» — быў адказ. «Значыць, чалавек усё ж карыстаецца паслугай», — канстатавала старшыня сельвыканкама. Паводле яе далейшых слоў, пасля гэтай размовы Уладзімір Іванавіч стаў схіляцца да таго, каб заключыць дагавор на вываз бытавых адходаў. З двух членаў сям'і ў месяц гэта будзе каштаваць крыху больш чым 2,4 рубля новымі грашыма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Сезон

### Хутка паляванне на выдру і бабра

**З 1 верасня ў краіне адкрываецца паляванне на бабра і выдру, якое будзе доўжыцца да 31 сакавіка наступнага года. Здабываць гэтых жывёл можна будзе ў светлы час сутак як зброевым (з засады, з падыходу), так і бяззброевым спосабамі.**



Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, пры зброевай здабычы дапускаецца выкарыстанне наразной (з дульнай энергіяй кулі звыш 1 500 джоўляў), гладкаствольнай (з патронамі з куляй ці карцечу) і кідальнай зброі (лукі і арбалеты). Пры бяззброевым спосабе палявання дазваляецца выкарыстоўваць пасткі №3-7, пасткі (акрамя петляў), а таксама паляўнічых сабак (апроч ганчакоў і выжлаў) пры выкарыстанні пастак.

— Паляванне на выдру ў краіне не такое папулярнае, як бабровае, на што ўказваюць звесткі адносна здабычы жывёл, — расказала прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга Грамовіч. — Згодна са справаздачай Мінлягаса аб вядзенні паляўнічай гаспадаркі, летась здабыча выдры склала усяго 29 асобін, у той час як бабра — 8 919 асобін. Колькасць выдры ў паляўнічых угоддзях краіны, паводле леташняй статыстыкі, нязначная — 5,6 тысячы асобін, колькасць бабра — 58,3 тысячы асобін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Добрая навіна

### Шлюб мары:
#### «залатое вяселле» можна будзе адсвяткаваць афіцыйна

**На Дзень горада дзевяць маладых пар з усіх раёнаў Мінска ўрачыста заключаць шлюб у канцэртнай зале Верхняга горада. Гэта цырымонія з удзелам мэра ўжо стала традыцыяй. Сярод іншых папулярных месцаў, якія абіраюць маладажоны, ёсць замак у Гродне і Нясвіжская ратуша. Але спіс месцаў, дзе можна згуляць вяселле, будзе пашырацца разам з паслугамі, якія прадастаўляюць загсы.**

— Праект пастановы Савета Міністраў на конт гэтага ўжо падрыхтаваны, — заявіў **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.**

Так з'явіцца магчымасць афіцыйна правесці юбілейныя цырымоніі — напрыклад, залатое вяселле.

Цяпер грамадзяне святкуюць такія даты і маюць патрэбу ўрачыста правесці гэтыя мерапрыемствы. Але юрыдычна адпаведная паслуга пакуль не замацавана. Тым часам маладажоны вітаюць святы, распрацаваныя па індывідуальным сцэнарыі: на прыродзе ці ў гістарычных месцах. Тым больш, на гэта звярнулі асаблівую ўвагу сёлета — у Год культуры.

У наступным годзе органы ЗАГС краіны адзначаць 100-годдзе з дня заснавання. А ўчора ў Круглянскім раёне прайшоў рэспубліканскі семінар-практыкум для супрацоўнікаў загсаў з усёй краіны.

— Ён дапаможа прафесіяналам гэтай сферы пашырыць кругагляд і абмяняцца вопытам. На працягу гэтых гадоў нашы загсы аказваюць усе магчымыя паслугі і праводзяць урачыстыя мерапрыемствы. Такая сустрэча накіравана на ўмацаванне інстытута сям'і, — падкрэсліў міністр.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*
*Круглянскі раён*

■ Выбары-2016: праграмы кандыдатаў

## ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА, ДАРАГІЯ ЗЕМЛЯКІ!

### ВАС ВІТАЕ КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПА АСІПОВІЦКАЙ АКРУЗЕ АД ПАРТЫІ БНФ ЯЎМЕНАЎ АЛЬБЕРТ ПІЛІПАВІЧ



Не буду казаць аб грунтоўнай праграме партыі БНФ, бо для пераважнай большасці жыхароў яна не запатрабавана. Вы не ведаеце, гэта зроблена наўмысна, каб выдаліць з палітычнага поля ўсе палітычныя партыі і вас таксама. Бо калі няма іншых гульцоў, акрамя Гаранта, то і ад выбарцаў практычна нічога не залежыць. Прыём вельмі прымітыўны, але эфектыўны: пазбавіць людзей магчымасці галасавання па партыйных спісах. Адсутнасць конкурсу праграм робіць іх абсалютна непатрэбнымі. Наш палітык ніводнага разу не высоўваў праграм. Каб не баламуціць электарат, абяцаўся заробак у 500-1000 долараў. Зараз паставяць на стабільнасць, але і яе ўжо няма. Каб пазбегнуць складанасцяў у будучыні, вельмі патрэбна, каб дэпутаты ў Палаце былі паслухмянымі і толькі зацвярджалі законы, якія спускаюцца з адміністрацыі. Мінулы склад спраўдзіў спадзяванні: за 4 гады ініцыяваў ажно цэлых 4 акты. Малайцы! Вось каб так усе астатнія працавалі? Адсутнасць палітычнай канкурэнцыі прыводзіць да застою і гніення не толькі ў палітыцы, але і ў эканоміцы. Беларуская эканамічная мадэль носіць мабілізацыйны напрамак. Яна выкарыстоўвае стары эканамічны патэнцыял, а не развівае інавацыйную эканоміку.

У выніку мы атрымалі абсалютна неканкурэнтаздольную прадукцыю. За 20 гадоў змянілася структура экспарту, доля прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю знізілася ў разы, затое вырас сыравінны складнік: нафтапрадукты і калійная соль. Паводле даных незалежных міжнародных экспертаў, беларуская эканоміка заняла трэцяе месца па нафтазалежнасці. У 1995 годзе прадукцыя машынабудавання пастаўлялася ў ЗША, Еўропу, а цяпер толькі ў краіны СНД. Фактычна ліквідаваны высокатэхналагічныя галіны вытворчасці пры жыцці за кошт нафтадолараў і калійнай солі. Такая мадэль базуецца на ўласных вялікіх запасах нафты. Але ў нас іх няма. Мы залежым ад паставак расійскай нафты і цэн на сусветным рынку. А гэта не ёсць добра. Спробы мадэрнізацыі вытворчасці ў межах існуючай палітычнай і эканамічнай сістэмы не маглі і не далі належнага эфекту. Народныя грошы закопваюцца рознымі сельгасвытворчымі кааператывамі, распілоўваюцца на дрэвакамбінатах, распыляюцца на цэментных заводах і гэтак далей, бо парушаюцца фундаментальныя эканамічныя законы. Бо спачатку трэба правесці структурныя рэформы эканомікі, стварыць фондавы рынак, правесці капіталізацыю, а потым мадэрнізацыю вытворчасці. Зрабілі ўсё няправільна, вось і атрымалі пшык, а не заробак у 1000 долараў. У краіну трэба прыцягнуць шматмільярдныя інвестыцыі, стварыць для іх спрыяльныя ўмовы.

Па вялікім рахунку, кожнаму трэба адказаць на пытанне: дык што ж трэба зрабіць, каб жыццё ў нашчадкаў было лепшым, што ім пакінуць у спадчыну? Можа, параіць ім лепш працаваць? Як раяць нашы міністры, не вешаць падковы на дзверы, каб шчасце жыло ў доме, а прыбіць іх на пяткі і араць, араць. Дык і сумнавядомы нямецкі палітык у сваёй кнізе казаў тое ж самае. На жаль, мала хто задумваецца над гэтым пытаннем. Людзі жывуць як набяжыць. А адказ вельмі просты: самаарганізавацца ў нармальную дзяржаву, дзе пануе закон, дзе шануюцца галоўныя каштоўнасці ад Бога — свабода і годнасць, дзе існуе сувязь паміж уладай і народам, забяспечана змяняльнасць і падзел улады, а суддзі залежаць толькі ад Бога. У такой дзяржаве будзе забяспечана надзейная будучыня ўсім сумленным грамадзянам, заўсёды будзе існаваць магчымасць зарабіць адпаведна сваім здольнасцям.

Партыя БНФ, усведамляючы сваю адказнасць перад народам, пайшла на выбары ў вельмі неспрыяльных умовах, пра якія я казаў вышэй: гэта адсутнасць галасавання па партыйных спісах, фактычная ізаляцыя ад грамадства, бо за намі праўда і шчыры клопат аб людзях. За праўдай сіла. Перамога наша і народа непазбежная. Хай беражэ вас Бог. Жыве Беларусь!

## ПРАГРАМА

### КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ ПА БАБРУЙСКАЙ СЕЛЬСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 80 АНДРЭЯ АРХІПЕНКІ



Паважаныя выбаршчыкі, у мінулым годзе на выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь многія з вас прагаласавалі за кандыдата ад кампаніі «Гавары праўду» Таццяну Караткевіч і падтрымалі нашу праграму «Мірных перамен». Сёлета мы камандай ідзём у парламент, каб працягнуць пачатае.

Мірныя перамены:

— гэта ўлада, якая **паважае** грамадзян і раіцца з імі;

— гэта эканоміка, у якой ствараюцца ўмовы для таго, каб працаваць і годна **зарабляць**;

— гэта дзяржава, якая **забяспечвае** сацыяльную абарону кожнаму з нас.

Калі гэтых змен не адбудзецца, то чыноўнікі па-ранейшаму будуць абыякавыя да нашых праблем, эканоміка так і не выберацца з крызісу, а ўзровень жыцця будзе няўмольна зніжацца.

Стаўшы дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, я маю намер змяніць сітуацыю і дамагчыся пераменаў.

**У сацыяльнай сферы** неабходна ўключыць у страхавы пенсійны стаж службу ў войску і дэкрэтны водпуск; павелічэнне пенсійнага ўзросту ўводзіць паэтапна па працягу не трох, а 10 гадоў; адмяніць падатак на «дармаедаў», павялічыць дапамогу па беспрацоўі да ўзроўню бюджэту пражытковага мінімуму; забяспечыць бясплатную якасную медыцыну і бясплатную якасную адукацыю ў дзяржаўных установах; стварыць сістэму падатковых ільгот у інтарэсах сям'і.

**У эканамічнай сферы** дзяржава павінна спыніць праследаванне за ініцыятыву і заахвочваць бяздзейнасць і растрату дзяржаўных сродкаў. Неабходна зняць «кайданы» з малога і сярэдняга бізнесу, паменшыць колькасць праверак і прыняць законы, якія будуць спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў.

**У дзяржаўнай сферы** галоўным павінна стаць захаванне законнасці і забеспячэнне рэальнага балансу галін улады. Прамыя выбары кіраўнікоў выканкамаў вырашаць многія праблемы, ад ЖКГ да сферы культуры, бо выбраны кіраўнік будзе падсправаздачны грамадзянам, а не таму, хто яго прызначыў. Трэба дамагчыся рэальнай незалежнасці судоў і суддзяў, а таксама ліквідаваць ідэалагічныя аддзелы ўсіх узроўняў, каб на іх не трацілiся нашы з вамі грошы.

Праблемы нашай Бабруйскай сельскай акругі шмат у чым характэрныя для многіх рэгіёнаў краіны. У нас, як і ўсюды, улада без належнай павагі ставіцца да грамадзян. Возьмем просты прыклад. Дарога па вул. Ручаёвай не мае нармальнага сцёку вады. Пасля кожнага дажджу там прайсці немагчыма, уся гразь пасля праезду машын застаецца на дамах і платах. Мясцовыя ўлады не могуць нічога выправіць некалькі гадоў — чым не доказ непавагі? Ну што ж, не жадаюць мясцовыя ўлады з такімі дробязямі спраўляцца самі — будуць рабіць гэта пасля майго дэпутацкага запыту.

У п. Юбілейным неабходна павялічыць падачу вады, цяперашняя не забяспечвае нармальна ўвесь пасёлак. Трэба перагледзець нормы расходу вады і палепшыць яе якасць шляхам будаўніцтва станцый ачысткі (абезжалезвання) і новай свідравіны. У Бабруйску праблема з гарадскім і прыгарадным транспартам — трэба аптымізаваць сетку.

Дарогі, мабыць, галоўная праблема нашай акругі; я маю на ўвазе не цэнтральныя магістралі, а вуліцы, дзе ўсе мы жывём. Мы плацім тройчы за дарогі: дарожны збор, збор на добраўпарадкаванне, частку акцызу на паліва. І куды ідуць гэтыя сродкі? Будзем разбірацца.

Наша сістэма адукацыі пакідае жадаць лепшага: дзеці не атрымліваюць неабходных ведаў у школе, і праз гэта бацькі трацяць апошнія грошы на рэпетытараў для паступлення іх ва ўніверсітэты. Ведаю не па чутках, працаваў у школе. Праблем усіх не пералічыць, іх шмат у нашай краіне.

І сапраўдная бяда ў нашай акрузе — адсутнасць працы. Працу знайсці цяжка, а змяніць яе — недазвалняльная раскоша. З гэтай сітуацыі ёсць толькі адно выйсце: даць рэальную свабоду прадпрымальніцкай дзейнасці.

**Мірныя перамены: дабрабыт у кожны дом!**


## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

| Лот № 1 | | | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Комплекс зданий и оборудование: Здание фабрики гипса с инв. № 630/С-53918, 1996 г.п., площадью 1 597,0 кв.м, этажей – 1; Здание автоклава с инв. № 630/С-75544, 2002 г.п., площадью 55,9 кв.м, этажей - 1; Здание упаковки с инв. № 630/С-75545, 2002 г.п., площадью 68,3 кв.м, этажей - 1; Здание сушилки с инв. № 630/С-75546, 2002 г.п., площадью 11,3 кв.м, этажей - 1; Оборудование, 41 ед. (полный перечень оборудования представлен на сайте ino.by) | Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 14/8; 14/9; 14/10; 14/11 | 447 190,92 (4 471 909 200)* | 4 471,91 (44 719 092)* | 22 359,55 (223 595 460)* |

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 2,2423 га с кадастровым номером 623886000098000003. Целевое назначение: земельный участок для содержания и обслуживания завода строительных материалов (завод извести) севернее п.Чисть. Право постоянного пользования. На земельном участке расположены иные объекты, не выставляемые на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

| Лот | Объект | Адрес | Начальная цена | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 2 | Квартира с инв.№ 630/D-43333, площадью 78,2 кв.м, состоит из: 3 жилых комнат, кухни, коридора, ванной, туалета, лоджии. Подъезд – 1, этаж 1 | Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Виленская, 29А-4 | Начальная цена без НДС, бел. руб.: 99 744,70 (997 447 000)* | 997,45 (9 974 470)* | 4 987,24 (49 872 350)* |
| Лот № 3 | Офисное помещение с инв. № 630/D-36577, 2012 г.п., площадью 81,0 кв.м, этаж 1 | Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, пер. Чкалова 2-ой, 3А-24 | Начальная цена с НДС, бел. руб.: 104 400,66 (1 044 006 600)* | 1 044,01 (10 440 066)* | 5 220,03 (52 200 330)* |
| Лот № 4 | Помещение магазина с инв. № 630/D-36574, 2012 г.п., площадью 98,3 кв.м, этаж 1 | Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, пер. Чкалова 2-ой, 3А-25 | 126 886,96 (1 268 869 600)* | 1 268,87 (12 688 696)* | 6 344,35 (63 443 480)* |
| Лот № 5 | Подвальное помещение с инв. № 630/D-36578, 2012 г.п., площадью 98,0 кв.м | Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, пер. Чкалова 2-ой, 3А-27 | 37 400,68 (374 006 800)* | 370,00 (3 740 068)* | 1 870,03 (18 700 340)* |
| Лот № 6 | Подвальное помещение с инв. № 630/D-36575, 2012 г.п., площадью 77,7 кв.м | Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, пер. Чкалова 2-ой, 3А-26 | 29 828,76 (298 287 600)* | 298,29 (2 982 876)* | 1 491,44 (14 914 380)* |

()* – Цена указана в денежных знаках образца 2000 г.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 14 (четырнадцати) дней с назначенной даты проведения аукциона.
Оплата, приобретенного на аукционе Объекта (Объектов), производится в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 29.09.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.
*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот № ____),* **проводимом 29 сентября 2016 г.**
Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **27.09.2016 в 10.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кибзюк Дмитрий Николаевич, 8 (029) 171-09-46.
Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов. Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


■ Рабі, як мы!

## СПОРТ, ЗДАРОЎЕ І ЗАКОН

**У Гродне прайшлі фінальныя гульні абласнога культурна-спартыўнага свята для непаўналетніх «Спорт, здароўе і закон», якое арганізавалі пракуратура вобласці, галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама і абласная камісія па справах непаўналетніх.**

— Гэтае культурна-спартыўнае свята, якое пяты раз праходзіць на Гродзеншчыне, знаёміць дзяцей з іх равеснікамі, прадстаўнікамі сілавых структур. Яны вучацца быць у камандзе, імкнуцца перамагаць. Тым больш што створаны дастойныя ўмовы для заняткаў фізічнай культурай і спортам, — зазначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ**.

У спаборніцтвах па міні-футболе, стрытболе і валейболе ўдзельнічалі больш за 100 хлопчыкаў і дзяўчынак. Прызёраў узнагародзілі кубкамі, медалямі і граматамі.

— У многіх з гэтых дзяцей нялёгкі лёс, і заняткі спортам могуць стаць для іх той прыступкай у жыцці, якая выведзе на правільны шлях, — кажа **пракурор Гродна Уладзімір КЛІШЫН**.

Разам з юнакамі і дзяўчатамі ў культурна-спартыўным свяце «Спорт, здароўе і закон» удзельнічаюць і супрацоўнікі сілавых структур — пракуратуры, міліцыі. Напрыклад, **старшы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Ваўкавыскага РАУС Андрэй ВІКТОРКА** ўжо трэці год разам з імі трэніруецца і выступае на спаборніцтвах.

Дарэчы, дзяўчат (а іх сярод тых, хто стаіць на ўліку ў інспекцыях па справах непаўналетніх, каля 20 %) сёлета ўпершыню запрасілі праявіць сябе ў гэтых спаборніцтвах. А навінкай наступнага культурна-спартыўнага свята стануць раённыя этапы падчас канікул.

— Гэта будзе добры стымул трэніравацца на працягу ўсяго навучальнага года, каб паказаць найлепшы вынік падчас фінальных гульняў, — лічыць **намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Гродзенскага аблвыканкама Людміла НІЦКАЯ**.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Пытальнік

# Тэрмін абмену чэкаў падоўжаны на 4 гады

***— У мяне ад бацькоў і свёкра засталіся імянныя прыватызацыйныя чэкі (ІПЧ) «Маёмасць». А знаёмыя кажуць, што яны ўжо не сапраўдныя. Мне здаецца, што гэта не так. Дзе і якім чынам я магу абмяняць іх на акцыі?***

**Маргарыта Сяргееўна,** *г. Мінск.*

Па каментарый мы звярнуліся да спецыялістаў Беларусбанка, які і выконвае ролю пасрэдніка пры ажыццяўленні аперацый па абмене акцый прадпрыемстваў, што прыватызуюцца, на ІПЧ «Маёмасць». У прэс-службе гэтай фінансавай установы нам паведамілі, што, згодна з адпаведнай пастановай Савета Міністраў, тэрмін абароту ІПЧ «Маёмасць» вызначаны па 30 чэрвеня 2019 года.

Акцыі, прызначаныя для абмену, як правіла, размяркоўваюцца паміж установамі гэтага банка згодна з памерам іх агульнага пакета. Напрыклад, пакет акцый аб'ёмам да 100 тысяч чэкаў абменьваецца ў горадзе ці раёне па месцы размяшчэння адкрытага акцыянернага таварыства. Пакет акцый да 200 тысяч ІПЧ абменьваецца ў межах вобласці, г. Мінска па месцы знаходжання прадпрыемства. А вось такія каштоўныя паперы таварыства аб'ёмам звыш 200 тысяч чэкаў абменьваюцца па ўсёй краіне.

Таксама нам паведамілі, што абмен акцый на чэкі ажыццяўляецца ў любым падраздзяленні Беларусбанка, які выконвае гэтую аперацыю паводле спіса прадпрыемстваў, што прыватызуюцца, і ў якім адкрыты спецыяльны (чэкавы) рахунак фізічнай асобы. Для выканання аперацыі па абмене акцый прадпрыемстваў на ІПЧ «Маёмасць» чалавек прад'яўляе пашпарт нашай краіны і сертыфікат чэкаў.

Сёння заканадаўства дазваляе абменьваць на акцыі як належачыя ўласныя чэкі, так і атрыманыя ў спадчыну. Таксама дазваляецца выкарыстоўваць чэкі, якія былі пераафармлены пакупніку ад блізкіх сваякоў (бацькоў, дзяцей, мужа і жонкі, родных братоў і сясцёр, унукаў, бабуль, дзядуляў, свекрыві, свёкра, цесця і цешчы), якім яны былі належачыя ў якасці асабістай маёмаснай квоты, але ў суме не больш за 250 ІПЧ «Маёмасць» на працягу ўсяго перыяду бязвыплатнай прыватызацыі. Абмен у гэтым выпадку ажыццяўляецца па заяве пакупніка з указаннем у ім, ад каго атрыманы чэкі, без прад'яўлення дакументаў, якія пацвярджаюць сваяцтва. У выпадку паведамлення пакупніком у заяве ілжывых звестак адносна ІПЧ «Маёмасць», пераафармленых ад пералічаных вышэй сваякоў і выкарыстаных для абмену, праведзеная здзелка з'яўляецца несапраўднай.

У выпадку змены месца жыхарства гаспадар названых папер мае права перавесці спецыяльны чэкавы рахунак у падраздзяленне Беларусбанка па новым месцы жыхарства.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЯК ПРАВІЛЬНА ВЫБРАЦЬ НАВУЧАЛЬНЫЯ КУРСЫ

***Я маладая жанчына, афіцэр запасу з ваеннай адукацыяй. Зараз вырашыла перавучыцца на іншую спецыяльнасць і сутыкнулася з такой праблемай: у сферы недзяржаўнай адукацыі шмат няякаснага навучання. У інтэрнэце можна знайсці мноства псеўдакурсаў. Я на такія трапляла: плаціла вялікія грошы, а ў ходзе навучання бачыла, што інфармацыя даецца мінімальная, часам гэта проста нейкі пераказ кнігі. Дык як правільна выбраць навучальныя курсы?***

**Кацярына П.,** *г. Мінск.*

Аб тым, на што звярнуць увагу пры выбары навучальных курсаў, мы папрасілі расказаць **дырэктара аднаго са сталічных адукацыйных цэнтраў Сяргея СУЛІМАВА**.

Вось яго парады:

✓ Перш за ўсё трэба азнаёміцца з поўнай інфармацыяй аб іх, паглядзець звесткі пра выкладчыкаў, якія будуць весці гэтыя курсы.

✓ Трэба знайсці рэальныя водгукі, а яшчэ лепш — відэаводгукі выпускнікоў гэтых курсаў.

✓ Вельмі правільным таксама будзе азнаёміцца з праграмай навучання, з тым каб скласці меркаванне, наколькі яна вам падыходзіць.

✓ Арыентуйцеся на тыя курсы, якія прапануюць бясплатныя першыя (пробныя) заняткі і якія прапануюць аплацiць заняткі ў растэрміноўку, гэта значыць, калі курсы вам не спадабаліся, то вы страціце толькі першапачатковы плацеж і захаваеце астатнія грошы.

***

Акрамя таго, нядаўна Міністэрства гандлю апублікавала «Памятку спажыўцам адукацыйных паслуг».

Як адзначаюць у міністэрстве, апошнім часам мноства адукацыйных курсаў, не маючы ні праграм для навучання, ні досведу выкладання, навучаюць нашых грамадзян, напрыклад, прафесіям цырульніка, візажыста і інш. Пры гэтым прысвойваюць ім кваліфікацыйны разрад з запісам у працоўную кніжку без выдачы дакументаў аб навучанні ўстаноўленага ўзору, што супярэчыць заканадаўству. Часцяком слухачы такіх курсаў уводзяцца ў зман, нібыта па заканчэнні іх яны атрымаюць дыплом ці пасведчанне "дзяржаўнага ўзору", што немагчыма.

Пасля заканчэння курсаў слухачам павінна выдавацца даведка аб навучанні, якая пацвярджае засваенне слухачом зместу адукацыйнай праграмы курсаў. Выдача іншых дакументаў аб заканчэнні курсаў заканадаўствам не прадугледжана.

Міністэрства гандлю таксама нагадвае, што пачатак вучэбных заняткаў на навучальных курсах (лекторыях, тэматычных семінарах, практыкумах, трэнінгах і інш.) пачынаецца па меры камплектавання вучэбных груп, але не пазней чым праз тры месяцы пасля даты заключэння адпаведнага дагавора. Спажывец адукацыйных паслуг мае права патрабаваць поўнай кампенсацыі страт, нанесеных яму ў сувязі з парушэннем тэрмінаў пачатку заняткаў.

Грашовая сума, якая вяртаецца спажыўцу пры скасаванні дагавора аб аказанні паслугі, вызначаецца на момант прад'яўлення спажыўцом патрабавання, а калі яно добраахвотна не задаволена, — на момант вынясення судом адпаведнага рашэння. Пры гэтым патрабаванні спажыўца аб скасаванні дагавора аб аказанні паслугі і звароце выплачанай грашовай сумы падлягаюць задавальненню на працягу сямі дзён з дня прад'яўлення адпаведнага патрабавання. За парушэнне гэтага тэрміну выканаўца ўплачвае спажыўцу за кожны дзень пратэрміноўкі няўстойку ў памеры аднаго працэнта цаны аказання паслугі.

З поўным тэкстам памяткі спажыўцам адукацыйных паслуг можна азнаёміцца на сайце Міністэрства гандлю.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

# ЛЕТНІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Раніца на падворку Брэкманаў пачынаецца з манатоннага тахкання кампрэсарнага рухавіка — у хляве ідзе электрадойка. Галоўны спецыяліст па гэтай дойцы — Сяргей. Механізаваны працэс дойкі дае магчымасць эканоміць час, і гаспадар паспявае за раніцу зрабіць процьму неадкладных спраў: напаіць цялят, падсыпаць корму бычку, прынесці сена, вывесці на поле каня. А потым выправіць кароў на пашу з вясковым статкам. Ранішні сырадой неабходна працадзіць і паставіць у халоднае месца. Поруч з Сяргеем увіхаецца і яго жонка Тамара. Гаспадыня выпускае на двор птушыную чараду, корміць парсючкоў, не забывае і хатняга пестуна — ката. На плячах жанчыны ляжыць агарод і парадак у доме.



Гаспадар кажа, што да таго, каб трымаць невялікую малочную ферму на сваім падвор'і, яго паштурхнулі неэфектыўныя ўмовы сялянскай працы. У свой час за малако, якое здавалі дзяржаве, вяскоўцам плацілі мізэрныя грошы і з вялікімі затрымкамі. А залежаць ад некага і чакаць лепшых часоў — не ў правілах Сяргея. Чалавек ён працавіты і ўмелы, цяжкасцяў не баіцца. Лішкі малака стаў перапрацоўваць сам. Для гэтага давёў свой дойны статак да сямі галоў, пабудаваў невялікую сыраварню і наладзіў вытворчасць тварагу. Сырныя сакрэты ён ведаў з дзяцінства, у прыватнасці — ад маці. Раней у кожнай вясковай хаце рабілі свой тварог, сыр, смятану. Малако, якое даюць рагулі з Сяргеевага падворка, тлустае, з яго выходзяць на дзіва смачныя прадукты. Пра тварог, які атрымліваецца ў Брэкмана, даведаліся гурманы з райцэнтра, і на базары за ім заўсёды ўтвараецца чарга.

Летні дзень падганяе вяскоўца, не дае адпачываць. Салодкі водар свежага сена лунае на падворку Брэкманаў. Лета — час касавіцы і загатоўкі сенных запасаў. Трэба рупіцца, пакуль стаіць спрыяльнае надвор'е, а травы набралі найвышэйшую сакавітасць. Сяргей не марудзіць. Кожную пагодную часіну ён на полі. Бо для каровы на зімні перыяд неабходна назапасіць па дзве з паловаю тоны сена, а каню і болей. Работы на полі хоць адбаўляй. Сёлета на сваім трактары Сяргей зрабіў два ўкосы, сухое сена скатаў у рулоны, перавёз на падворак, набіў сенавалы. «Запас бяды не чыніць», — зазначае руплівы гаспадар.



Але «лугавая» работа для Сяргея праходзіць у прамежках яго асноўнай службовай дзейнасці. Сяргей Брэкман — прафесійны пчаляр, працуе ў Акцябрскім лясгасе, і для яго лета — самы гарачы час, разгар медазбору. Пасля ранішніх клопатаў на сваім двары Сяргей спяшаецца на лягасаўскі мядовы падворак. «На Беларусі пчолы — як гусі, мёд кашамі носяць», — задаволена можа сказаць Брэкман, назіраючы, як працуе яго пчаліная фабрыка. Ён ведае, як зрабіць, каб гэтая фабрыка працавала на ўсю магутнасць. У Сяргея вялікі вопыт у пчалінай справе. Амаль сорак гадоў у сваё пяцьдзясят чатыры ён аддаў любімаму занятку. Сваю прафесію пачынаў асвойваць яшчэ да восьмага класа. Ён успамінае: «Не паспеў здаць выпускныя экзамены, тут жа паклікалі ў лясгас на адказную пасаду пчаляра, выпраўляць хібы папярэдніх «прафесіяналаў». Так і застаўся на ўсё жыццё ў лясной гаспадарцы». У той час у краіне больш не было ніводнага выпадку, каб школьніку даверылі кіраваць вялікай пчалінай гаспадаркай.

— Толькі на першы погляд здаецца, што сонечная пасека сярод духмяных кветак — лёгкі і прыгожы занятак вяскоўца ці дачніка, адпачынак. А духмяны мядок на спадачку — падарунак добрай і бясклапотнай пчалы. Насамрэч, толькі цярплівая праца і ўменне даюць вынікі ў гэтай карыснай справе, — кажа пчаляр і дадае. — У добрага пчалавода не бывае кепскага мёда.

У гэтыя дні Брэкман вандруе з медагонкай на калёсах ад пчальніка да пчальніка. Першы медазбор працавітыя пчолы зрабілі з кветак рапсу, маліны, крушыны, і гэты мёд пасечнік паспеў выкачаць з рамак у сярэдзіне лета. Цяпер заканчваецца другі медазбор — з грэчкі, ліпы, канюшыны і купальскіх кветак. На падыходзе мёд з верасу і жнівеньскіх кветак.

Вечарэе. Сыты статак кароў павольна брыдзе ў вёску. Жыхары Гаці чакаюць сваіх карміліц. А на падворку Брэкманаў, як і раніцай, зноў загудзе рухавік электрадойкі. Гаспадарскія клопаты Сяргея і Тамары будуць працягвацца яшчэ доўга.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**
*anatol@zviazda.by*
*Акцябрскі раён.*

**Больш здымкаў глядзіце на сайце «Звязды».**

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ спакою

№ 9 (27)



■ Працатэрапія

**УВАГА, ПРАМАЯ ЛІНІЯ!**

**Сёння начальнік Дэпартамента аховы МУС РБ генерал-маёр міліцыі Сяргей Мікалаевіч ХАМЕНКА правядзе прамую тэлефонную лінію.**

**Пытанні, што тычацца дзейнасці дэпартамента паслуг, якія прадастаўляюцца, і іх коштаў, патрабаванняў да кандыдатаў на службу, можна задаць па тэлефоне (8017) 218-55-30.**

**Час правядзення «прамой лініі» — з 9.00 да 12.00**

## НА ДАРОЗЕ — ДЗЕЦІ

**Надыходзіць восень, а з ёй — першыя навучальныя дні ў школах. Дзяржаўтаінспекцыя заклікае кіроўцаў быць больш уважлівымі на дарогах і праводзіць з 25 жніўня па 5 верасня акцыю «Увага — дзеці!»**

Ва ўпраўленні ДАІ МУС РБ паведамілі, што за шэсць месяцаў бягучага года дзеці ва ўзросце да 16 гадоў сталі ўдзельнікамі 195 дарожна-транспартных здарэнняў, 9 чалавек загінулі. Двое дзяцей былі пешаходамі, а яшчэ двое — веласіпедыстамі. 97 непаўналетніх атрымалі розныя пашкоджанні як пешаходы. **Па віне кіроўцаў пацярпелі 70% дзяцей!**

У дні правядзення спецмерапрыемства рух аўтатранспарту ўдзень для прыцягнення ўвагі павінен ажыццяўляцца з уключаным бліжнім святлом фар. На час акцыі «Увага — дзеці!» запланаваны шэраг прафілактычных мерапрыемстваў для дзяцей і падлеткаў. А гэта і віктарыны, конкурсы, відэалекторыі.

Асаблівая ўвага будзе сканцэнтравана на прафілактыцы сярод бацькоў. У Дзяржаўтаінспекцыі расказалі, што міліцыянеры наведаюць працоўныя калектывы, растлумачаць прычыны і магчымыя наступствы ДТЗ з удзелам дзяцей, адказнасць за парушэнне правілаў дарожнага руху, а таксама правілы бяспечнай перавозкі непаўналетніх у аўтамабілях.

ДАІ Мінска напярэдадні пачатку навучальнага года праводзіць шматлікія рэйды, выяўляе аўтамабілі, што няправільна прыпаркавалі каля школ і ў суседніх дварах.

— За лета кіроўцы крыху расслабіліся, — кажа **Вікторыя ЦАРУК, старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Кастрычніцкага раёна сталіцы.** — І менавіта сёння ім важна нагадаць пра тое, што калі вы паркуеце аўто на тратуарах, пад забараняльнымі знакамі на шляху дзяцей да школы, то падвяргаеце іх небяспецы.

Толькі за пяць дзён у Кастрычніцкім раёне эвакуявалі каля 30 аўтамабіляў за парушэнне правілаў паркоўкі паблізу навучальных устаноў. І гэта яшчэ не канец. Такія ж рэйды працягнуцца ў верасні. За падобнае парушэнне прадугледжана адказнасць у выглядзе папярэджання ці штрафу (1 базавая велічыня), пры паўторы на працягу года — дзве базавыя. Акрамя таго, парушальніку прыйдзецца заплаціць за паслугі эвакуатара і за суткі знаходжання машыны на штрафстаянцы.

**Якаў ЖУРБІН.**

# АД ОФІСНАЙ МЭБЛІ ДА МАКАРОНЫ

**Сяргей ДАРОШКА, начальнік дэпартамента выканання пакаранняў МУС Беларусі, расказаў журналістам, якую прадукцыю вырабляюць на прадпрыемствах у турмах і калоніях**

**Калі яшчэ ёсць той чалавек, які лічыць, што за кратамі асуджаныя проста сядзяць і нічога не робяць, ён глыбока памыляецца. У нашай крымінальна-выпраўленчай сістэме працуе 14 унітарных прадпрыемстваў, 3 філіялы і 10 пазабюджэтных майстэрняў.**

— Працуем даволі нядрэнна, — кажа Сяргей Дарошка. — Мы не маем стратных прадпрыемстваў. Большасць спрацавалі з прыбыткам, які склаў 4,69 мільёна рублёў. Асноўныя нашы напрамкі — дрэва- і металаапрацоўка, швейная вытворчасць. Штогод наша прадукцыя экспануецца на буйных рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках. Сваю прадукцыю пастаўляем у Францыю, Германію, Вялікабрытанію, Расію, Егіпет, Літву, Украіну і ў іншыя краіны.

Літаральна за шэсць месяцаў на прадпрыемствах дэпартамента выканання пакаранняў засвоілі вытворчасць звыш 260 відаў новай прадукцыі. Асартымент даволі вялікі. У ім знайшлося месца глушыцелям, вёдрам, мылу, вілам, паліўным брыкетам, уніформе, мэблі, будкам для сабак, дзіцячым пляцоўкам і нават макароне. Дзеля вытворчасці больш якаснай прадукцыі на шэрагу прадпрыемстваў адбылася мадэрнізацыя. А неўзабаве на адным з прадпрыемстваў (хутчэй за ўсё ў Гродзенскай вобласці) пачнуць займацца грубай апрацоўкай бурштыну з далейшай перадачай заказчыку. Пад гэту справу плануюць стварыць 150 новых працоўных месцаў. У планах — апрацоўка 1,5 тоны акамянелай смалы за год.

Сяргей Дарошка адзначае, што галоўная мэта дзейнасці прадпрыемстваў крымінальна-выпраўленчай сістэмы — занятасць зняволеных. Лічба тых, хто працуе на прадпрыемствах, дасягае амаль ста працэнтаў. Сярэдні заробак асуджанага складае 500 рублёў у месяц (51 рубель ён атрымлівае на рукі, а астатнія ідуць на ўтрыманне і пагашэнне прычыненай шкоды). Працай заняты амаль кожны. Выключэнне складаюць толькі хворыя.

— Калі нехта думае, што калонія перавыхоўвае чалавека, гэта не так, — лічыць начальнік дэпартамента. — Мы ставім перад сабой задачу карэкціраваць паводзіны чалавека, яго паступовае ўваходжанне ў соцыум. У выпраўленчым працэсе мы запусцілі так званыя сацыяльныя ліфты, якія дазваляюць чалавеку з месцаў пазбаўлення волі пакрысе вяртацца ў грамадства.

**Сярэдні заробак асуджанага складае 500 рублёў у месяц (51 рубель ён атрымлівае на рукі).**

Знаходзячыся ў калоніі ці ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, чалавек можа атрымаць прафесію. Для зняволеных дзейнічаюць філіялы прафесійна-тэхнічных вучэльняў. Цягам мінулага навучальнага года адукацыю атрымалі 2774 чалавекі па 33 рабочых спецыяльнасцях. Непасрэдна на прадпрыемствах прафесійнае навучанне індывідуальна-брыгадным спосабам прайшлі 1620 чалавек. А вось у гомельскай жаночай калоніі №4 зняволеныя ў выглядзе эксперымента могуць дыстанцыйна атрымаць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасцях менеджмент, эканоміка, бухгалтарскі ўлік, псіхалогія. Усё гэта стала магчымым дзякуючы міжнароднай праграме «Адукацыя адчыняе дзверы», які рэалізуецца гомельскім абласным грамадскім аб'яднаннем «Сацыяльныя праекты». Сяргей Дарошка кажа, што гэты вопыт будзе пераняты і ў другіх выпраўленчых установах.



Фота Надзеі БУЖАН.

На гэты момант за кратамі знаходзяцца 780 інвалідаў, і дэпартамент выканання пакаранняў планує больш увагі ўдзяляць людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Неўзабаве кожны следчы ізалятар мусіць быць абсталяваны камерамі для людзей з фізічнымі асаблівасцямі. Пад дзеянне праграмы безбар'ернага асяроддзя падпадуць і іншыя ўстановы крымінальна-выпраўленчай сістэмы.

Сяргей Дарошка таксама адзначыў не толькі зніжэнне колькасці зняволеных (за апошнія дваццаць гадоў яна скарацілася з 65 тысяч да 20), але і хворых на сухоты. Дасягнуць гэтага атрымалася дзякуючы медыцынскаму абследаванню ўсіх зняволеных.

**Якаў ЖУРБІН**

■

# «НА МІЛІЦЫЯНЕРАЎ КІДАЛІСЯ

## У супрацоўнікаў крымінальна-выпраўленчай сістэмы праца не цукар

**Раней я думаў, што ў міліцыі менавіта ўчастковым інспектарам па сваёй службе прыходзіцца мець справу з самымі маргінальнымі прадстаўнікамі грамадства. Цяпер разумею: не толькі ім...**

### «Былыя зняволеныя даволі скрытныя людзі. Лішняга не скажуць»

**З Аляксеем ПЯРКОВЫМ, старшым інспектарам крымінальна-выпраўленчай інспекцыі Першамайскага РУУС сталіцы,** сустракаемся ў яго кабінеце. Малады міліцыянер паводзіць сябе даволі ветліва, але ад гісторый з праваахоўчай практыкі валасы на галаве дыба становяцца.

— Спецыфіка нашай працы ў наступным. Мы кантралюем прыбыццё былых зняволеных, ставім іх на ўлік (ад 6 месяцаў да 2 гадоў), праз прафілактыку стараемся папярэдзіць новыя злачынствы, — робіць невялікі лікбез Аляксей. — Працую з тымі, хто знаходзіцца пад прэвентыўным наглядам: паўналетнімі, якія здзейснілі цяжкае або асабліва цяжкае, наўмыснае злачынства і адбывалі пакаранне ў месцах пазбаўлення волі. Кожны месяц яны павінны прыходзіць да мяне і адзначацца.

Суразмоўца паказвае на добры стос папак, у якіх падрабязна распісаны заганы кожнага падапечнага.

— Зараз у мяне 50 падсправаздачных. Сярод іх пераважаюць мужчыны, але ёсць і дзве жанчыны — былыя наркаманка і рабаўніца. Той, хто сядзеў за скрадзены мех бульбы, у такую кампанію не трапіць. Тут, паўтаруся, толькі тыя, хто сядзеў двойчы і больш за цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы: забойцы, рабаўнікі, зладзеі, гвалтаўнікі, наркаманы...

***— Кантынгент не з прыемных...***

— Так, але нам з імі прыходзіцца працаваць. У крымінальна-выпраўленчай інспекцыі ёсць іншыя напрамкі, дзе кантактуюць, па вялікім рахунку, з нядрэннымі людзьмі, якія спатыкнуліся ўпершыню. А мы працуем з закаранелымі злачынцамі, якія ведаюць добра, што такое турма і калонія. Мне даводзілася мець справу з мужчынам, які правёў за кратамі 40 гадоў. Турма — гэта яго жыццё. Але такіх ужо няшмат засталося.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На сваёй пасадзе Пяркоў пяць гадоў. Кажа, што наглядзеўся і наслухаўся рознага. У свой час мусіў працаваць з чалавекам, які сядзеў за канібалізм. Сюжэт здарэння звычайны, але канцоўка — не вельмі. Кампанія, у якой былі сваякі, выпівала, а пасля сын дапамог маці ў забойстве, потым — у знішчэнні цела.

— Гутарылі з гэтым мужчынам пасля таго, як ён стаў да нас на ўлік, — узгадвае Аляксей. — У турме правёў дваццаць гадоў. За гэты час у жыцці змянілася многае, і ён нагадваў мне дзікага звера. Тым не менш яго ўладкавалі на працу — дворнікам. Не п'е. Жыве з жанчынай. Магчыма, змяніўся.

***— А які працэнт тых, хто праходзіць праз вас, прыцаўладкоўваецца і пачынаюць новае жыццё?***

— 50 на 50. Усё залежыць ад чалавека. Ёсць гатовыя вярнуцца ў турму. Такіх нават не пераканаць, амаль немагчыма прымусіць працаваць. А некаторыя сем'і ствараюць, дзяцей нараджаюць... Многіх гэта стрымлівае, яны мяняюць погляды на жыццё, стараюцца адаптавацца да нармальнага, прыстойнага існавання.

***— Мне здаецца, пасля дваццацігадовага знаходжання ў нявolі зрабіць гэта надта складана.***

— Складана. Адразу нават вельмі. За гэты час мяняюцца грошы, мяняецца горад. Шмат змен адбываецца ў грамадскім жыцці краіны. Добра, калі чалавек вызваліўся, і яму ёсць да каго ехаць, ёсць дзеля каго жыць. А многім пасля турмы проста няма куды ісці. Сваякі альбо паміраюць, альбо не хочуць іх бачыць. Такі чалавек застаецца сам-насам з сабой. Але, пастукаю па дрэве, выпадак, калі чалавек вярнуўся на волю і амаль адразу ўчыніў злачынства, адбыўся толькі пазалетась. Ён сядзеў за крадзеж і за крадзеж вярнуўся за краты.

***— Якія пытанні хвалююць гэтых людзей?***

— Яны даволі скрытныя людзі. Лішняга стараюцца ніколі не казаць. Але нам абавязкова трэба з імі размаўляць. Нам важна ведаць, чым яны дыхаюць, якія ў іх планы на будучыню. Стаўлюся да іх спакойна. Стараюся выкарыстоўваць метад пераканання. З кожным свая спецыфіка працы. Напрыклад, наркаманам верыць трэба не заўжды. Яны гатовыя ўсё зрабіць дзеля новай дозы. Кожнаму пакідаю свае гарадскі і мабільны нумары тэлефонаў. Многія кажуць, маўляў, Лёша, навошта ты гэта робіш, яны ж уначы тэлефанаваць будуць. І звоняць сапраўды. Аднак раблю гэта дзеля таго, каб мне знайсці іх было прасцей, падтрымліваць з імі сувязь. Ніхто, дарэчы, не знікае, пастаянна прыходзяць і трымаюць справаздачу. Бо разумеюць: інакш пагражае адказнасць — штраф альбо адміністрацыйны арышт. А калі парушэнні паўтараюцца, можна заводзіць крымінальную справу.

### «Я наогул супраць гвалту. Я гуманіст у душы»

Міліцыянеры мусяць не толькі прымаць былых злачынцаў, але і правяраць іх на кватэрах. Кожны павінен знаходзіцца дома ў адпаведны час. Калі іх няма, гэта ўжо падстава для спагнання. Хадзяць да экс-зняволеных звычайна ўдваіх. Кожны

# Адзін дзень участковага Кумагера

## Карэспандэнты «Звязды» занатавалі будні інспектара з правінцыі

**Мястэчкі і гарады перыферыі найчасцей застаюцца ўдалечыні ад праблем вялікіх гарадоў. Спакойны лад жыцця накладвае свой адбітак. Тут віруе сваё непаўторнае жыццё. Але праблем у міліцыі, працы і тут хапае.**

Старыя Дарогі. Невялікі райцэнтр на поўдні Мінскай вобласці. Жыве тут крыху больш за дзесяць тысяч жыхароў. Дзмітрый Кумагер, герой нашага рэпартажу, ужо трэці год працуе ўчастковым інспектарам. Скончыў БНТУ, але ў Мінску не застаўся, вярнуўся. Працаваў на малой радзіме педагогам у дзіцячым доме, а пасля запрасілі на працу ў інспекцыю па справах непаўналетніх. Так усё і закруцілася.

— Здарэнняў у нас, зразумела, не так шмат, як у буйных гарадах. Але працы заўжды хапала, — прыгадвае першыя крокі ў новай прафесіі Дзмітрый Кумагер, з якім мы спаткаліся ў РАУС. — Калі толькі прыйшоў у міліцыю, шмат даводзілася кантактаваць з дзецьмі з няпростых сем'яў. Хуліганства, пашкоджанне маёмасці, распіццё спіртнога — тыповыя з'явы, з якімі сутыкаўся. А некалькі гадоў таму мы заўважылі, што ўзрост тых, хто распівае алкаголь, рэзка пачаў змяншацца. За п'янства ў нас на ўліку пачалі з'яўляцца 11-14-гадовыя дзеці! Яны збіраліся кампаніямі, адзначалі святы і разам выпівалі. І гэта былі падлеткі з даволі забяспечаных сем'яў. Але гэтую сітуацыю, на шчасце, своечасова атрымалася пераламіць.

***— Памятаеце самы неардынарны выпадак за час працы ў інспекцыі па справах непаўналетніх?***

— Такіх шмат было. Прыходзілася і бегаць за злачынцамі, і пераследаваць. Нават кідаліся на мяне са зброяй... У нашым раёне хлопцы неяк скралі аўтамабіль, а затрыманы былі толькі ў Расіі. А пасля быў выпадак, калі ледзь не ўсёй вобласцю шукалі зніклую ў вёсцы Новыя Дарогі дзяўчынку. Яе без нагляду пакінулі баба і дзед, а яна сышла. Дзякуй Богу, знайшлі яе... у чатыры гадзіны раніцы. Здаецца, людзі часта знікаюць, але гэты выпадак паставіў на вушы ўсю вобласць. А малая была ў суседзяў, якія нават і не задумваліся, што яе шукаюць. Мы тады рабілі абход дамоў і кожнае дзіця разглядалі. Так яе і знайшлі. Спала разам з сяброўкай на ложку.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Тым часам мы накіроўваемся ў Дражна, вёску ў кіламетрах пятнаццаці ад райцэнтра. Менавіта там знаходзіцца працоўны кабінет інспектара Кумагера.

— На гэтым участку працую другі год, — кажа Дзмітрый. — Да мяне тут доўга працаваў добры інспектар, але праз пэўны час участковыя пачалі пастаянна мяняцца і прафілактычная праца зацíхла. Прыйшлося ўсё ўздымаць з нуля. На маю думку, у такіх невялічкіх населеных пунктах работа інспектара павінна строіцца на паразуменні з кіраўнікамі сельвыканкамаў і калгасаў. Бо калі рабочыя гаспадарак пачынаюць піць, валіцца ўся праца. Людзі па некалькі дзён не выходзілі на работу. Прыходзілася размаўляць з імі. Да таго ж пэўны час таму ўзнік усплёск крадзяжоў, але кожны з іх атрымалася раскрыць.

***— Што найчасцей кралі?***

— Усё. І камбікорм, і будматэрыялы. Рабілі гэта перапраўка для далейшага перапрадажу. Ну а нехта проста хоча такім чынам узбагаціцца.



***— Ці гоняць на вашым участку самагон?***

— Гэта здараецца рэдка. Раней наш раён называлі сталіцай самагонаварэння, брагу тонамі знішчалі, аднак з гэтым ужо скончана. Памятаю, яшчэ ў маім дзяцінстве апаратаў у лясах хапала, а цяпер вы ніводнага не знойдзеце. Нехта спрабаваў пасля гнаць у хатніх умовах, аднак нічога з гэтага не выйшла.

Быў час, калі спіртное на ўчастку інспектара даволі часта кралі з крамы. Як аказалася, рабіў гэта адзін і той жа чалавек. Жыве ён, дарэчы, непадалёк ад Дражна...

Праз пяць хвілін Дзмітрый Кумагер глушыць матор у вёсцы Залужжа каля непрыкметнага шэрага дома. Чалавек, да якога мы ідзём, наогул варты асобнага артыкула. Дзмітрый зусім нядаўна вярнуўся з лячэбна-працоўнага прафілакторыя, а дагэтуль восем разоў быў асуджаны за крадзеж спіртнога ў... мясцовай краме.

— Ён не краў анічога, акрамя алкаголю, кавы, прадуктаў, — прыгадвае Кумагер. — І рабіў гэта выключна ў стане ап'янення. На апошнім судзе нават сказаў, што хацеў напіцца так, каб не пайсці красці бутэльку, але спыніць сябе ўсё роўна не здолеў.

Калі Дзмітрый пайшоў па бутэльку, крама ўжо не працавала. Тады ён разбіў шкло на закратаваных вокнах, закінуў у краму вуду з пятлёй, падчапіў і выцягнуў пляшку. Што цікава, наш суразмоўца характарызуе яго як майстра на ўсе рукі, здольнага, працалюбівага хлопца, але гарэлка да дабра не давяла. Працаваў, а цяпер зноў пачаў прагульваць.

***— Вітаю, Канстанцінаўна! — у двары ўчастковага сустракае маці неадназоваага правапарушальніка. — А Дзіма дзе?***

— Дома. А што, зноў забіраць яго кудысьці будзеце?! — нечакана пачала заводзіцца жанчына. — Яго ж з працы выкінулі. Сядзіць цяпер на маёй шыі!

Сам Дзмітрый таксама быў не вельмі задаволены візітам інспектара. І ўвесь час спрабаваў пазбегаць шчырай размовы.

— Калі зноў у ЛПП паедзем? — пытаецца ў яго міліцыянер.

Ад нечаканай прапановы ў хлопца акругліліся вочы.

— Ну што гэта такое?! — нацiскае інспектар. — Ідзеш па вуліцы з голым торсам, віно п'еш. Хіба гэта нармальна?

— Не па дарозе, а па гародах. А калі трэба будзе, у лес піць пайду, — прабубніў Дзмітрый.

— Ты мяне пачуў, — кінуў у бок аматара алкаголю правааахоўнік.

— Пачуў, — коратка адказаў гаспадар.

— Ну тады не крыўдуй на мяне. Будзеш піць — паедзеш у ЛПП.

Такіх патэнцыйных кліентаў для лячэбна-працоўных прафілакторыяў у Дражненскім сельсавеце хапае. У разгар працоўнага дня ў самой вёсцы нешматлюдна. Але каля цаглянага дома ўжо сабралася кампанія. Дзмітрый Кумагер кажа, што большасць з гэтых мужчын беспрацоўныя. Любяць выпіць — вось і нудзяцца без працы.

— Мы ж з вамі літаральна два дні назад гутарылі. Вось вы што тут робіце? У вас жа дзіця малое дома! — выходзячы з аўто, звяртаецца да кагосьці Дзмітрый Кумагер. — Ад вас спіртным і зараз тхне. Пятровіч, інфармацыя не на вашу карысць. Усе за розум узяліся, а вы... Ідзіце дадому!

— Няма куды падзецца, — ціха, з расчараваннем адзначае адзін з прысутных. Мясцовы ўчастковы сваёй актыўнасцю яўна паспеў ім надакучыць.

Праходзіць яшчэ хвілін пяць, і кампанія незадаволена разыходзіцца. Але не факт, што не збярэцца зноўку.

— Усіх іх я лічу дармаедамі, — расказвае пасля Кумагер. — Акрамя аднаго, ніхто з іх не працуе і нават не думае шукаць працу. Я спачатку праводжу простую прафілактычную размову, але многія пачынаюць паводзіць сябе неадэкватна. У аднаго з іх маладая жонка. Яна ў дэкрэтным водпуску. Ён не працуе, а жыве за грошы, якія атрымлівае старая маці. Гэтая сям'я знаходзіцца на нашым ліку як сацыяльна небяспечная. Дома пануе антысанітарыя. Трэба з гэтым нешта рабіць...

У працоўным кабінеце ўчастковага, які знаходзіцца ў адным будынку з сельвыканкамам, усё сціпла: стол, паперы, шафа... Ён сядае за стол і адкрывае папку, змест якой, напэўна, даўно добра ведае. Пытаюся, ці не хоча ён перамен у сваім жыцці, магчыма, паехаць працаваць у больш буйны горад.

— Думкі розныя ўзнікаюць, але ў мяне і тут усё добра складваецца, — кажа перад вяртаннем у райцэнтр Дзмітрый Кумагер. — Тым больш з кіраўніцтвам ва ўсіх пытаннях знаходжу паразуменне. Мяне падтрымліваюць. Зараз пераязджаць нікуды не збіраюся. Мне тут падабаецца. Ды і працы таксама.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

# З НАЖАМІ»

міліцыянер мае пры сабе табельную зброю. Усё ж такі розныя сітуацыі бываюць. Аляксей Пяркоў прыгадвае, што былі выпадкі, калі і з нажамі спрабавалі кідацца на праваахоўнікаў, але ўсё заканчвалася пазітыўна.

Сёння да паднаглядных мы накіроўваемся разам са старшым інспектарам Андрэем Лісіцынам і яго калегай — лейтэнантам Юліяй Дашчэчкай. За змену ім трэба наведаць да дванаццаці адрасоў. Мы суправаджаем на трох. Усё ідзе добра. Першы чалавек, які адчыняе дзверы, выглядае бадзёра, хоць твар выдае няпростае мінулае. Размова з міліцыяй доўга не зацягваецца, і мы рушым далей. Праз хвілін пяць ужо на новым адрасе. Андрэй Лісіцын звоніць у дамафон. Доўга не адкрывалі, але потым у дынаміку ўсё ж такі загучаў мужчынскі голас. Дзверы адчынілі, але калі праваахоўнікі зайшлі ў кватэру, запоўненую цяжкім пахам, падапечнай, асуджанай раней за аліменты, там не аказалася.

— Яна выйшла, — сказаў мужчына, які аказаўся яе сужыцелем. — Але неўзабаве будзе.

Чакаць прыйшлося доўга. У выніку супрацоўнікі міліцыі не вытрымалі і самі рушылі на пошукі. Жанчына аказалася ў сяброўкі ў суседнім пад'ездзе. Была ў нецвярозым стане, ісці на кантакт з міліцыяй не надта збіралася. У выніку праваахоўнікі зафіксавалі ўжо чацвёртае парушэнне (што пагражае ёй пазбаўленнем волі) і запрасілі ў РУУС на размову. Міліцыянеры ўпэўнены: на гэту сустрэчу яна прыйдзе абавязкова.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Калі дабіраемся да кватэры наступнага паднаглядннага, дзверы адчыняе дзяўчына, чуваць голас дзіцяці. Інтэр'ер выглядае даволі прыстойна. На імгненне здаецца, што мы памыліліся адрасам, аднак усё насамрэч не так проста. Неўзабаве ў пярэдні пакой выходзіць Арсень, які і з'яўляецца мэтай сённяшняга наведвання міліцыянераў. Як кажа сам, парушыў закон, бо абараніў гонар маці. Зрабіў гэта з прымяненнем фізічнай сілы. Усё дайшло да міліцыі. Вось і знаходзіцца пад наглядам.

— Атрымаў два гады «хіміі», — кажа хлопец. — Лічу пакаранне заслужаным часткова. Я ўзорны сем'янін, працую як магу. Нічога дрэннага не раблю. Адказнасць можна было б ужо і зняць. Тая сітуацыя з бойкай адбылася спантанна. Я наогул супраць гвалту. Я гуманіст у душы.

***— Ці спрабаваў уладкавацца афіцыйна на працу?***

— Большасць такіх, як я, не могуць знайсці сабе працу. Напэўна, нас лічаць нядобранадзейнымі. Але мы добрыя людзі. Многім проста здаецца інакш. З тым, каго пабіў, усё памірыўся. Я ж кажу, гэта было спантанна.

***— І што думаеш пра сваю будучыню?***

— Сям'я. Дзеці. Дом. Праца.

**Якаў ЖУРБІН.**

## ■ Ну і ну!

# КАБ ВЫКЛІКАЦЬ ЖАЛЬ КАХАНАЙ, ХЛОПЕЦ... ПАРЭЗАЎ САБЕ РУКУ

**Супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы выкрыты малады чалавек, які для таго, каб прымірыцца з дзяўчынай, абвінавачаў невядомага хулігана ў прычыненні яму нажавой раны.**

— У бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі з рэзанай ранай левага перадплечча быў дастаўлены 18-гадовы малады чалавек, які патлумачыў, што на яго напаў невядомы і падчас канфлікту прычыніў нажавое раненне. Супрацоўнікам крымінальнага вышуку хлопец расказаў, што ён гуляў у адным са сталічных паркаў, калі да яго падышоў невядомы мужчына і без аніякіх прычын нанёс удар нажом па руцэ, пасля чаго ўцёк, — расказала прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна Абозная.

Падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў аператыўнікамі было ўстаноўлена, што цялесныя пашкоджанні хлопец прычыніў сабе сам. Абвінавачаны ў падмане малады чалавек прызнаўся, што на такі крок яго штурхнула сварка з дзяўчынай. Каб выклікаць жаль каханай, ён вырашыў інсцэніраваць напад на сябе: адправіўся ў адзін са сталічных паркаў, дзе нанёс сабе неглыбокую рану рукі нажом, які належаў яму.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

# ДОБРЫ ЎРАЧ СПІЦЬ СПАКОЙНА

**Доктар навук, прафесар медыцыны, выкладчыца Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, аўтарка больш як двухсот навуковых прац, практыкуючы кардыёлаг і крыніца кіпучай жыццёвай энергіі — адзін чалавек, Тамара Цябут. І гэта ўсё не дзіўна, бо яна сапраўдная дачка свайго бацькі — Дзмітрыя Васілевіча Цябута, які быў камандзірам партызанскай брыгады, а пасля вайны — старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. Мы пагаварылі з Тамарай Дзмітрыеўнай пра бацьку, прафесію ўрача і прызванне жыць з радасцю.**



## «Калі возьмеш на сябе ўсю праблему, не зможаш дапамагчы»

***— Давайце пачнем з простага. З якім настроем вы сёння прачнуліся?***

— Апошнія гады я кожную раніцу прачынаюся ў добрым настроі. Таму што яна адзіная, яна непаўторная... А жыццё такое, што ніколі не ведаеш, якім будзе наступны дзень. Як бы наіўна гэта не гучала, але трэба радавацца кожнаму з іх.

***— Бывае такое, што вам вельмі не хочацца ісці на працу?***

— Вы ведаеце, мне, мабыць, пашанцавала, бо з першага дня ў мяне няма стомленасці ад таго, што раблю. Я заўсёды працавала з добрымі людзьмі, і гэта вельмі падтрымлівала і натхняла. Магчыма, часам залішні паток папер — гэта зусім не маё. Але сваю працу навуковую, выкладчыцкую, лячэбную я раблю з задавальненнем.

***— А маральнай стомленасці няма?***

— Адназначна, не. На гэту тэму я вельмі люблю распавядаць гісторыю пра свайго бацьку. Калі я атрымала дыплом, ён мяне павіншаваў і пажадаў спаць спакойна на працягу ўсяго жыцця. Я тады ўсё смяялася: «Але ж дзяжурства ў бальніцы — гэта ж найлепшае месца для камфортнага сну». А ён меў на ўвазе зусім іншае: спаць спакойна, таму што не адчуваеш пакут сумлення з-за таго, чым займаешся. Цяпер я магу ацаніць усю мудрасць яго пажадання.

Я ў прафесіі ўжо больш за 40 гадоў і не магу сказаць, што за гэты час у мяне былі канфлікты з калегамі ці з пацыентамі. Дапамагае пэўная вытрымка і разуменне таго, што таму, хто да цябе звярнуўся, значна горш.

***— Вам увесь час даводзіцца сутыкацца з цяжкімі жыццёвымі становішчамі іншых людзей. Наколькі гэта на вас уплывае?***

— Ёсць такое паняцце — перанос праблемы пацыента на сябе. Мне дапамагае тое, што я вучылася на кафедры медыцынскай псіхалогіі і псіхатэрапіі. І многія праблемы, якія ўзнікаюць у доктара, калі ён не можа падзяліць «сваё» і «чужое», у той жа час не страціўшы пачуцця суперажывання, былі там растлумачаны. Я лічу, што гэты курс псіхалогіі павінен праходзіць кожны студэнт медыцынскай ВНУ, таму што, калі чалавек не валодае такімі ведамі, у яго фарміруецца сіндром эмацыянальнага выгарання. Вядома, урач не павінен быць абыякавым, але калі ён усю праблему пацыента забярэ на сябе, то проста не зможа яму дапамагчы.

***— Былі моманты, калі вас не пакідала думка: а ці правільна я ўсё раблю?***

— Разумееце, ёсць пацыенты са стандартным дыягназам, а ёсць складаныя хворыя. Мы такія выпадкі абмяркоўваем і адзін, і два, і тры разы, склікаем кансіліумы, разбіраем іх з медыкамі-слухачамі на лекцыях, думаем, ці правільна праводзіці лячэнне, а за прафесарам часта вырашальнае слова. У кожнага лекара ёсць умоўная кніга такіх «цікава-складаных» клінічных выпадкаў, да якой ён вяртаецца ўсё жыццё.

***— Гэта значыць, спаць спакойна ўсё ж удаецца?***

— Так. У мяне дэфіцыт сну, я магу спаць усюды. У аўтобусе, стоячы, абы паспаць (*смяецца*).

## «Паміж пацыентам і ўрачом павінен быць кантракт»

***— З трох напрамкаў вашай працы: выкладчыцкага, навуковага і лячэбнага, які вам найбольш блізкі?***

— Іх нельга падзяліць — гэта трыадзінства. Наша кафедра кардыялогіі і рэўматалогіі не тэарэтычная, а практычная: урачы прыязджаюць для таго, каб на справе павысіць кваліфікацыю. Я вельмі доўга дзяжурыла, перастала, толькі ўжо стаўшы доктарам навук у 2002 годзе, бо выкладаць экстранную кардыялогію, не працуючы менавіта з гэтым пацыентам, немагчыма. А якім ты будзеш навуковым супрацоўнікам, калі не будзеш ведаць, што ж трэба ў гэтай навуцы для ўрача-практыка? Такая разнастайнасць дзейнасці дапамагае ўвесь час трымаць сябе ў тонусе, павышаць свой прафесійны ўзровень.

На шчасце, у нас ёсць магчымасць ездзіць на міжнародныя канферэнцыі, кангрэсы, ды і ў Беларусі цяпер праводзіцца мноства форумаў. У маі быў Еўразійскі кангрэс па рэўматалогіі, у снежні будзе чарговы з'езд па кардыялогіі.

***— Беларускім медыкам ёсць чым падзяліцца?***

— Безумоўна, у развіцці кардыялагічнай навукі за апошнія гады быў зроблены вялізны крок наперад. Мы не адстаём ад еўрапейскіх краін і па вядзенні пацыентаў з вострым каранарным сіндромам, і па трансплантацыі сэрца. Сёння ў Беларусь прыязджаюць шматлікія пацыенты з іншых краін менавіта на трансплантацыю. Рыхтуецца перасадка комплексу сэрца-лёгкія, а такія аперацыі пакуль адзінкавыя ў свеце.

Сказаць, што ўсё бліскуча і больш няма чаго рабіць, безумоўна, нельга. Па-першае, гэта сведчыла бы аб спыненні развіцця, а значыць, і паступовым спыненні жыцця; па-другое, гэта няпраўда.

***— У якім напрамку трэба рухацца?***

— Акцэнт трэба рабіць не толькі на лячэнні, але і на першаснай прафілактыцы. Даследаванні паказалі, што праца з фактарамі рызыкі значна больш важная, чым укараненне самых сучасных тэхналогій. Трэба ўважліва сачыць за ціскам, узроўнем халестэрыну, пазбаўляцца ад шкодных звычак, не забываць аб фізічнай актыўнасці. І, вядома, абавязкова праходзіць штогадовыя агляды.

У большасці пацыентаў такая пазіцыя: я прыйшоў да ўрача, ён мне прызначыў таблеткі, яны дапамаглі — добры ўрач. А праз год мне стала дрэнна. Чаму мне стала дрэнна? Дрэнны доктар? Ды не, таму што, прапіўшы 1-2 упакоўкі таблетак, пацыент, напрыклад, з артэрыяльнай гіпертэнзіяй працягвае курыць, мець лішнюю масу цела і сядзець вечарамі ля тэлевізара, пазбягаючы фізічнай нагрузкі.

Я лічу, што павінен быць кантракт паміж пацыентам і ўрачом: імкнешся да здароўя — выконвай усе прадпісанні, не — дык не марнуй чужы час. А абавязак кожнага чалавека, калі ён хоча, каб яго дзяржава квітнела, — быць здаровым.

## «Як вам падзякаваць?» — «Памаліцеся»

***— Калі вы адчулі цікавасць да медыцыны?***

— Паверце, заканчваючы школу, я не думала ісці ў медыцынскі інстытут, як гэта сёння ні смешна, але я збіралася паступаць на факультэт журналістыкі. Перавярнула маё жыццё старэйшая сястра, якая ўжо тады працавала ўрачом і ў гэтую ж прафесію настойліва цягнула мяне. Можа быць, гэта быў водгалас таго, што ўся яе група вывучала на мне, маленькай дзяўчынцы, косці і рабіла пробныя перавязкі. Але ў 17 гадоў у мяне быў «важкі» (*смяецца*) аргумент, чаму я не магу паступаць у медыцынскі: баюся трупаў!



Партызаны брыгады імя К.Варашылава.

Прывезлі мяне ў анатамічку, я іду і кажу сабе: страць прытомнасць, страць прытомнасць. Не страчваецца! «Ну, раз не падаеш — пойдзеш у медінстытут», — так усё і вырашылася.

***— Цяпер вы ўпэўнены, што медыцына — гэта ваша прызванне?***

— Напэўна, так. Але я не абмяжоўваю жыццё толькі гэтым. Перыяд інтэнсіўнай працы, калі я нічога не бачыла, акрамя медыцыны, прайшоў. Цяпер я вярнулася да таго, што вельмі любіла рабіць у маладосці. Я хаджу ў тэатры, на канцэрты, выстаўкі, пачала шыць мяккія цацкі, рабіць паштоўкі, зноў села за швейную машынку. Ёсць пакліканне жыць, жыць з радасцю.

***— Якімі якасцямі, на ваш погляд, трэба валодаць, каб стаць добрым урачом?***

— Першае, што бы я ўявіла пры паступленні ў медыцынскія ВНУ, — гэта псіхалагічнае тэсціраванне. Нельга чалавека неўраўнаважанага, які не ўмее суперажываць, пускаць у гэту прафесію. Патрэбна моцнае жаданне развівацца, ніколі не спыняцца на дасягнутым, а вось амбіцыйнасць у нашай справе хутчэй прыносіць шкоду.

Не варта саромецца пытацца, таму што ўсё ведаць немагчыма. Калісьці на 4 курсе інстытута прафесар Аўдзей мяне вельмі добра гэтаму навучыў. Мы абследавалі брушную поласць з дапамогай апарата. Усе па чарзе глядзяць, я таксама падышла: нешта чырвонае прамільгнула, а потым — суцэльная цемра. Прафесар пытаецца: «Што бачыце?» А як жа гэта ўсе бачылі, а я не? Я добра ведала тапаграфічную анатомію і пачала яму расказваць, што я магла б там убачыць. А ён смяецца і кажа: «Праблема медыцыны вырашана, калі нават пры выключанай лямпачцы студэнт можа паставіць дыягназ».

***— Вы верыце ў лёс, прадвызначэнне?***

— З узростам так. Тое, што не залежыць ад нашых дзеянняў, веду, прысутнічае і ў медыцыне, і ў паўсядзённым жыцці. Але сказаць, што я чалавек глыбока веруючы, я б не змагла: для гэтага трэба ведаць у рэлігіі значна больш. Але ў тым, што ёсць пэўная сіла, якая нас падтрымлівае і суправаджае, я не сумняваюся.



**Дзмітрый Васілевіч ЦЯБУТ, легендарны камбрыг.**

Тамара Дзмітрыеўна ківае на мноства абразоў, што размясціліся за яе спінай на этажэрцы: «Пацыенты дараць. А гэта ж падарунак, ад якога нельга адмовіцца. Вось мой першы абразок — Божая Маці Лекарка. Ён асабліва каштоўны для мяне, таму стаіць на стале. А тут Еўфрасіння Полацкая, звязаная з месцам майго нараджэння, — землякі прывезлі разам з малітвай Опцінскіх старцаў. У цяжкія часы яна мне вельмі дапамагае. Вера павінна быць, без веры чалавек не жывы.

***— Не крыўдна, што лечыць урач, а людзі дзякуюць Богу?***

— Гэта нармальна. На пытанне аб тым, як вам падзякаваць, я сама заўсёды адказваю: схадзіце ў царкву, памаліцеся за сваіх родных, за доктара.

## «Рабі як мы, рабі з намі, рабі лепш за нас»

***— Які ваш першы ўспамін з дзяцінства?***

— Вельмі добра памятаю, як мы ездзілі збіраць грыбы. Тата быў выдатным грыбніком — лясны чалавек. Я ж ніколі гэтых грыбоў не бачыла. А ён казаў: вось тут паглядзі і вунь там. Першы ўспамін, які прыходзіць у галаву, — мы знайшлі вялізны грыб. Мабыць, ён быў і не такі вялікі, але мне здавалася, што ён у палову мяне. Шкада, што тады не было фотаапарата, хоць гэты баравік-гігант і сёння стаіць перад маімі вачыма.

Тата вадзіў нас «партызанскімі» сцежкамі; яны маглі быць у любым лесе, на дачы; потым мы сядзелі каля агню, пяклі бульбу, ён расказваў пра сваіх сяброў. Але гэта былі вельмі далікатныя апавяданні, ён нас бярог.

***— Хто аказваў на вас найбольшы ўплыў у дзяцінстве?***

— Выхаваннем займалася пераважна бабуля, таму што бацькі ўвесь час працавалі. У мяне дзве старэйшыя сястры, чытаць-пісаць мяне вучылі менавіта яны, а потым я нават на спатканні з імі бегала.

Тата быў для нас героем. І яго пісталет, і яго кабура, партупея, і ваенная форма — усё выклікала шчырае дзіцячае захапленне. Ён быў чалавекам справядлівым, пра гэта кажуць і людзі, якія з ім працавалі. Тата мог ускіпець, павысіць голас, але вельмі хутка адыходзіў і пачынаў вырашаць праблему. Мама была чалавекам больш строгім, патрабавала ад нас дысцыпліны. Але ў дзяцінстве нас ніколі не каралі. Быў толькі жорсткі лозунг: вы павінны рабіць так, каб нам не было сорамна. Я сёння смяюся і кажу: «Што ж вы нам не тлумачылі тады, ад чаго вам можа быць сорамна?»

***— Ці ёсць пытанні, якія вы зараз хацелі б задаць свайму бацьку?***

— Іх велізарнае мноства. Спачатку ўсё адкладваеш на потым, здаецца, будзе трэба — спытаю, а потым становіцца непапраўна позна. Я б хацела менавіта з яго вуснаў пачуць аповед аб прарыве блакады ў 1944 годзе, манёўр, за які бацька, камандзір брыгады, атрымаў ордэн Кутузава I ступені № 489 — гэта ўзнагарода, якая прысуджалася вышэйшым армейскім чынам. Так бы хацелася даведацца, як ён разважаў, як ён усё планаваў...

***— Сам бацька неахвотна расказваў?***

— Ды часу ўсё неяк не было. Калі ён вадзіў нас па партызанскіх сцежках, то расказваў пра тое, што можа быць цікава дзецям. Пазней ён напісаў некалькі кніг пра партызанскую барацьбу і пасляваенае аднаўленне гаспадаркі. Здавалася, што, прачытаўшы іх, усё ведаеш. Але жывыя зносіны нішто не заменіць.

Вы бачылі сустрэчы былых партызанаў: столькі маладога запалу, столькі радасці, столькі песень, столькі ўспамінаў. Горкія хвіліны, якія ім давялося перажыць, прывялі їм усеабдымную любоў да жыцця.

Падчас працы на чале Мінскага аблвыканкама ў бацькі практычна не было выхадных, ён заўсёды быў у руху, ездзіў па вобласці, часам і мяне браў з сабой, таму аб тым, як Мінская вобласць атрымала 2 ордэны Леніна, я ведаю не па чутках, памятаю людзей, якія працавалі з ім у той час, — Палякоў, Рахунаў, Малюковіч, Матуз, Бляўская, Голубеў, Цвірка. Побач з бацькам заўсёды былі яго нязменныя намеснікі — Сакулевіч, Лашук, Трапянок, Малчан, Семеж. Усе гэтыя людзі любілі Міншчыну і рабілі ўсё для яе росквіту.

***— Складана было адпавядаць бацькам?***

— Гэта было абсалютна натуральна. Нам не трэба было нікуды цягнуцца. Мы проста жылі і працягваем жыць па негалосным прынцыпе, прынятым у сям'і: рабі як мы, рабі з намі, рабі лепш за нас.

**Дар'я КАСКО.**

*kasko@zviazda.by*

# ООО «Юридическая компания Аспект» проводит повторные ОТКРЫТЫЕ ТОРГИ в форме аукциона по продаже имущества ООО «МОДЕРАТО», находящегося в процедуре ликвидации

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот (без НДС), руб.* | Шаг торгов, руб. | Задаток для участия в торгах, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Буровая установка 1БА15К на шасси МАЗ 5337 1989 г.в. с к-том буров. инстр-та (224,2 м) и ротором-приставкой Р410 | 45 000,00 | 2 250,00 | 4 500,00 |
| 2 | Буровая установка УГБ - 3УК | 5 328,18 | 266,41 | 532,82 |
| 3 | Сварочный аппарат АДД-400141 | 1 005,75 | 50,29 | 100,58 |
| 4 | Емкость металлическая | 392,44 | 19,62 | 39,24 |
| 5 | Автомобиль KAMAZ 5320 (с гидроманипулятором) 1990 г.в. | 11 850,30 | 592,52 | 1 185,03 |
| 6 | Прицеп бортовой (зеленый) на шасси Маз 8925 1989 г.в. с компрессором ПВ-10 | 6 138,00 | 306,90 | 613,80 |
| 7 | Прицеп бортовой (серый) на шасси Маз 8925 1989 г.в. | 1 032,75 | 51,64 | 103,28 |
| 8 | Грузовой спец.автомобиль ZIL 130, цистерна (Аэродромная поливомоечная машина АКПМ-3) | 4 608,45 | 230,42 | 460,85 |

| | |
|---|---|
| **Продавец:** | **ООО «МОДЕРАТО»** |
| **Организатор торгов:** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Место проведения торгов:** | **г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (минус 1 этаж)** |
| **Дата и время проведения торгов:** | **12.09.2016 в 11.00** |
| **Срок подачи заявок:** | **по 08.09.2016 до 18.00** |
| **Порядок подачи заявок:** | **организатору торгов по месту проведения торгов либо по адресу: 220050, г. Минск, а/я 85** |
| **Срок внесения задатка:** | **по 08.09.2016** |
| **Реквизиты для оплаты задатка:** | **Бенефициар – Брестский филиал ООО «МОДЕРАТО» р/с в бел. руб. № 3012441147019 в Дирекции ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» по Брестской области, г. Брест, код 739, УНП 201002999** |

**Условия торгов:**

• к участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;

• лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка (задатков), с отметкой банка. При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:

- юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом РБ): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;

- индивидуальным предпринимателем: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

- представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя: нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;

• заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;

• победитель торгов оплачивает цену лота **с учетом НДС 20%**, за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи;

• в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, возмещения затрат на организацию и проведение торгов, подписания договора, а также в иных случаях, предусмотренных актами законодательства, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;

• в случае, если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов

* – в денежных знаках Республики Беларусь образца 2009 г.

Предыдущее извещение о торгах опубликовано в печатном издании газеты «Звязда» за 19.07.2016 г.

Получить дополнительную информацию о порядке проведения аукциона можно по телефонам +375 (44) 5986627, 8(017)2130699.

# Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»
## 30 сентября 2016 г. проводит открытый аукцион
## по продаже земельных участков в частную собственность в Логойском, Минском и Узденском районах

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, определенном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации для проведения аукциона, бел. руб. | Начальная цена земельного участка, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Логойский район, Околовский с/с, д. Жестиное, ул. Центральная, 14 | 623285404101000127 | 0,1185 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 585,58/ 15 855 823 | 511,07/ 5 110 668 | 100,00/ 1 000 000 |
| 2 | Логойский район, Околовский с/с, д. Жестиное, ул. Центральная, 54 | 623285404101000125 | 0,1216 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 340,04/ 13 400 391 | 851,20/ 8 512 000 | 170,00/ 1 700 000 |
| 3 | Логойский район, Околовский с/с, д. Жестиное, ул. Центральная, 54А | 623285404101000126 | 0,1047 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 375,25/ 13 752 488 | 732,90/ 7 329 000 | 140,00/ 1 400 000 |
| 4 | Логойский район, Околовский с/с, д. Коргово, 19А | 623285406101000034 | 0,2079 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 349,56/ 13 495 630 | 787,70/ 7 876 957 | 150,00/ 1 500 000 |
| 5 | Логойский район, Околовский с/с, д. Коргово, 38 | 623285406101000032 | 0,1952 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 349,56/ 13 495 630 | 739,58/ 7 395 777 | 140,00/ 1 400 000 |
| 6 | Логойский район, Околовский с/с, д. Коргово, 38А | 623285406101000033 | 0,2221 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 349,56/ 13 495 630 | 841,50/ 8 414 969 | 160,00/ 1 600 000 |
| 7 | Логойский район, Околовский с/с, д. Першемайская, д. 7В | 623285410101000011 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 714,23/ 7 142 301 | 1 078,20/ 10 782 000 | 210,00/ 2 100 000 |
| 8 | Логойский район, Околовский с/с, д. Першемайская, д. 15 | 623285410101000012 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 714,23/ 7 142 301 | 1 078,20/ 10 782 000 | 210,00/ 2 100 000 |
| 9 | Логойский район, Околовский с/с, д. Подчерница, 2Б | 623285410601000013 | 0,1997 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 425,97/ 14 259 688 | 1 210,00/ 12 100 000 | 240,00/ 2 400 000 |
| 10 | Логойский район, Околовский с/с, д. Подчерница, 2В | 623285410601000016 | 0,1998 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 381,91/ 13 819 112 | 1 210,00/ 12 100 000 | 240,00/ 2 400 000 |
| 11 | Логойский район, Околовский с/с, д. Подчерница, 7 | 623285410601000014 | 0,1913 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 425,97/ 14 259 688 | 1 160,00/ 11 600 000 | 230,00/ 2 300 000 |
| 12 | Логойский район, Околовский с/с, д. Подчерница, 7А | 623285410601000012 | 0,2031 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 381,91/ 13 819 112 | 1 230,00/ 12 300 000 | 240,00/ 2 400 000 |
| 13 | Логойский район, Околовский с/с, д. Подчерница, 7Б | 623285410601000015 | 0,2060 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 314,71/ 13 147 112 | 1 250,00/ 12 500 000 | 250,00/ 2 500 000 |
| 14 | Минский район, Горанский с/с, садоводческое товарищество «Белмонэф», участок № 70 | 623681300020000033 | 0,1240 | Для ведения коллективного садоводства | Ведется прокладка сетей электроснабжения, водоснабжения и канализации | 45,00/ 450 000 | 6 944,00/ 69 440 000 | 1 380,00/ 13 800 000 |
| 15 | Минский район, Горанский с/с, садоводческое товарищество «Белмонэф», участок № 77 | 623681300020000116 | 0,1380 | Для ведения коллективного садоводства | Ведется прокладка сетей электроснабжения, водоснабжения и канализации | 54,00/ 540 000 | 7 911,00/ 79 110 000 | 1 580,00/ 15 800 000 |
| 16 | Минский район, Горанский с/с, садоводческое товарищество «Белмонэф», участок № 114 | 623681300020000088 | 0,1497 | Для ведения коллективного садоводства | Ведется прокладка сетей электроснабжения, водоснабжения и канализации | 45,00/ 450 000 | 8 653,00/ 86 530 000 | 1 730,00/ 17 300 000 |
| 17 | Минский район, Горанский с/с, садоводческое товарищество «Белмонэф», участок № 127 | 623681300020000075 | 0,1080 | Для ведения коллективного садоводства | Ведется прокладка сетей электроснабжения, водоснабжения и канализации | - | 6 238,00/ 62 380 000 | 1 240,00/ 12 400 000 |
| 18 | Минский район, Горанский с/с, садоводческое товарищество «Белмонэф», участок № 128 | 623681300020000074 | 0,1269 | Для ведения коллективного садоводства | Ведется прокладка сетей электроснабжения, водоснабжения и канализации | - | 7 446,00/ 74 460 000 | 1 480,00/ 14 800 000 |
| 19 | Узденский район, Озерский с/с, д. Дубище, ул. Новая, 6 | 625682504101000059 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 237,01/ 12 370 070 | 8 000,00/ 80 000 000 | 1 600,00/ 16 000 000 |
| 20 | Узденский район, Озерский с/с, д. Нитиевские, ул. Центральная, 17А | 625682508101000060 | 0,1381 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 278,18/ 12 781 821 | 7 500,00/ 75 000 000 | 1 500,00/ 15 000 000 |
| 21 | Узденский район, Озерский с/с, аг. Озеро, ул. Рождественская, 1б | 625682508601000879 | 0,1298 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 045,35/ 10 453 466 | 23 000,00/ 230 000 000 | 4 600,00/ 46 000 000 |
| 22 | Узденский район, Узденский с/с, д. Бервищи, ул. Центральная, 77 | 625684200601000175 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 192,55/ 11 925 470 | 5 000,00/ 50 000 000 | 1 000,00/ 10 000 000 |
| 23 | Узденский район, Узденский с/с, аг. Зеньковичи, ул. Дружная, 4 | 625684204101000444 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 124,29/ 11 242 909 | 3 900,00/ 39 000 000 | 780,00/ 7 800 000 |
| 24 | Узденский район, Узденский с/с, аг. Зеньковичи, ул. Дружная, 6 | 625684204101000442 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 124,29/ 11 242 909 | 3 900,00/ 39 000 000 | 780,00/ 7 800 000 |
| 25 | Узденский район, Узденский с/с, аг. Зеньковичи, ул. Дружная, 10 | 625684204101000451 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 090,69/ 10 906 887 | 4 150,00/ 41 500 000 | 830,00/ 8 300 000 |
| 26 | Узденский район, Узденский с/с, аг. Зеньковичи, ул. Дружная, 12 | 625684204101000450 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 090,69/ 10 906 887 | 4 150,00/ 41 500 000 | 830,00/ 8 300 000 |
| 27 | Узденский район, Узденский с/с, п. Каменка, ул. Солнечная, 17 | 625684204901000073 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 124,29/ 11 242 909 | 1 350,00/ 13 500 000 | 270,00/ 2 700 000 |
| 28 | Узденский район, Узденский с/с, д. Маковищи, ул. Центральная, 43А | 625684206201000099 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 933,81/ 9 338 142 | 2 000,00/ 20 000 000 | 400,00/ 4 000 000 |

*** Граждане, желающие принять участие в аукционе по продаже земельных участков в садоводческом товариществе «Белмонэф», предупреждаются о необходимости возмещения победителем (единственным участником) аукциона садоводческому товариществу «Белмонэф» затрат на обеспечение инженерной инфраструктуры земельных участков в размере 16 000,00 (шестнадцать тысяч) белорусских рублей.*

**Аукцион состоится 30 сентября 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 26 сентября 2016 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и 13.30 до 17.00.**

**Контактные телефоны: + 375 (17) 205-46-61, +375 (44) 789-10-18.**

**Задатки для участия в аукционе перечисляются не позднее 26 сентября 2016 года на следующие расчетные счета:**

**на лоты 1–13** перечисляется **на расчетный счет № 3600619121105 Околовского сельисполкома**, ЦБУ № 611 филиала № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк», Минская область, г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, код 601, УНП 600181669, код платежа – 04901;

**на лоты 14–18** перечисляется **на расчетный счет № 3012108260016, ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, БИК 153001369, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»;**

**на лоты 19–21** перечисляется **на расчетный счет № 3641062500143 Озерского сельисполкома**, ЦБУ № 625 филиала № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк», Минская область, г. Узда, б-р Дзержинского, 7, код 601, УНП 600110154, код платежа – 04901;

**на лоты 22–28** перечисляется **на расчетный счет № 3641062500071 Узденского сельисполкома**, ЦБУ № 625 филиала № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк», Минская область, г. Узда, б-р Дзержинского, 7, код 601, УНП 600110062, код платежа – 04901.

Для участия в аукционе необходимо:

**внести задаток (задатки) не позднее 26 сентября 2016 г.** в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона);

**представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за земельный участок в размере начальной цены земельного участка, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка **обязан:**

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить местному исполнительному комитету расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте (массиве застройки). Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

# ЯК НАСТРОІЦЦА НА ШКОЛУ?

## Вось які ты, адпачынак

*— Чым павінны былі займацца нашы дзеці летам?*



**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Адпачываць і аздараўляцца. На гэта скіраваныя нават дашкольныя ўстановы і школы, якія распрацоўваюць спецыяльныя праграмы. Дашкольнікам, напрыклад, павялічваюць норму харчавання. Калі дзеці адпачываюць з бацькамі, значыць, распрацаваць «праграму аздараўлення і адпачынку» — задача бацькоў.



**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Трэба прадумваць экскурсійную праграму, пастаянна заахвочваць і задавальняць дзіцячую цікаўнасць. Нават ідучы па Мінску, можна расказаць пра паходжанне назвы вуліцы, пра з'яўленне першага тралейбуса, пра ўсё, што мы бачым навокал. Час адпачынку выдатна падыходзіць для даследаванняў. У дашкольным узросце трэба закласці падмурак для далейшага развіцця інтэлекту.



**Юлія ЕЎЛАШ:** — Дзіця ўвесь гэты час павінна было як мага больш кантактаваць з равеснікамі. Рэальная камунікацыя — праблема для падрастаючага пакалення. Выдатна, калі была магчымасць паездкі да бабулі на вёску, у лагер адпачынку. Пры гэтым і самі бацькі павінны былі як мага больш часу прысвяціць дзіцяці (пры цягам года ім пастаянна не хапала часу!)... І дашкалятам, і малодшым школьнікам на карысць будуць гульні ўсёй сям'ёй. Дарэчы, і цяпер, калі пачынаецца школа, перш чым пасадзіць дзіця за ўрокі, не забывайцеся пагуляць з ім, адарваць ад камп'ютара.



**Таццяна БЯЛТ:** — Самае важнае летам — эмацыянальна і фізічна адпачыць ад работы ў школе. Для малодшага школьніка вучоба — менавіта цяжкая праца... Не варта было забываць пра спіс літаратуры. Ён невялікі, асіліць можна. Ідэальны варыянт — друкаваная кніга, чытанне якой спрыяе моўнаму, фанетычнаму развіццю. Вялікіх перапынкаў тут быць не павінна. Адсутнасць чытання цягам нейкага часу спрыяе таму, што дзіця страчвае навык — зніжаецца хуткасць. Неабходна прысвячаць такому занятку хоць бы 15 хвілін штодня. Звычайна таго, хто чытае бегла, і прымушаць да такога занятку не трэба — яго не адарваць ад кнігі, але ёсць і такія, хто катэгарычна не жадае. У такім выпадку трэба кантраляваць і заахвочваць чытаць услых рэгулярна, а пасля яшчэ абавязкова прасіць расказаць аб прачытаным.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Аксана ПЯЦЭВІЧ:** — Аздараўленне ў нас добра арганізаванае ў загарадных і школьных лагерах, дзе можна было атрымаць рэабілітацыю — кіслародныя кактэйлі, жамчужныя ванны, сонечныя ванны, там і плаванне, і ўжыванне вітамінаў... Калі ў дзіцяці не было магчымасці аздараўлення сёлета, прадумайце план налета.

Зразумела, лета — гэта іншы рэжым, дзеці могуць класціся спаць і прачынацца крыху пазней, але перад пачаткам навучальнага года трэба вярнуцца да ранейшага рэжыму, і тады адаптацыя пройдзе лягчэй.

## Дарослыя, а не ведаюць

*— Дарэчы, ці на карысць і дзецям, і дарослым такі працяглы адпачынак? І што яшчэ трэба зрабіць сям'і, каб лягчэй адаптавацца да новага навучальнага года?*

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Адпачынак патрабуецца і дзецям, і дарослым, але дзецям асабліва, бо яны хутка растуць, хутчэй стамляюцца і перагружаюцца. Так што працяглы адпачынак — гэта выдатна, але ён скончыўся, і бацькі павінны падумаць, як хутчэй настроіцца на новы лад. Наогул рэзкіх хістанняў тут быць не павінна. Не варта дапускаць, каб дзіця клалася спаць глыбокай ноччу, суткамі сядзела за камп'ютарам, аднак калі пачынаецца школа, то не варта дапускаць яшчэ і перагрузак з падрыхтоўкай урокаў, не караць за невысокія адзнакі.

**Таццяна БЯЛТ:** — Сёння дзяцей жорстка не караюць, хутчэй, усё дазваляюць і балуюць.

**Самая распаўсюджаная праблема дарослых у тым, што яны шмат увагі ўдзяляюць знешняму боку, а ўнутраны — дзіцячыя перажыванні, жаданні, памкненні — застаецца «за кадрам».**

**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Сапраўды, у новага пакалення парушана нават субардынацыя. Ёсць дзеці, якія ў адказ на просьбу выхавацелькі нешта выканаць могуць сказаць: я не буду з табой сябраваць! Маладыя бацькі сёння імкнуцца адасобіцца ад старэйшага пакалення, не жадаюць прыслухоўвацца да іх парад... Усе хочуць жыць толькі сваім розумам, аднак ведаў, навыкаў часам катастрафічна не хапае. Здаецца, элементарная рэч: усталявалася дажджлівае надвор'е, сонца стала менш, у дзіцяці можа з'явіцца сумны настрой, значыць, не трэба яго лішні раз нерваваць і тузаць! А вось калі прыпякае сонца, значыць, трэба паклапаціцца пра галаўны ўбор, бо малыя вельмі хутка пераграваюцца. Некаторым жа мамачкам здаецца, што дзіцяці дастаткова толькі шмат вадкасці. Патрэбна і адно, і другое! І такіх «дробязяў» безліч...

Дзецям сапраўды патрэбна вельмі шмат увагі, да кожнага свой падыход. Не для таго, каб празмерна апякаць ці муштраваць, а для таго, каб паспрыяць правільнаму інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю. Я працую ў садку для дзяцей з асаблівасцямі моўнага развіцця. З імі трэба займацца штодня, і намаганняў аднаго толькі лагапеда недастаткова. Дома трэба працягваць размаўляць і займацца... А бацькі з першага дня агаломшваюць: «Калі ён пачне размаўляць?»... Вось аб чым павінны яны падумаць, да чаго падрыхтавацца. Любая адаптацыя пройдзе лёгка, калі прыкладаць нейкія намаганні.

## Прасцей не значыць лепей

*— Няўжо ў сучасных бацькоў няма патрэбы ў навучанні... бацькоўству, яны не цікавяцца, як і што лепш для іх дзіцяці, не просяць дапамогі псіхолага?*

**Юлія ЕЎЛАШ:** — Па-рознаму. Галоўным чынам, звяртаюцца бацькі падлеткаў і тых, хто набліжаецца да гэтага складанага перыяду — пачынаючы гадоў з адзінаццаці. У гэты час у дзіцяці абуджаецца самастойнасць, жаданне выйсці з-пад татальнай апекі. А бацькам жа хочацца па-ранейшаму дыктаваць свае ўмовы, яны прыходзяць да псіхолага і кажуць: «Зрабіце з ім што-небудзь!»

Сёлета, праўда, мы абвясцілі спецыяльны праект па падрыхтоўцы да школы, і бацькі пайшлі досыць актыўна. Праблема ў тым, што сёння мы бачым велізарную колькасць шасці-, сямігодак, дый дзяцей старэйшага ўзросту, не матываваных на вучобу. Матывацыю павінны стварыць бацькі, але матывуюць яны не на працэс навучання, а толькі на высокія адзнакі. Наогул бацькі надта захапіліся рознымі «школамі развіцця», фарміруюць завышаную самаацэнку ў дзяцей, а звычайная школа — гэта зусім іншы падыход.

**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Дзяцей сапраўды шмат апякаюць і шмат ім дазваляюць. Дома ў іх няма ніякіх абавязкаў — нават цацкі не збіраюць самі...

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Самастойнасць і працавітасць трэба выпрацоўваць.

*— Можа быць, у нас вырасла колькасць дзяцей з захворваннямі, і таму бацькі імкнуцца не перагружаць, шкадаваць?*

**Аксана ПЯЦЭВІЧ:** — У нас сёння павялічваецца колькасць дзяцей з 2-й групай здароўя. Мы палепшылі дыягностыку і своечасовую карэкцыю, а таму аб'ектыўнага росту захварэльнасці няма.

**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Нашы дзеці з асаблівасцямі развіцця і ядуць, і апранаюцца — усё робяць самастойна. Проста ёсць матулі, якія спрабуюць нас пераконваць, што іх 3-гадовае дзіця без соскі не засне. Цікава, чаму ў садку без яе засынае? Проста маме не хочацца перанапружвацца, так прасцей.

**Юлія ЕЎЛАШ:** — Сёння многае бацькамі робіцца як прасцей, а пасля... У нас немалая колькасць дзяцей пакутуе ад энурэзу, а ўсё таму, што бацькі не адвучваюць дзіця ад памперсаў.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Мамы могуць аддаваць дзіця ў садок і спакойна пры гэтым сядзець дома. Яны хатнія гаспадыні, нічым не загружаныя, але не жадаюць нагрузіць сябе і ўласным дзіцем. Такія мамы і патрабаванні да работнікаў установы прад'яўляюць большыя...

## Пачынаем з кашы

*— За што сучасным бацькам можна паставіць «двойку»?*

**Юлія ЕЎЛАШ:** — За памылковую зацыкленасць на адзнаках. Прычым успрымаюцца гэтыя дрэнныя адзнакі як адзнакі ім самім. Адсюль і пастаянная муштра.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Некаторыя нават прыходзяць пад дзверы кабінета і прыслухоўваюцца, як там адказвае іх дзіця... А кантраляваць трэба не школу, а саміх сябе: які я выхавацель свайго дзіцяці? Школа дапамагае адаптацыі да соцыуму, яна адчыняе дзверы ў іншыя навучальныя ўстановы, у працоўную дзейнасць, навучае нормам паводзінаў у вялікім калектыве, перадае вопыт і веды. Але ўсё гэта павінны перадаваць і бацькі, дапаўняць працэс, а не змагацца са школай і перашкаджаць ёй выконваць сваю функцыю.

**Таццяна БЯЛТ:** — Калі бацькі не будуць удзельнікамі гэтага працэсу, то і матывацыі ў дзіцяці не будзе. Завышаныя патрабаванні трэба адкінуць, і ўважліва слухаць рэкамендацыі спецыялістаў — настаўнікаў, псіхолагаў.

*— Ці не атрымліваецца так, што сваімі няправільнымі паводзінамі бацькі і матывацыю забіваюць, і дзіцячае здароўе нежартоўна падрываюць?*

**Аксана ПЯЦЭВІЧ:** — Так і ёсць. У падлеткавым узросце з-за гэтага можа ўзнікнуць загадкавая вегетасасудзістая дыстанія... Перш за ўсё бацькі павінны слухаць дзяцей і рэагаваць на іх скаргі. Не прапусціце пагаршэнне іх самаадчування! На жаль, часам замест таго, каб распытаць дзіця, памераць тэмпературу, бацькі спакойна адпраўляюць у школу, маўляў, калі штосьці, пакажашся там доктару. Яшчэ адзін важны момант — дзеці нярэдка звяртаюцца ў школьны медкабінет з болем у жываце, а прычынай такога болю з'яўляецца, як правіла, адсутнасць сняданку. Між тым інтэрвалы паміж прыёмамі ежы павінны быць не больш за 3-4 гадзіны. Калі за гэтым не сачыць, то спачатку будуць функцыянальныя расстройствы, той жа боль, а пасля і хранічныя — эрозіі, гастрыт... Лепшы сняданак для дзіцяці — каша, тварожная запяканка або сырнікі, пажадана штосьці гарачае.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — І абавязковая пры гэтым трэба падключыць дзіця да харчавання ў школе, каб яно ўжывала першае, другое, трэцяе, а не трымалася на булачцы. Харчаванне ў дашкольных і школьных установах сёння наладжана на добрым узроўні.

**Аксана ПЯЦЭВІЧ:** — Праблема ў тым, што калі дзіця прывучана дома да фаст-фуду, то і ў школе яно будзе выбіраць звыклы для яго смак.

**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Можна не даваць дзецям грошы на рукі, а прапаноўваць здаровае харчаванне, і даволі хутка яны прывыкнуць да новага смаку. Калі адзін-два разы адмовяцца ад нечага, не трэба адмаўляцца ад спробы прапанаваць зноў. Аднойчы пачне есці і прывыкне.

## Тры любімыя заняткі

*— Здаецца, усе бацькі пастаянна толькі і пытаюцца «Што ты еў?», але здаравейшым ад гэтага харчаванне сям'і чамусьці не становіцца. Напэўна, праблема глыбей...*

**Юлія ЕЎЛАШ:** — Так, бацькоў хвалюе два пытанні: «Што ты еў?» і «Што атрымаў у школе?». Але гэта штосьці кшталту рытарычных пытанняў... Нават з той жа двойкай... Я пытаюся ў дзіцяці: чаму ты атрымаў двойку? Ён кажа: мне нецікава. Для мяне гэта нагода для разбору — чаму нецікава? А бацькам нецікава разбірацца, чаму іх дзіцяці нецікава штосьці рабіць. Самая распаўсюджаная праблема дарослых у тым, што яны шмат увагі ўдзяляюць знешняму боку, а ўнутраны — дзіцячыя перажыванні, жаданні, памкненні — застаецца «па-за кадрам». Безумоўна, для ўсіх бацькоў свае дзеці — самыя таленавітыя, але нацэльваюцца яны пры гэтым не на развіццё рэальных здольнасцяў, а на дасягненне нейкай міфічнай паспяховасці. Мамы бачаць дачок спявачкамі, таты сыноў — хакеістамі... А пачынаеш размаўляць з самімі дзецьмі, і аказваецца, што яны ненавідзяць тое, да чаго іх схіляюць бацькі! Аб чым тут гаварыць далей?

Звычайна да наступлення падлеткавага ўзросту бацькам удаецца націскаць, прымушаць, падпарадкоўваць. Аднак пасля 11-12 гадоў так рабіць усё цяжэй. Вось гэта і бывае нагодай для візіту да псіхолага.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Любая праблема дзіцяці родам абавязкова з сям'і. Калі нехта староннi сцвярджае, што сям'я такая ўладкаваная, а дзіця там расце няправільнае, не слухайце. Так не бывае.

**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Гэта праўда, праблеме не ў дзецях. Вось мы ў садку робім усё, каб падцягнуць і выцягнуць дзіця з асаблівасцямі, дапамагчы яго ўсебаковаму развіццю. Перад тым, як пайсці ў школу, бацькам трэба звярнуцца ў раённы цэнтр развіваючага навучання і рэабілітацыі, спецыялісты якога даюць рэкамендацыі адносна наведвання інтэгравнай школы. У такой школе навучанне будзе ажыццяўляцца з улікам рэальных магчымасцяў і здольнасцяў дзіцяці. Аднак бацькі не лічацца з яго інтарэсамі, а робяць выгляд, што ніякай праблемы не існуе, аддаюць малое ў звычайную школу, дзе, вядома, нікому не паведамляюць аб дыягназе. Першыя год-два настаўнік можа нічога асаблівага і не заўважыць. Аднак паступова дзіцяці будзе станавіцца ўсё цяжэй, і асаблівасці абавязкова праявяцца. Бо ў садку дзяцей значна менш, да кожнага — індывідуальны падыход, тут і дэфектолагі, і педагогі, і псіхолагі, якія пастаянна штосьці выпраўляюць, выбачайце за такое слова, дрэсіруюць. А бацькі не жадаюць разумець, наколькі гэта цяжкая праца, ім лягчэй займацца самападманам, а калі ў дзіцяці пачнуцца цяжкасці, і яно не вытрымае нагрузкі, то вінаватымі акажуцца ўсе — школа, медыкі, настаўнікі... Вось такое бывае непрыняцце ўласнага дзіцяці.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Бацькі могуць не прыслухоўвацца да рэкамендацый цэнтра рэабілітацыі, іх сапраўды ніхто не абавязвае паведамляць школе пра асаблівасці псіхафізічнага развіцця дзіцяці, але ж хіба яны самі не павінны думаць аб тым, што і як будзе лепш?

**Аксана ПЯЦЭВІЧ:** — Наогул неабходна штогод прадастаўляць медыцынскую даведку з паліклінікі, але там не пазначаюцца асаблівасці развіцця. Нейкі сур'ёзны дыягназ можа быць зашыфраваны, але гэта інфармацыя не будзе распаўсюджвацца.

**Юлія ЕЎЛАШ:** — Бацькі нярэдка «закрываюцца» ад школы: хаваюць дыягназы, праблемы... А гэта толькі шкодзіць.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Усім бацькам трэба нагадаць: цеснае супрацоўніцтва з той жа школай толькі дапамагае дзіцяці атрымліваць і веды, і своечасовую педагагічную і медыцынскую дапамогу.

**Я пытаюся ў дзіцяці: чаму ты атрымаў двойку? Ён кажа: мне нецікава. Для мяне гэта нагода для разбору — чаму нецікава? А бацькам нецікава разбірацца, чаму іх дзіцяці нецікава штосьці рабіць.**

**Таццяна БЯЛТ:** — Мы ў гімназіі абавязкова праводзім апытанні бацькоў дзяцей першакласнікаў — збіраем агульныя звесткі аб сям'і. Уся гэта інфармацыя нікому не раскрываецца, але яна вельмі важная якраз для лепшага ўзаемадзеяння ўсіх бакоў. Мы цікавімся, ці наведвала дзіця садок, як сябе паводзіла падчас развітання з мамай, якія любімыя заняткі ў дзіцяці? Бацькам не варта непакоіцца, што мы даведаемся пра штосьці і выкарыстаем гэта супраць дзіцяці. Наадварот! Якім чынам мы можам нашкодзіць, калі сваім пытаннем упершыню прымушаем мам і татаў задумацца над тым, чым іх дзіця больш за ўсё любіць займацца? Паверце, ёсць бацькі, якія не могуць назваць тры любімыя заняткі сваіх дзяцей.

## Са старэйшымі няпроста

*— Да чаго трэба падрыхтавацца бацькам школьнікаў старэйшага ўзросту?*

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Сапраўды, у малодшай школе працэс вельмі добра адладжаны, можна нават сказаць, што тут крыху прасцей. Калі ж дзіця сёлета ідзе ў пяты клас, то гэта ўжо іншая рэч. Больш прадметаў, больш настаўнікаў, а значыць, новых стасункаў. Праграма значна складанейшая, чым у пачатковай школе. Патрабуецца новая адаптацыя. А тут яшчэ і пераходны ўзрост, іншы ўзровень самастойнасці. Словам, дарослым трэба быць вельмі пільнымі, асцярожнымі, а не думаць, што самы складаны час мінаваў — есці і апранацца навучылі...

**Аксана ПЯЦЭВІЧ:** — Змяненне гарманальнага статусу — само па сабе цяжкае выпрабаванне. Нездарма менавіта ў гэтым узросце пры перагрузках развіваецца і вегетасасудзістая дыстанія — нервовая сістэма няўстойлівая. Таму знаходжанне за камп'ютарам трэба дазіраваць, прадухіляць зрокавыя нагрузкі, пазбягаць гіпадынаміі, стымуляваць фізічную актыўнасць.

Дзеці абавязкова павінны ведаць, што пры любым раскладзе атрымаюць дапамогу, што яны могуць разлічваць на бацькоў. Што да медыцынскай дапамогі, то сёння ва ўсіх агульнаадукацыйных школах ёсць медработ-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

нік. Усё неабходнае, у тым ліку медыкаментозныя сродкі, ёсць на месцы, аднак калі па рэкамендацыі ўрача дзіця павінна прымаць нейкі прэпарат, значыць, неабходна прадаставіць даведку. Важна, каб бацькі былі на сувязі, каб мы маглі хутка паведаміць аб любых зменах са здароўем.

**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Бацькам наогул трэба быць «на сувязі» са школай. Дапусцім, псіхолаг, педыятр западозрылі, што дзіця ўжывае наркотыкі... Яны абавязаны паведаміць аб сваім падазрэнні бацькам, не ўцягваючы пакуль у размову само дзіця. Своечасовы зварот да спецыяліста, таго ж неўролага, можа выратаваць дзіця ад цяжкай наркатычнай залежнасці.

**Юлія ЕЎЛАШ:** — Бацькі звычайна не абмяркоўваюць такія праблемы са школай, а адразу звяртаюцца ў псіханеўралагічны дыспансер. Калі падчас кансультацый у нашым цэнтры мы выяўляем такую сітуацыю, то прапануем варыянты звароту да тых ці іншых спецыялістаў, а далей бацькі самі вырашаюць, каму даверыцца.

## Не трэба палохаць!

***— Дайце, калі ласка, кароткія парады сем'ям па тым, як сустрэць 1 верасня...***

**Ілона ЕЎЦІХЕВІЧ:** — Гэта свята, і гэта галоўнае! Дазвольце дзіцяці самому выбраць і сшыткі, і партфель. Калі гэта першакласнік, паўтарайце яму: мы табе дапаможам, ты будзеш шмат ведаць!.. Толькі пазітыў. Школай нельга палохаць. Дарэчы, не сакрэт, што калі ў сям'і ёсць старэйшыя дзеці, то малодшыя абсалютна не жадаюць ісці ў школу. Таму што яны наглядзеліся, як старэйшых муштравалі. Малыя тады кажуць, што ім і без школы добра. «Я атрымаю двойку, бацькі будуць сварыцца...», — вось так разважаюць.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — У мяне была сітуацыя, калі тата занепакоіўся малодшым сынам. А там — двое дарослых дзяцей, усе занятыя сваёй дарослай вучобай ды работай. Увечары яны ўсе збіраюцца і... пачынаюць выхоўваць адзінае малое. Давялі дзіця да таго, што яно цалкам цікавасць да вучобы страціла. Трэба не ціснуць, а зацікаўліваць, і абавязкова прадаставіць дзіцяці асабістую прастору.

**Юлія ЕЎЛАШ:** — Прычым і ў прамым сэнсе таксама. Нават калі ў вас адзін пакой на дваіх дзяцей, пастаўце ў адным куце адзін стол, у другім — другі. І дазваляйце ім час ад часу пабыць у поўнай адзіноце...

**Таццяна БЯЛТ:** — Скажыце дзіцяці, што баяцца школы не трэба. Яго там чакаюць, хвалююцца. Усе ўстановы ўжо гатовыя да гэтай святочнай сустрэчы. І самі бацькі павінны прадэманстраваць добры настрой! Мне здаецца, верасня ўсе чакаюць, многія нават ужо і засумавалі без школы.

**Аксана ПЯЦЭВІЧ:** — Калі дзіця ідзе першы раз у першы клас, значыць, трэба паклапаціцца аб тым, каб яго здароўе адпавядала новым нагрузкам. Для гэтага і трэба прайсці агляд у педыятра і іншых спецыялістаў-медыкаў. Не трэба выступаць супраць медыцынскіх даведак. Яны збіраюцца для таго, каб вызначыцца з нагрузкай на фізкультуры, з тым, за якую парту пасадзіць, якім чынам харчавацца.

У школах сёння для захавання здароўя праводзяцца гімнастыка, дынамічныя перапынкі, укараняюцца тэхналогіі аховы здароўя па прафілактыцы захворванняў апорна-рухальнага апарату, органаў зроку. Ствараюцца зоны для зрокавай гімнастыкі. На ўроках фізкультуры ў некалькіх школах прыярытэт аддаецца карэгіруючай гімнастыцы для дыспансернай групы дзяцей з парушэннем паставы (хоць і дома трэба сачыць за правільным становішчам за сталом). Штомесяц за ўрокамі фізкультуры праводзіцца педагагічны маніторынг, ацэньваецца адэкватнасць фізічнай нагрузкі. У любым выпадку, школьныя фізічныя нагрузкі — гэта не ўся фізічная нагрузка, якая патрэбна дзіцяці. Павінны быць і веласіпед, і плаванне, і рухавыя гульні, прагулкі. Пасля ўрокаў кожны дзень абавязкова спачатку трэба пагуляць на свежым паветры: 3,5 гадзіны — дзецям пачатковай школы, каля 2-х гадзін — сярэдняй і як мінімум 1,5 гадзіны — старшакласнікам.

**Таццяна ХАРУЖАЯ:** — Майце на ўвазе, што зусім не абавязкова перад пачатковай школай навучаць дзіця і пісьму, і чытанню — не выключана, што дзіця наогул хутка страціць цікаўнасць. Прагрэс у гэтым выпадку адбываецца скачкамі, і калі адбудзецца чарговы скачок, невядома. Таму ніколі не навешвайце на дзіця ярлык: сёння дзесьці адстаў, затое заўтра можа абагнаць!

**Юлія ЕЎЛАШ:** — Скажыце дзіцяці, што калі яно пойдзе ў школу, то будзе вучыцца, а калі будзе вучыцца, то гэта дапаможа яму здзейсніць сваю мару. А калі ў вас ёсць нейкія пытанні, то звяртайцеся па дапамогу да спецыялістаў нашага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. Сёлета ў нас з'явілася магчымасць прадаставіць паслугі трох псіхолагаў, якія будуць займацца сем'ямі, дзе выхоўваюцца малодшыя школьнікі і дашкольнікі. Псіхалагічная дапамога аказваецца бясплатна.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Класныя навіны

# МАТЭМАТЫКА ЛЕПШ ДАЕЦЦА ХЛОПЧЫКАМ...

### ...затое яны адстаюць ад дзяўчат у разуменні тэкстаў

**У 2018 годзе Беларусь мае намер прыняць удзел у міжнародным даследаванні PISA, якое дасць нам магчымасць убачыць сябе на фоне дасягненняў сістэм адукацыі іншых краін. Гэта адно з самых аўтарытэтных даследаванняў якасці адукацыі ў свеце. Ідэя яго правядзення ўзнікла ў сярэдзіне 1990-х гадоў: менавіта тады эксперты ў галіне адукацыі прапанавалі распрацаваць універсальныя тэсты для 15-гадовых падлеткаў, якія б дазволілі правяраць не столькі акадэмічныя дасягненні навучэнцаў (механічнае завучванне фактаў, законаў, формул, гістарычных падзей і г.д.), колькі іх уменне працаваць з інфармацыяй і рэальныя жыццёвыя кампетэнцыі. 15-гадовым падлеткам прапануюцца не тыповыя задачы па фізіцы, хіміі ці матэматыцы, а блізкія да рэчаіснасці праблемныя сітуацыі, звязаныя з рознымі аспектамі нашага жыцця.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На думку экспертаў даследавання, атрыманне ў школе канкрэтных ведаў, безумоўна, вельмі важнае, але выкарыстанне гэтых ведаў у дарослым жыцці залежыць ад набытых у школьныя гады навыкаў. У жыцці канкрэтныя веды, скажам, такія як назвы раслін і жывёлін, маюць меншую каштоўнасць, чым разуменне глабальных праблем, звязаных са спажываннем энергіі, біялагічнай варыятыўнасцю і чалавечым здароўем. Не менш важныя для школьнікаў такія навыкі, як уменне ўстанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, уменне адаптавацца, выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі... Даследаванне па праверцы матэматычнай, прыродазнаўчанавуковай і чытацкай адукаванасці праводзіцца кожныя тры гады, і толькі праз год увазе сусветнай грамадскасці прадстаўляюцца першыя вынікі.

## ЭКАНАМІЧНЫ ЭФЕКТ АД РЭФОРМ

Ніводная з 64 краін, якія ўдзельнічалі ў Міжнароднай праграме па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў у 2012 годзе, не змагла заявіць аб дасягненні кожным школьнікам базавага ўзроўню паспяховасці адначасова ў трох асноўных кірунках пісьменнасці — чытацкай, матэматычнай і прыродазнаўчай.

Прыблізна адзін з чатырох навучэнцаў (каля 28%) знаходзіцца ніжэй за базавы ўзровень, прынамсі ў адным з гэтых кірункаў. Самы вялікі працэнт вучняў са слабай паспяховасцю — у матэматыцы (23%). Паказчыкі чытацкай і прыродазнаўчай адукаванасці знаходзяцца на ўзроўні 18%. Нізкая паспяховасць адразу ў трох кірунках адзначана прыкладна ў 12% школьнікаў.

Праўда, у розных краінах сітуацыя істотна адрозніваецца. Так, у пятнаццаці рэгіёнах, якія ўдзельнічалі ў PISA-2012, прынамсі адзін з двух навучэнцаў адстае па матэматыцы, у той час як **у Ганконгу, Карэі, Шанхаі і Сінгапуры паказчыкі іншыя — там па матэматыцы адстае менш чым адзін навучэнец з дзесяці.**

У Бразіліі, Мексіцы, Тунісе, Турцыі, Германіі, Італіі, Польшчы, Партугаліі, Расіі скарацілася колькасць вучняў са слабай паспяховасцю па матэматыцы (параўноўваліся вынікі PISA за 2003 і 2012 год). У Ізраілі, Карэі, Польшчы, Катары, Румыніі, Тайландзе, Турцыі ў 2012 годзе (у параўнанні з 2006 годам) палепшыліся вынікі ў прыродазнаўчым кірунку.

У краінах, дзе значная доля насельніцтва адчувае недахоп у асноўных уменнях і навыках, прагнозы доўгачасовага эканамічнага росту ставяцца пад пагрозу. Згодна з праведзеным на аснове PISA даследаваннем, пры ўмове ўкаранення рэформаў, скіраваных на зніжэнне колькасці вучняў са слабай паспяховасцю, атрыманы ў доўгатэрміновай перспектыве эканамічны прыбытак для краін пакрывае большасць (калі не ўсе) выдаткі на сістэму адукацыі.

## СТЫМУЛЯВАЦЬ НА ПОСПЕХ

Партрэт непаспяховага вучня выглядае наступным чынам: гэта дзіця з праблемнай у сацыяльна-эканамічным плане сям'і, якое размаўляе на розных мовах дома і ў школе, пражывае ў сельскай мясцовасці, не наведвала дашкольную ўстанову адукацыі, паўторна вывучала вучэбную праграму і праходзіць прафесійнае навучанне (каля 83%).

**Каб канстатаваць, што дасягненні або праблемы і сапраўды маюць месца, вельмі карысна ўбачыць сябе на фоне дасягненняў і праблем сістэм адукацыі іншых краін.**

Як паказана ў справаздачы, **пол падлетка з'яўляецца ўнікальным фактарам рызыкі, здольным паўплываць на паспяховасць**. Так, адзначаецца, што хлопчыкі больш адстаюць у чытанні і прыродазнаўстве, а дзяўчаты — у матэматыцы.

Эксперты PISA ўпэўнены, што сістэма адукацыі можа спрыяць высокай матывацыі да навучання, калі яна забяспечвае стаўленне да ўсіх вучняў як да патэнцыяльна паспяховых. Толькі калі сістэма адукацыі культывуе, стымулюе і падтрымлівае веру ў тое, што ўсе вучні могуць дасягнуць больш высокіх поспехаў, тыя адчуваюць жаданне дзейнічаць і дасягаюць лепшых вынікаў. Зніжэнне колькасці вучняў са слабай паспяховасцю — дзейсны спосаб павышэння эфектыўнасці ўсёй адукацыйнай сістэмы.

## НА ЯКІМ МЫ СВЕЦЕ?

На працягу ўсіх цыклаў даследаванняў PISA лідарамі выступаюць краіны Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі: Сінгапур, Тайвань, Карэя, Японія і іншыя. Амаль усе яны вызначаюцца хуткімі тэмпамі развіцця эканомікі. Абсалютным жа лідарам, паводле вынікаў даследаванняў, з'яўляецца Кітай (Шанхай, Ганконг і Макаа). Прычым кітайскія падлеткі дэманструюць аднолькава высокія вынікі і ў матэматычнай, і ў чытацкай, і ў прыродазнаўчай адукаванасці. Сярод краін Еўропы стабільна высокія паказчыкі на працягу ўсяго перыяду даследаванняў дэманструе Фінляндыя. З еўрапейскіх краін самы вялікі рывок па ўсіх кірунках зрабілі Польшча і Германія. Праўда, апошняя хоць і палепшыла свае паказчыкі, але ўсё ж значна адстае і ад Фінляндыі, і ад Польшчы.

Беларусь пакуль не ўдзельнічае ні ў якіх міжнародных маніторынгавых даследаваннях, усе разважанні пра «якасць» выпускнікоў, якая быццам бы пагаршаецца, можна спісаць на суб'ектыўнасць такіх ацэнак. Напэўна, для таго, каб канстатаваць, што дасягненні або праблемы і сапраўды маюць месца, вельмі карысна ўбачыць сябе на фоне дасягненняў і праблем сістэм адукацыі іншых краін.

Міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў, выступаючы ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1», заявіў: «Сярэдняй школе па ўзроўні ведаў, па падрыхтоўцы настаўнікаў, па аснашчэнні я паставіў бы моцную «сямёрку» і выказаў надзею, што «праз некалькі гадоў тут будзе стаяць ужо моцная «дзявятка».

Дарэчы, заданні з кампетэнтнасным падыходам ужо прапануюцца беларускім школьнікам падчас правядзення рэспубліканскага маніторынгу якасці адукацыі, каб падрыхтаваць іх да будучых выпрабаванняў. Кампетэнтнасны падыход укараняецца і ў вучэбныя планы. У папярэднім навучальным годзе на новы змест адукацыі перайшлі першыя і пятыя класы, у наступным годзе гэта будуць ужо другія і шостыя класы і гэтак далей...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**Працэнт вучняў са слабай паспяховасцю па трох кірунках (PISA—2012)**



# ПОСПЕХ, ПРАВАЛ ЦІ СВАЁ МЕСЦА?

## Падводзім вынікі Алімпіяды ў Бразіліі

**Гульні ў Рыа яшчэ да свайго пачатку абяцалі стаць самымі скандальнымі. Усё пачалося са скарачэння бюджэту і недабудаваных спартыўных аб'ектаў і прадоўжылася жахлівымі вірусамі, якія нібыта пагражалі жыццю спартсменаў і гасцей Бразіліі. Па прыездзе атлетаў у алімпійскую вёску ў СМІ раз-пораз з'яўляліся каментарыі спартсменаў, якія былі незадаволеныя то ўмовамі пражывання, то харчаваннем. Не сказаць, што падобных праблем не ўзнікала на мінулых Гульнях. У Лондане, напрыклад, некаторыя дэлегацыі таксама скардзіліся на алімпійскі рацыён. Але ў Бразіліі такіх казусаў было ўжо занадта шмат.**



Да ўсяго гэтага дадаваліся допінгавыя скандалы і злачыннасць, ахвярамі якой станавіліся і заўзятары, і спартсмены, і журналісты. Былі, вядома, і бліскучыя перамогі атлетаў, якія ўлюблялі ў сябе ўсё больш заўзятараў, дзіўныя ўчынкі некаторых удзельнікаў і неверагодна крыўдныя паражэнні. Напэўна, гэта ўсё тое галоўнае, чым запомнілася Алімпіяда-2016, якая стала ўжо гісторыяй.

Нас, вядома, больш хвалюе ўласная зборная, вынік якой ужо ўпісаны ў алімпійскі рух Беларусі. Дасягненні нашых атлетаў перакрывалі ўсе дрэнныя навіны, а кожны медаль, нават не залаты, успрымаўся як вялікая перамога.

Мы ехалі ў Бразілію ва ўсечаным складзе, прычыны ўсім вядомыя. У выніку 124 спартсмены — антырэкорд па колькасці прадстаўнікоў Беларусі на Алімпійскіх гульнях. Кіраўніцтва спартыўнай галіны і прэзідэнт краіны ўпершыню за доўгія гады публічна не агучвалі медальны план на Рыа, не было нават намёкаў. А вось замежныя выданні ў сваіх прагнозах да старту Гульняў упэўнена аддавалі Беларусі 7 медалёў. Пасля адхілення мужчынскай зборнай па веславанні некаторыя прадракалі нам наогул 5 алімпійскіх узнагарод.

У выніку і тыя, і другія памыліліся: у скарбонцы зборнай дзевяць медалёў (1 залаты, 4 сярэбраныя і 4 бронзавыя). Гэта найменшая колькасць узнагарод з 1996 года, калі Беларусь упершыню была прадстаўлена незалежнай камандай на летніх Гульнях.

*— Яшчэ перад пачаткам Алімпіяды і НАК, і Мінспорту заяўлялі, што будуць вельмі складаныя старты і неабходна выступіць так, каб беларускі народ ганарыўся сваімі спартсменамі,* — сказаў **Максім РЫЖАНКОЎ, першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта,** падводзячы вынікі выступлення беларускіх атлетаў у Рыа. — *На мой погляд, зыходзячы з умоў, у якіх аказаліся многія беларускія спартсмены не па сваёй віне перад стартам летняй Алімпіяды ў Бразіліі, наша каманда выступіла годна. Хоць дзесьці і недапрацавалі.*

Ацэньваючы выступленне як дастойнае, Максім Уладзіміравіч адзначыў не толькі пераможцу і прызёраў Гульняў, але і тых атлетаў, якія ўшчыльную наблізіліся да ўзнагарод, а іх вынікі цалкам можна лічыць медальнымі.

*— У першую чаргу гэта Уладзімір Самсонаў. Беларус адзіны з еўрапейцаў аказаўся ў паўфінале. І гэта ў 40-гадовым узросце, з сур'ёзнай траўмай рэбраў. Самсонаў выдатны спартсмен. Парадавала і Вольга Мазуронак, якая змагла навязаць барацьбу афрыканкам у марафоне. Хацелася б падзякаваць і Арзамасавай. Ёй складана было змагацца з трыма атлетамі незразумелай гендарнай прыналежнасці. Не стану аспрэчваць рашэнне Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі, праводзіць тэсты, але бачыць, як фактычна мужчына апярэджвае дзяўчат і атрымлівае медаль...*

Першы віцэ-прэзідэнт НАК адзначыў, што да алімпійскага сходу, які хутка адбудзецца ў краіне, Прэзідэнту будуць падрыхтаваны прапановы па тым, што неабходна змяніць, каб у будучыні заваёўваць большую колькасць алімпійскіх узнагарод. Таксама, падводзячы вынікі, Максім Рыжанкоў адразу акрэсліў галоўны круг праблем сучаснага беларускага спорту.

*— Самыя сур'ёзныя праблемы — трэнерскія кадры і медыцына. Нашы трэнеры прывыклі працаваць па-старому, а гэтая сістэма ўжо не спрацоўвае. Не могуць і асцерагаюцца зазірнуць у новыя метадычныя распрацоўкі, вывучыць іх. Імкнуцца знайсці лёгкія шляхі для дасягнення выніку, адсюль і пытанні з допінгам. Цяпер складана крытыкаваць нашых спартыўных лекараў. Чатыры гады таму ў Мінспорту знеслі хай і невялікі, але ўсё ж такі цэнтр спартыўнай медыцыны, а цяпер дактары туляцца ў памяшканнях па ўсім горадзе. Ідзе прыём у звычайнай гарадской паліклініцы. Выдатна разумею, калі Беларусь хоча называцца сур'ёзнай спартыўнай краінай, пытанне трэба вырашаць. Гэта толькі маленькі бытавы прыклад.*

Падобнай пазіцыі прытрымліваецца і **міністр спорту краіны Аляксандр ШАМКО.** Ацэньваючы вынікі беларускай зборнай, ён адзначыў, што правальным наша выступленне назваць не ў якім выпадку нельга. І падкрэсліў, што ў параўнанні з мінулай Алімпіядай краіна была прадстаўлена значна «амалоджанным» складам, што дала вынік не толькі цяпер, але і прынясе свой плён у будучыні.

*— Чатырма маладымі дэбютантамі Алімпіяды заваявана амаль палова (44,4%) медалёў. Для маладых спартсменаў гэта бясцэнны вопыт, у тым ліку ў псіхалагічным плане, і праца на перспектыву, з прыцэлам на Гульні 2020 года ў Токіа. Вынікі Алімпіяды 2016 года ў цэлым могуць сведчыць аб дастатковай канкурэнтаздольнасці сучаснай беларускай сістэмы падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву, у адрозненне ад мінулых Гульняў, дзе вынікі былі дасягнуты ў асноўным атлетамі, якія ўжо мелі вопыт удзелу ў адных або некалькіх Алімпіядах,* — сказаў Аляксандр Ігаравіч.

Канчатковыя вынікі Алімпіяды-2016 будуць падведзены на Алімпійскім сходзе пасля дэталёвага аналізу выступлення кожнага спартсмена, там жа і вызначацца канкрэтныя задачы на наступны алімпійскі цыкл.

■ Пра што кажуць алімпійцы

# А ЦЯПЕР — ХАТНЯЕ ЗАДАННЕ

## З Бразіліі ўжо вярнуліся ўсе нашы спартсмены

**Удзельнікі галоўных стартаў адразу ж па прылёце траплялі ў рукі шматлікіх журналістаў. Мы сабралі самыя цікавыя думкі і ўражанні беларусаў ад Гульняў у Рыа.**



**Уладзіслаў ГАНЧАРОЎ, алімпійскі чэмпіён па скачках на батуце:**

— Пасля Алімпіяды адчуваю велізарную стомленасць. Калі казаць пра арганізацыю Гульняў у Бразіліі, то яна была слабая. Для мяне гэта першы ўдзел у такім турніры, таму, можа, я не так адчуў гэта, як вопытныя спартсмены, якія неаднаразова адзначалі, што сёлетняя Алімпіяда саступала папярэдняй.

Пасля залатой узнагароды матывацыя ў мяне не знікла, заўсёды ёсць да чаго імкнуцца. Выйграў адзін медаль, трэба старацца заваяваць другі.



**Аляксандра ГЕРАСІМЕНЯ, бронзавая прызёрка Алімпіяды-2016 (плаванне):**

— Мы прыехалі і зразумелі, што людзям, якія жывуць у Бразіліі, не патрэбна Алімпіяда. Ім яна проста ў цяжар. Вядома, былі і добрыя моманты. Бразільцы вельмі яркія, вясёлыя, увесь час фатаграфаваліся. Але ўсё роўна я засталася ў шоку ад Бразіліі. Калі праязджалі фавэлы, бачылі разбураныя дамы, жудасна.

Алімпійская вёска была не гатовая прыняць такую колькасць людзей, кармілі нас дрэнна. Перасушаны рыс, чорная макарона, мяса, якое не жуецца. Чулі, як на вуліцы да людзей падыходзілі з пісталетамі. Адчуваеш, што, калі раптам нешта здарыцца, табе ніхто не дапаможа. Гэта ўсё сапсавала настрой і не дазваляла адчуць атмасферу свята. Я ўсё ж такі лічу, калі Алімпіяда праходзіць у такіх сітуацыях, то, напэўна, яе праводзіць не варта.

Што тычыцца мяне асабіста, то пасля Гульняў буду старацца больш часу ўдзяляць сям'і і асабістаму жыццю. Тым не менш пакуль са спортам заканчваць не збіраюся. Ёсць жаданне пабіць не толькі асабістыя рэкорды.



**Марына ЛІТВІНЧУК, бронзавая прызёрка Алімпіяды ў Рыа ў байдарцы-чацвёрцы:**

— Не перадаць, што гэтыя медалі для нас значаць. Нам трэба было падняцца на п'едэстал для адчування ўласнай моцы. Каб даказаць: нашу каманду не зламаць ніякімі «паддывановымі» гульнямі. А зараз мы ўжо строім планы на наступны чэмпіянат свету і нават далей.



**Марыя МАМАШУК, сярэбраная прызёрка Алімпіяды-2016 (вольная барацьба):**

— «Золата» — гэта самае лепшае, што можа зрабіць спартсмен для сваёй краіны. Вядома, сярэбраны медаль — гэта таксама добры вынік, але станавіцца другім заўсёды горка. Я прашу прабачэння за такі фінал у маім выкананні (0:6). Камусьці, магчыма, ён здаўся бязвольным з майго боку. Гэта не так. Я хацела выйграць вырашальную сутычку і цяпер сябе моцна дакараю за такое паражэнне. Буду працягваць далей працаваць над сабой, бо гэта дастаўляе мне задавальненне. Для пачатку хачу адпачыць трошкі, сустрэцца з сябрамі, з якімі з-за збораў і спаборніцтваў бачуся не так часта, як хацелася б.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод» (Продавец):**

| | |
|---|---|
| Лот № 1 | 1. Здание гальванического корпуса с инв. № 500/С-29527. 2. Здание склада центрального с раскройным участком (М2/бл) с инв. № 500/С-24013. Местонахождение (адрес): г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 100. Земельный участок площадью 1,6161 га с кадастровым номером 500000000008003305, на праве постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. **Начальная цена с НДС** – 1 680 000,00 (16 800 000 000)* **бел. руб.** **Задаток** – 168 000,00 (1 680 000 000)* бел. руб. *Цена указана в денежных знаках образца 2000 г. |

Обременения: 1. Части капитального строения с инв. № 500/С-29527 сдаются в аренду. 2. В соответствии с Генеральным планом развития г. Минска предусмотрен вынос производства ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод» за пределы г. Минска.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты, приобретенного на аукционе Объекта: - 50% предоплата в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи; - 50% – в течение 3 (трех) банковских дней с момента фактического освобождения Продавцом занимаемых площадей Объекта.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1,0% (один процент) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Подписание акта приема-передачи Объекта осуществляется не позднее 6 (шести) месяцев после заключения договора купли-продажи и внесения полной стоимости цены Объекта.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод»:* **проводимом 28 сентября 2016 г.**

Аукцион состоится **28.09.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 26.09.2016 до 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.
Первое полное извещения о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2016. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **www.ino.by.**

**☎ Организатор аукциона: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**Ликвидатор объявляет о продаже следующего имущества ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД»** (УНП 600025392):

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Грузовой полуприцеп-цистерна ПП 9370, 1984 года | 1900,00 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно четвертый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 01.06.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 62%.

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Горизонтальная стальная емкость – 12 $м^3$ | 1454,76 |
| 2 | Резервуар горизонтальный – 10 $м^3$ | 501,12 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №2, проводятся повторно первый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 01.06.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10%.

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ВАЗ-21074 | 81,60 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №3, проводятся повторно шестой раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 01.06.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 80%.

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Прицеп-цистерна пищевая 2,4 т | 836,40 |
| 2 | Прицеп-цистерна пищевая 0,9 т | 564,60 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно третий раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 01.06.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 50%.
Торги в виде аукциона состоятся 06 сентября 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10 (по месту нахождения организатора торгов). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения.
Шаг аукциона – 5 процентов. Продавец – ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД» (тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 395-30-88). Организатор торгов – ООО «Партнер-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 395-30-88).
Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов (без НДС) на р/с №3012610007128 в филиале №612 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 810, УНП 600025392, получатель – ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД», назначение платежа: задаток за предмет торгов.
При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.
К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 10 дней с даты подписания договора купли-продажи.

■ Рэпарцёр атрымаў заданне...

# ПРАДАЦЬ АНТЫКВАРЫЯТ

## Колькі сёння каштуюць рэчы з гісторыяй?

**Глядзелі перадачу па канале Discovery, дзе два мужчыны скупляюць закінутыя склады і шукаюць, што цікавага там забылі папярэднія ўладальнікі? Раз на раз не прыходзіцца, але часта ім удаецца адкапаць сярод старых і непрыдатных да карыстання рэчаў сапраўдны антыкварыят. Магчыма, гэтыя каштоўныя знаходкі ўсяго толькі ўмелая тэлепастаноўка, але хочацца верыць, што ў жыцці такое таксама бывае. Ці шмат сёння даюць за старадаўнія рэчы? Мы вырашылі даведацца, колькі ў нашых антыкварных крамах гатовы заплаціць за рарытэты, і паспрабаваць што-небудзь прадаць.**

### Старая капейка па цане дзесяці новых

Мэблевага гарнітура XVIII стагоддзя, які б можна было выгадна прадаць, у мяне, на жаль, не аказалася. З бабулінага сервіза, здаецца, таксама нічога антыкварнага няма — набор чарак з графінам у выглядзе рыбак ёсць, бадай, ці не ў кожнай сям'і. Але пару цікавых рэчаў з дапамогай знаёмых усё ж такі сабралі.

Лот першы — царская манета. Капейку 1903 года пазычыла для эксперымента калега. Знайшла яе неяк, перакопваючы агарод. «Калі што, 30 працэнтаў ад продажу мае», — адразу папярэдзіла мяне калега. Ведала б яна, пра якую суму пойдзе размова...

Пазелянелую медную капейку прапанавала некаторым калекцыянерам у інтэрнэце. «Куплю царскія манеты. Дорага», — абяцалася ў аб'явах. Аб'яў шмат, значыць, попыт павінен быць, наіўна вырашыла я і ўжо чакала, калі мне за рарытэт часоў Мікалая II прапануюць кругленькую суму.

Большасць напісала, што ў такім стане іх манета не цікавіць, гатовы прыняць толькі тыя, якія добра захаваліся (дарэчы, з гэтай жа прычыны яе адмовіліся ўзяць у антыкварнай краме). Але адзін чалавек пагадзіўся набыць. За круглую суму — 10 капеек.

Аказалася, што, нягледзячы на свой узрост, гэтая манетка не такая каштоўная. 1 капейка 1903 года была выпушчана тыражом 74 мільёны экзэмпляраў. Для параўнання, капейка 1905-га мела тыраж у 23 мільёны. Таму такіх манетак да нашых часоў дайшло вельмі шмат (на беларускіх аўкцыёнах гэтыя лоты не надта запатрабаваныя), і нават у выдатным стане іх кошт складае 15—45 рублёў. А ў добрым, да якога наша капейка таксама не дацягвае, — усяго рубель-два.



Нашы рарытэты, на жаль, аказаліся не такімі каштоўнымі, як хацелася б.

**ГЭТА ВАЖНА**

**Згодна з указам №485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў» забараняецца прадаваць знойдзеныя ў зямлі рэчы, узрост якіх больш за 120 гадоў і якія маюць культурнае, мастацкае ці гістарычнае значэнне.**

**Адпраўляць пасылкі са старадаўнімі капейкамі замежным калекцыянерам таксама нельга. Манеты, вырабленыя больш за 100 гадоў таму, незалежна ад колькасці і вартасці, лічацца культурнымі каштоўнасцямі, і высылаць іх за межы Еўразійскага эканамічнага саюза незаконна.**

### Булённыя кубікі і мінчане

Лот другі — старая нямецкая паштоўка. Прыяцелька нядаўна атрымала яе ў падарунак. Казала, што нават паказвала яе камусьці з антыквараў і той запэўніў, што рэч каштоўная.

Пагугліла. Картка гэтая — адна з тых, што выпускаў нямецкі хімік Юстус Лібіг у канцы XIX стагоддзя, каб разрэкламаваць свой мясны экстракт (прататып сучасных булённых кубікаў). Тэкст на адваротным баку паштоўкі ва ўсю нахвальвае прадукт (пішуць, што ён быў вельмі высока ацэнены на першай Сусветнай выставе 1867 года) і абяцае, што ён выратуе нават самы вадкі суп і незаменны ў любым пірагу («асцерагайцеся падробак!»). На саміх картках гэтай серыі друкаваліся каляровыя малюнкі, прысвечаныя архітэктуры, жывёлам, прыродным з'явам, гісторыі. У інтэрнэце адзначаюць: усе паштоўкі выкананы ў адзіным экзэмпляры. На маёй — выява сялян у традыцыйных строях. Подпіс «Рускія нацыянальныя касцюмы», а ў іншым кутку пазначана — «Мінск».

Здаць картку ў антыкварную краму не ўдалося. Такую катэгорыю рэчаў не прымаюць. «Калі б вы прынеслі карціну, узялі б на рэалізацыю, а так — прабачце», — развяла рукамі кансультант у адным з салонаў.

У выніку змагла знайсці нейкага скупшчыка ў сецыве. Той зацікавіўся, але напісаў, што на сур'ёзныя грошы магу не разлічваць. «Напэўна, я вас расчарую, але кошт падобных картак невялікі — 2-3 долары. Толькі таму, што ёсць надпіс «Мінск», гатовы заплаціць пяць долараў», — адказаў мне патэнцыйны пакупнік. Расчараванне — не тое слова. Мо калекцыянер проста паскупіўся?

### Падробкі не пройдуць

Спіс рэчаў, якія можна прадаць праз антыкварную краму, насамрэч вялікі. Салоны прымаюць мэблю, посуд, статуэткі, абразы, гадзіннікі і шмат чаго яшчэ. Галоўныя крытэрыі — узрост (мінімум 50 гадоў) і ўнікальнасць.


Часцей за ўсё ў антыкварныя крамы здаюць савецкі фарфор.

Ацэншчык аглядае ваш рарытэт і рэкамендуе цану. Грошы зможаце атрымаць толькі пасля продажу. Камісія крамы — 10—30 працэнтаў. За захоўванне ў многіх салонах плаціць не патрабуюць. Калі прадмет стаіць месяц-два і ім ніхто не цікавіцца, уладальніку прапануюць забраць свой антыкварыят. Праўда, такое бывае не часта: крамы проста не бяруць на рэалізацыю рарытэты, у якіх не ўпэўнены.

Таваравед «Крамы старажытнасцяў» Ірына Шэлег кажа, што часцей за ўсё прыносяць савецкі фарфор. У цане — посуд і фігуркі розных заводаў: Пецярбургскага, Мінскага, Дулёўскага, Палонскага, мануфактуры ў Вярбілках. За невялікія статуэткі можна атрымаць на рукі каля 200 рублёў. Вырабы, прывезеныя з ГДР, ацэньваюцца крыху даражэй.

Нярэдка хочуць прадаць абразы, якія засталіся ад бабак і дзядоў. За адзін драўляны абраз пачатку XX стагоддзя (вышынёй каля 30 сантыметраў) у сярэднім даюць 900 рублёў.

Ці спрабуюць збыць у антыкварныя крамы падробкі? Кансультант іншага салона на вуліцы Багдановіча прызнаецца: бываюць выпадкі. Але гэта часцей па няведанні.

— Напрыклад, былі людзі за мяжой у адпачынку, набылі там сучасны фарфор за капейкі. А вярнуўшыся, вырашылі паспрабаваць прадаць яго, каб падзарабіць. Але нашых ацэншчыкаў не падманеш, — запэўнівае дзяўчына-кансультант.

### Галава Леніна і сярэбраная сальніца

Што можа дазволіць сабе купіць у антыкварнай краме беларус з сярэднестатыстычным заробкам у 745 рублёў? Самыя танныя рэчы — старая біжутэрыя і дробныя савецкія фарфоравыя фігуркі. Каштуюць ад 20 рублёў. Нядорага прадаюць посуд сярэдзіны мінулага стагоддзя: за 30 рублёў можна набыць хрустальную салатніцу ці набор з шасці келіхаў.

Шукаю што-небудзь цікавейшае. За 100 рублёў гатовы аддаць велізарную галаву Леніна 50-60-х гадоў (ведаць бы, хто ж яе купіць і куды паставіць?). За 260 прапануюць сярэбраную сальніцу, крыху большую за напарстак. Масква, 1900 год, майстар Клінгерт Густаў. З цэннікам ад 500 рублёў выстаўлены дарэвалюцыйныя самавары. Праўда, на самы дарагі сярэднестатыстычнага заробку ўжо не хопіць — за яго просяць 1500 рублёў.

Антыкварная мэбля таксама не ўпісваецца ў бюджэт. Кошт шырокага мяккага крэсла з абіўкай у «турэцкія агуркі» — чатыры тысячы рублёў.

Цікаўлюся ў крамах наконт самых дарагіх рарытэтаў. У адным салоне імі аказаліся рэчы коштам па 14 тысяч. Горка, вырабленая ў XIX стагоддзі ў Еўропе, з разьбой і жывапісам, і бронзавая скульптура «Багіня міру» (прывезена з Францыі, датуецца 1850-мі гадамі). У іншай краме сярод найбольш каштоўных рарытэтаў — вялікая фарфоравая статуэтка бога вайны Марса (мануфактура Мэйсан, Германія). З прыватнай калекцыі. Развітацца з прыгажосцю XVIII стагоддзя гатовы за 15 тысяч рублёў. А за 25 тысяч прапануюць набыць абраз XVII стагоддзя.

За самы дарагі экспанат, які ўдалося знайсці ў продажы, прасілі амаль у тры разы больш — 70 тысяч! У столькі ацанілі падлогавы гадзіннік сярэдзіны XIX стагоддзя. Двухметровы рарытэт, выкананы з масіву дрэва, быў выраблены ў Францыі і захаваўся ў выдатным стане.

Дарэчы, рарытэты ў антыкварных салонах набываюць не толькі прыватныя асобы. Часам такім чынам сваю калекцыі папаўняюць раённыя музеі. У адной з крам расказалі, што ў іх куплялі рэчы, напрыклад, для музеяў у Горках, Маладзечне ■

■ Спрэчны момант

# У метадысты не бяруць, а ў хімчыстку не хачу

## МІНЧАНКА АБУРАЕЦЦА, ШТО СЛУЖБЫ ЗАНЯТАСЦІ НЕ ЗМАГЛІ ЗНАЙСЦІ ЁЙ РАБОТУ

**«Мяне знялі з уліку беспрацоўных, але так і не прапанавалі падыходзячых вакансій», — паскардзілася ў рэдакцыю адна з чытачак. Мінчанка Наталля Малочка звярнулася па дапамогу ў службу занятасці два гады таму. За гэты час, як сцвярджае жанчына, ёй, настаўніку геаграфіі і біялогіі, не змаглі падабраць работу, якая б адпавядала яе кваліфікацыі. Органы па працаўладкаванні не выконваюць сваю задачу, абураецца Наталля Іванаўна. Праўда, калі мы пачалі разбірацца ў гэтай сітуацыі, аказалася, што ўсё не так адназначна.**

### ШУКАЮ ЗАНЯТАК ПА КВАЛІФІКАЦЫІ

Наталля мае вышэйшую адукацыю, скончыла аспірантуру ў педагагічным універсітэце. Там і працавала ў якасці метадыста. А ў жніўні 2014 года жанчыну звольнілі: не сталі працягваць кантракт.

У тым жа месяцы Наталля звярнулася ў службу занятасці Фрунзенскага раёна сталіцы. Хацела ўладкавацца метадыстам. Але ёй прапаноўвалі толькі нізкакваліфікаваную працу, ісці на якую Наталля не згаджалася. У выніку жанчыну знялі з уліку за адмову ад дзвюх і больш падыходзячых вакансій.

— Падставай стала мая адмова ад месца па броні прыёмшчыцы заказаў у хімчыстцы, — тлумачыць чытачка. — Але гэта вакансія не мае ніякага дачынення да маёй кваліфікацыі! Заробак там — 350 рублёў, а ў летнія месяцы, як мне паведамілі ў прадпрыемстве па тэлефоне, з улікам скарочанага працоўнага дня яшчэ меншы. На гэтую суму я не змагу кармiць, апранаць, абуваць і лячыць сваіх траіх малалетніх дзяцей.

Жанчына хвалюецца, што цяпер яна да таго ж будзе лічыцца сацыяльным утрыманцам і вымушана будзе плаціць падатак, на які ў яе няма грошай.

— Няўжо ў нас чалавек з вышэйшай адукацыяй можа разлічваць толькі на працу па незапатрабаваных вакансіях з невялікім памерам заробку? — абураецца мінчанка.

Пра тое, ці спрабавала яна знайсці работу самастойна, Наталля прамаўчала.

### «БЕСПРАЦОЎНАЯ АД УСЯГО АДМОВІЛАСЯ»

У гарадскім камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне расказваюць крыху іншую версію. У адпаведнасці з пажаданнем Наталлі Іванаўны, ёй падабралі 25 варыянтаў уладкавання ў якасці метадыста, спецыяліста, выхавальніка інтэрната і выдалі адпаведныя накіраванні на работу. Іншая справа, што наймальнікі ўзяць жанчыну адмовіліся, у асноўным праз неадпаведнасць кваліфікацыі.

Паколькі па спецыяльнасці месца знайсці не атрымалася, Наталлі прапанавалі яшчэ 20 вакансій па іншых прафесіях: лабарант, бібліятэкар, адміністратар, камплектоўшчык тавараў. Разглядаць іх беспрацоўная не стала: сказала, што гэта не адпавядае яе адукацыі і вопыту працы. У службе занятасці адзначаюць, што ўзровень аплаты на некаторых прапанаваных месцах быў большым за 400 рублёў у месяц.

— Аддзелам працаўладкавання не абмяжоўвалася права Наталлі Малочкі на выбар прафесіі ў адпаведнасці са здольнасцямі і прафесійнай падрыхтоўкай. Ёй садзейнічалі ў пошуку работы з улікам адукацыі, пажаданняў і вакансій, якія паступалі ад наймальнікаў Мінска. Паколькі пажаданні беспрацоўнай зводзіліся толькі да падбору месца метадыста, яе ўладкаванне было праблематычным, бо попыт на такіх спецыялістаў абмежаваны, — каментуе **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ.**

Жанчыне прапаноўвалі таксама прайсці адукацыю па прафесіях, якія цяпер запатрабаваны на рынку, — «Бухгалтарскі ўлік і кантроль у прамысловасці», «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм». Ад курсаў Наталля адмовілася.

Дапамогу па беспрацоўі шматдзетнай маці прызначылі. Памер выплат, вядома, невялікі, але са жніўня 2014-га па люты 2016-га сума набегла важкая — 462 рублі. Праўда, пералічыць гэтыя грошы жанчыне не змаглі. Наталля не адкрыла адпаведны рахунак у банку і не паведаміла яго нумар спецыялісту аддзела працаўладкавання, хоць ёй неадноймчы нагадвалі пра гэта.

Што да падатку за ўтрыманства, то наконт гэтага мінчанка можа не хвалявацца. Згодна з дэкрэтам №3, грамадзяне, якія выхоўваюць траіх і больш непаўналетніх дзяцей, таксама ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў, а таму плаціць збор ім не трэба.

**«Паколькі пажаданні беспрацоўнай зводзіліся толькі да падбору месца метадыста, яе ўладкаванне было праблематычным, бо попыт на такіх спецыялістаў абмежаваны».**

Жанна Рамановіч упэўнена: яны зрабілі ўсё магчымае і дзейнічалі па правілах. Так, згодна з артыкулам 4 Закона аб занятасці, для беспрацоўных, якія стаяць на ўліку больш за 12 месяцаў, падыходзячай з'яўляецца любая аплатная работа, у тым ліку часовага характару, якая ўлічвае ўзроставыя і іншыя асаблівасці.

Да таго ж мінчанку некалькі разоў папярэджвалі, што за пастаянныя адмовы ад прапаноў яе можа права пазбавіць статусу беспрацоўнай. Зноў стаць на ўлік у службу занятасці Наталля зможа праз год. А каб атрымаць садзейнічанне ў пошуку работы (а не статус беспрацоўнай), жанчына можа звярнуцца ў любы момант ■

Матэрыялы падрыхтавала Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

**Продавец:** Кооперативно-торговое унитарное предприятие «Полоцкая универсальная база», 211400, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Пролетарская, 6, тел. 8 0214 48-38-55.

Лот №1. Капитальное строение с инв. №212/С-120 площадью 2810,3 кв.м, назначение – здание производственное (трехэтажное кирпичное здание), наименование – трехэтажное кирпичное производственное здание; ШРП-2 – шкафной газорегуляторный пункт; ЩА-2 – щит автоматики с системой загазованности; щит управления; ПЗК – предохранительной запорный клапан (в комплекте с датчиком температуры и датчиком давления); горелка блочная газовая (в комплекте с автоматикой) 2 шт.; котел стальной паровой КП – 300 Ж (в комплекте с автоматикой); котел стальной паровой КП – 300 Г (в комплекте с автоматикой); теплосчетчик пара; блок питания; комплекс для измерения количества газа; комплект транспортировочного устройства (газовая разводка по котельной); печь Г4-ХПФ-21М. Имущество расположено по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, г.п. Шарковщина, пер.Советский, д.15 на зем.участке №225555100001002025 площадью 0,8228 га. **Начальная цена (с учетом/до деноминации): 338 552,65 / 3 385 526 500 бел. руб. с НДС. Задаток (с учетом/до деноминации) 33 855,26 / 338 552 600 бел. руб.**

Аукцион состоится **27.09.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи документов: **с 29.08.2016 с 8.30 по 26.09.2016 до 17.30.** Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в сроки, указанные в договоре купли-продажи.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности Витебского областного союза потребительских обществ, утвержденным Постановлением правления Витебского областного союза потребительских обществ от 20.09.2011 №301. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа, подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); копии учредительных документов (для юр.лица); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения, оформленная не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе, или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык (для юр. лиц – нерезидентов РБ), заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ, подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ранее опубликованные извещения: газеты «Звязда» от 12.03.2016, 28.05.2016, «Полацкі веснік» от 11.03.2016, 27.05.2016, «Витебские вести» от 12.03.2016, 28.05.2016, «Кліч Радзімы» от 12.03.2016, 28.05.2016. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

**Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома объявляет о проведении публичных торгов в рамках исполнительных производств**

## о взыскании задолженности с Демчука Сергея Всеволодовича

**Лот №1.** Изолированное помещение с инв. номером 500/D-703671, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 40, пом. 1, площадью 21684 кв.м, назначение: помещение транспортного назначения, зарегистрированное за ОДО «Финанстрансгрупп»

**Стоимость 8 719 884 белорусских рубля 48 копеек.**
**Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.**

Подробная информация об имуществе размещена на сайте:
**http://just-minsk.gov.by/,**
а также в помещении отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома:
**г. Минск, ул. Коллекторная, 3.**

**Торги состоятся 30.09.2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3, каб. 14**

По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться к:
судебный исполнитель Русецкий Алексей Павлович,
т./ф. (017) 200-12-93, +375-33-398-13-10
и.о. начальника отдела Маринина Елена Александровна,
т. 200-11-30 +375-33-398-13-12
с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00
или по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900002445 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 100223493 отдела принудительного исполнения УПИ ГУЮ Мингорисполкома не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Мебельстройконструкция» г. Скидель 27 сентября 2016 года

| | |
|---|---|
| Вид аукциона | Открытый |
| Предмет аукциона | Склад с инвентарным номером 401/С-29507 общей площадью 1045,3 м$^2$, год постройки – 1999. Здание 2-этажное. Материал стен – кирпич, железобетонные панели |
| Начальная цена продажи | **216 685,42 рубля (с учетом НДС 20%)** |
| Кадастровый номер земельного участка | **422050400002002649** |
| Месторасположение земельного участка | **г. Скидель, ул. Промышленная, д. 6/2** |
| Размер земельного участка | **0,0791 га** |
| Продавец | Открытое акционерное общество «Мебельстройконструкция», 231761, г. Скидель, ул. Промышленная, д. 6, тел. (0152) 977808, 977807 |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел. 720537, 720546. |
| Дата проведения аукциона | **27 сентября 2016 года** |
| Время проведения аукциона | **12.00** |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| Дата и время начала приема документов | 29 августа 2016 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 21 сентября 2016 года 17.00 |
| Сумма задатка | **20 000 рублей** |
| Шаг аукциона | 5% |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости»; **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки по фристайлу» ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ № 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды помещения сроком 3 года, общей площадью 103,5 кв.м (с оборудованием, стоимость аренды оборудования не входит в стоимость аренды помещения), расположенного на 1-м этаже здания по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 4а |
| **Начальная цена продажи** | 527,85 (пятьсот двадцать семь рублей 85 копеек) с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | Коэффициент 3,0 |
| **Условия аукциона** | Размещение на арендуемых площадях объекта общественного питания |
| **Сумма задатка** | 52,79 (пятьдесят два рубля 79 копеек) |

**Аукцион состоится 4 октября 2016 года в 11.00 по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 4А, конференц-зал.**

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:
- перечисляет задаток 220012, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сурганова, 4А, УНП 192386264, ОКПО 382113515000, р/с 3632900000099 (внебюджет) в ф-ле № 510 АСБ «Беларусбанк», код 603,г. Минск, ул. Куйбышева, 18;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.
Помимо указанных документов:
- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию;
- нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.
Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Шаг аукциона – 5%.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 4а, ресепшн, с 01.09.2016 по 29.09.2016 (с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням).**

**Последний день приема заявлений – 29 сентября 2016 года до 16.00. Документы поданные после 16.00 29.09.2016, рассматриваться не будут.**

**Телефон для справок: 287 97 56 – Учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки по фристайлу»**

## НОВОПОЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

**проводит открытый аукцион по продаже земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома с расположенным на нем не завершенным строительством незаконсервированным жилым домом гражданам Республики Беларусь**

| № лота | Наименование лота | Площадь земельного участка (га)/ процент готовности жилого дома | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 624484003101000029 и расположенный на нем не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенные по адресу: д. Дудичи, ул. Птичанска, д. №16А | 0,2471 /12 | Возможность электрофикации, газификации, водоснабжения | 126,00 | 14773,43 | 2955,0 |

*Задаток перечисляется на р/с № 3600625110003 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 27, БИК 153001795, УНН 600177772, ОКПО 04429639, код платежа 04901, Новопольский сельисполком.*

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

**Аукцион состоится 28 сентября 2016 года в 15.00 по адресу: аг. Новополье, ул. Центральная, 21 (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22 сентября 2016 года до 17.00** по вышеуказанному адресу.

Телефоны для справок (8-017-13) 3-03-16, 3-03-35; сайт Пуховичского райисполкома: **www.pukhovichi/minsk-region.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ (пос. Фабричный, ул. Кстинская, ул. Мичурина, микрорайон «Заболоть», микрорайон «Южный-4») в собственность в г. Гродно 27 сентября 2016 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, (с учетом деноминации), руб. | Начальная цена продажи, (с учетом деноминации), руб. | Сумма задатка (с учетом деноминации), руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок У-17* | пос. Фабричный | 0,0832 | 440100000001009139 | 1 751,81 | 9 846,05 | 1 800 |
| 2. | Земельный участок У-18* | пос. Фабричный | 0,0833 | 440100000001009140 | 1 751,81 | 9 857,88 | 1 800 |
| 3. | Земельный участок У-1* | ул. Кстинская, в районе домовладения № 14 | 0,0921 | 440100000001009426 | 2 660,99 | 23 307,64 | 4 000 |
| 4. | Земельный участок * | ул. Мичурина, 41а | 0,1296 | 440100000002008775 | 2 832,29 | 46 392,26 | 8 000 |
| 5. | Земельный участок У-612* | м-н «Заболоть» | 0,1017 | 440100000002007236 | - | 13 681,30 | 2 700 |
| 6. | Земельный участок У-352* | м-н «Южный-4» | 0,1284 | 440100000003003983 | - | 24 737,25 | 5 000 |

**Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.*

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 27 сентября 2016 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток не позднее **21 сентября 2016 года** в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет №3012000041810 в филиале № 400 Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

**представить в ГП «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 29 августа по 21 сентября 2016 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**



Работа Вольгі Сяргеевай.

■ Падзея месяца

# ВЕЧНАСЦЬ «АДЫСЕІ»

## ВОСЕМ ФОТАМАСТАКОЎ ПАКАЗВАЮЦЬ СВАЁ ПРАЧЫТАННЕ СТАРАЖЫТНАГА МІФА

**З тых часоў, як у VIII стагоддзі да нашай эры Гамер стварыў эпас пра Адысея, гэты твор сістэматычна цытуецца ў мастацтве ўсяго свету. Да дзесяцігадовага падарожжа легендарнага героя, што пасля Траянскай вайны вяртаўся да жонкі Пенелопы, адсылае і выстаўка мастацкай фатаграфіі ў мінскім Цэнтры сучасных мастацтваў. Яна так і называецца — «Адысея», толькі інтэрпрэтацыя старажытнага міфа ў праектах выстаўленых фотамайстроў вольная, сувязь з часам улоўліваецца толькі інтуітыўна. Экспазіцыя, якую можна наведаць да 3 верасня, становіцца нашай «падзеяй месяца».**

Выстава размясцілася ў некалькіх залах Цэнтра сучасных мастацтваў на Някрасава — кожнае памяшканне як пункт вандроўкі Адысея — унікальны, асаблівы, непаўторны. Восем аўтараў, прадстаўнікоў Мінскай школы фатаграфіі і госця са Смаленска, занялі асобныя прасторы. Кожны з іх ужо даўно звязаў сваё жыццё з фатаграфіяй, мае ў творчай біяграфіі персанальныя выстаўкі, з'яўляецца вядомым фотамастаком у Беларусі і за мяжой.

**Мудрагелістыя адсылкі да Уліса ў гэтым выпадку — знак добрай якасці, а кожная работа выстаўкі ў кантэксце гамераўскай паэмы становіцца магічнай.**

Галоўнае ў выстаўленых работах — тэхніка. У сэнсе прыёмаў, а не апаратуры — гэта метады класічнай чорна-белай фатаграфіі і прыклады друку, якія сёння называюць альтэрнатыўнымі. У стварэнні кожнага экспаната столькі працаёмкіх працэсаў і рукатворнасці, што назваць іх проста здымкам недастаткова (фатаграфія, як любы від творчай дзейнасці, мае шмат кірункаў, якія між сабой могуць мала перасякацца). Азначэнне «твор мастацтва» ў гэтым выпадку падыдзе больш.

Падборкі адразу трох аўтараў выкананы ў старадаўняй тэхніцы гуміярабік. Гэта Андрэй Васкрасенскі, выстава якога з'яўляецца быццам сувязным звяном «Адысеі» ўвогуле, Марыя Банэ з чорна-белымі кампазіцыямі і адзіная замежная ўдзельніца праекта — аўтарка са Смаленска Ганна Зіміна. Кацярына Гуртавая займаецца мінскай тэхнікай (да якой маюць дачыненне і вучоныя) — сярэбраным адбіткам і алавяным працэсам апрацоўкі фатаграфіі. Марына Бацюкова прадставіла сярэбраны адбітак і мультыкампазіцыю, Наталля Яўмененка — вядомую амаль з самага нараджэння фатаграфіі работу на акварэльнай паперы з выкарыстаннем салей жалеза. Вольга Сяргеева (глядзіце ілюстрацыю) займаецца асучасненым брамойлем, сярэбраным адбіткам, алейнымі фарбамі. Альберт Цэхановіч, удзельнік і куратар выставы, паказвае фатаграфію на класічны манокль, класічны чорна-белы друк.

«Праект пачаўся яшчэ чатыры гады таму: разам з Андрэем Васкрасенскім і Вольгай Сяргеевай мы ехалі ў цягніку з Санкт-Пецярбурга і абмяркоўвалі ідэю зрабіць нешта новае, — расказвае Альберт Цэхановіч. — У гэтых размовах з'явілася слова «Адысея», якое мы сталі абдумваць і прымяраць на сябе; потым пачаўся пошук удзельнікаў. Наш шлях да выставы заняў амаль чатыры гады. Хоць сапраўдная Адысея цягнулася дзесяць, сёння, калі тэмп жыцця крыху іншы, чатыры гады сталі для нас даволі вялікім прамежкам часу. Тыя ўдзельнікі, хто даплыў да фінішу (бо даплылі не ўсе), мне здаецца, выраслі і як майстры. Увогуле для гэтай перспектывы росту праекты і ствараюцца. Адсюль і наша тэма — мы хацелі звярнуцца да каранёў еўрапейскай цывілізацыі, наблізіцца да іх разумення прыгожага. Наша група спрабуе

**У стварэнні кожнага экспаната столькі працаёмкіх працэсаў і рукатворнасці, што назваць іх проста здымкам недастаткова.**

развіваць фатаграфію, у якой ёсць багацце пластыкі, сучаснае стылістычнае прачытанне гармоніі. Адным словам, мы спрабуем развіваць прыгожую фатаграфію. Адрозненне прыгожай фатаграфіі ад прыгожанькай у свой час патлумачыў наш славуты фотамайстар Майсей Напельбаўм, калі сказаў, што «прыгожасці — гэта штампы, а прыгажосць заўсёды індывідуальная». Кожны мастак, што працуе з гэтым, перажывае вялікую трансфармацыю і праходзіць шлях ад майстэрства да мастацтва».

**«Адрозненне прыгожай фатаграфіі ад прыгожанькай у свой час патлумачыў наш славуты фотамайстар Майсей Напельбаўм, калі сказаў, што «прыгожасці — гэта штампы, а прыгажосць заўсёды індывідуальная».**

Залы выставы «Адысея» — быццам астравы ў Эгейскім моры. Сувязі з міфічным героем, матывамі і вобразамі гамераўскага эпасу, з «Улісам» Джэймса Джойса, са шматлікімі інтэрпрэтацыямі і прачытаннямі міфа наведвальнік шукае сам. Трэба сказаць, такое сваяцтва надае сучаснаму твору сімпатычны флёр непахісных сімвалаў. Подпісаў у фотаработ няма, і толькі адна серыя здымкаў можа наўпрост скіравацца да Адысеевых прыгод. Але літаральнае прачытанне — не заўсёды самае прыгожае. Таму мудрагелістыя адсылкі да Уліса ў гэтым выпадку — знак добрай якасці, а кожная работа выстаўкі ў кантэксце гамераўскай паэмы становіцца магічнай.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Спадчына

# СКАЗ ПРА БЯСКОНЦАСЦЬ

## Калі фільм можа паспрыяць захаванню старажытнага абраду

**У беларускай культурнай прасторы ўжо маецца некалькі выдатных прыкладаў арганізацыі праекта з дапамогай краўдфандынгу. Гэта спосаб збору сродкаў, што называецца, «нітка да ніткі», калі з невялікіх ахвяраванняў інтэрнэт-карыстальнікаў складваюцца вялікія сумы, якіх дастаткова для ўвасаблення ідэй. Аўтары ўносяць свае прапановы, а зацікаўленыя па меры магчымасці выдаткоўваюць грошы. На гэты раз справа не толькі прыгожая, але і справядлівая. На платформе Ulej агульнымі намаганнямі можна запусціць пэўны ланцужок, што павінен пачацца з прэзентацыйнага фільма пра старажытны дахрысціянскі абрад «Тураўскі карагод».**

У сваім першапачатковым выглядзе абрад захаваўся толькі ў адным месцы і ў адным калектыве — яго дагэтуль праводзіць народны фальклорны ансамбль «Міжрэчча» ў вёсцы Пагост. Дарэчы, яшчэ ў 2010 годзе ў дзясятцы найлепшых месцаў свету для святкавання Каляд і Новага года тэлекампанія CNN паставіла вёску Пагост на трэцяе месца.

**На праектах, увасобленых з дапамогай масавых ахвяраванняў, стаіць нябачная пячатка народнага ўхвалення.**

«Міжрэччам» кіруе Кацярына Панчэня, альбо проста баба Каця — яна ведае мноства народных песень і ўнікальных старажытных рытуалаў, сярод якіх і Тураўскі карагод — абрад урадлівасці зямлі і бясконцага чалавечага жыцця.

Дык вось, пра ланцужок. Калі будзе створаны прэзентацыйны фільм, ён стане апошнім адсутным элементам для падачы заяўкі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ў ЮНЕСКА на ўключэнне язычніцкага беларускага абраду ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. Адпаведны статус гарантуе аўтэнтычнай з'яве захаванне, што сёння для нас асабліва актуальна — хоць абрад і адсылае да вечнага чалавечага жыцця, фізічнае існаванне тых, хто падтрымлівае традыцыю тураўскага карагоду, усё ж не бясконцае.

Сітуацыяй пачаў турбавацца генеральны прадзюсар кампаніі «БелФільм Група» Юрый Ігруша, ён разам з рэжысёрам Ігарам Бышнёвым на працягу года здымаў на Палессі дакументальнае кіно. Вынікам сталі дзве неігравыя стужкі пра загадкавыя беларускія мясціны — «Дачка Прыпяці» і «Кола часу», што не так даўно былі паказаны ў Нацыянальным гістарычным музеі.

Дык вось, падчас працы на Палессі аказалася, што каштоўная аўтэнтыка (з таго, што ў краіне засталося) знаходзіцца пад пагрозай сыходу ў нябыцё. На гэты момант для падачы заяўкі сабраны дзясяткі неабходных дакументаў, але наяўнасць спецыяльнага фільма з'яўляецца абавязковай умовай. Таму Юрый Ігруша просіць паўдзельнічаць у праекце рублём, усё астатняе зробіць здымачная група.

**Прэзентацыйны фільм стане апошнім адсутным элементам для падачы заяўкі ў ЮНЕСКА на ўключэнне язычніцкага беларускага абраду ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.**

Сучасны спосаб збору сродкаў праз краўдфандынг — з'ява цікавая ў тым сэнсе, што на праектах, увасобленых з дапамогай масавых ахвяраванняў, стаіць нябачная пячатка народнага ўхвалення. Тое, што ствараецца за кошт краўдфандынгавых грошай, не мае права не адбыцца, не атрымацца, не быць вартым даверу. Таму ўсё, што мае ў гісторыі стварэння пазнаку адпаведных інтэрнэт-платформ, — гэта «выбар рэдакцыі». Уласны выбар гледача, наведвальніка, карыстальніка.

У выпадку з фільмам пра тураўскі карагод адказнасць падае не толькі на аўтараў, а згаданая ініцыятыва ахоплівае інтарэсы не проста гледача, а захавальніка ўласнай культурнай спадчыны. Для нашага вечнага жыцця.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■

■ Невядомае пра вядомых

# ВЯСНА І ЛЕТА ЖЫЦЦЯ ЕЎДАКІІ ЛОСЬ

## ПОСТАЦЬ ЗНАКАМІТАЙ ПАЭТКІ ВАЧЫМА ЯЕ СЫНА



**Яна нарадзілася 1 сакавіка, таму сваёй першай кнізе паэзіі дала сімвалічную назву «Сакавік». Знакавай аказалася і назва апошняга зборніка — «Лірыка ліпеня»: аўтаркі не стала 3 ліпеня, праз некалькі месяцаў пасля выдання згаданай кнігі. Еўдакія Лось была адной з самых яркіх і значных паэтак свайго часу. Дзясяткі кніг вершаў, дзіцячых твораў, перакладаў, мноства дзяржаўных узнагарод, шырокае прызнанне публікі і павага калег, бясконцыя вандроўкі і сустрэчы з чытачамі... На жаль, лёсам ёй не было наканавана дажыць да восені ўласнага жыцця: паэтка пайшла ў лепшы свет, калі ёй было ўсяго 48, а яе сыну Дзмітрыю — толькі 14. Менавіта з Дзмітрыем Ласём мы сёння згадваем Еўдакію Якаўлеўну — не яскравую прамоўцу на трыбуне, а клапатлівую маці.**

— Я памятаю маму досыць добра, вельмі добра памятаю тое, што яна ў мяне ўклала, — пачынае гутарку Дзмітрый Алегавіч. — Гэта і любоў да чытання, і яе ўласны прыклад старанных вучобы: мама скончыла педінстытут, Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Я слаба веру ў дар, але калі паразважаць: колькі дзяўчат з добрых, забяспечаных сем'яў выбіраюць не зусім правільны шлях у жыцці, не займаюцца творчасцю, не маюць вялікіх талентаў. Ганаруся тым, што мая мама здолела развіць свой талент. Далёка не кожны становіцца пісьменнікам, паэтам, вучоным, мастаком. А яна — простая жанчына з Ушаччыны, якая расла ў пасляваенны час, — змагла дасягнуць многага.



Еўдакія Лось у маладосці.

Дзмітрый Лось прызнаецца, што разуменне значнасці мамінай працы прыйшло не адразу:

— Калі быў зусім малы, не мог зразумець, чым яна займаецца: у сяброў бацькі былі інжынерамі, настаўнікамі, урачамі, вадзіцелямі тралейбуса — адразу бачна, як чалавек зарабляе. А мая мама ўвесь час сядзела за машынкай. Нешта надрукуе, напіша — потым парве старонку. Думаў, мне вельмі не пашанцавала. Але ўжо пазней, калі падрос, пачаў чытаць кнігі, зразумеў, што мама мае вялікі талент. Гадоў у пяць навучыўся чытаць, а ў трэцім-чацвёртым класе ўжо знаёміўся з класікай беларускай, рускай, сусветнай літаратуры. «Вайну і мір» адолеў у 8-м класе. І сёння чытанне — найлепшы занятак для мяне ў вольны час.

**«Да мяне яна была вельмі строгая, але вельмі добрая. Ніколі не песціла, хоць і не зневажала, не ганяла з пугай».**

Натуральна, Дзмітрый чытаў і ўсе кнігі Еўдакіі Лось. Сёння беражліва іх захоўвае, а некаторыя асобнікі — з вельмі цёплымі і шчымлівымі аўтографамі-парадамі для сына — яму асабліва дарагія. Сам Дзмітрый таксама спрабаваў пісаць вершы.

— Некаторыя з іх нават друкаваліся ў «Маладосці» і «Бярозцы», многія выдатныя творцы таго часу добра адгукаліся пра мае творчыя спробы, — кажа ён. — Калі маці памерла, напісаў некалькі вершаў, але потым жыццё пайшло так, што зусім стала не да паэзіі.

***— А якой была знакамітая паэтка дома, у сям'і?*** — пытаюся.

— Сапраўды, у свой час яна была вельмі вядомым чалавекам. Мела дзяржаўныя ўзнагароды, але сама сябе на п'едэстал не ставіла. На сваю выдатнасць і вядомасць глядзела нібыта збоку, ніколі ёй не карысталася. Яна ж па сутнасці простая жанчына, нарадзілася ў вёсцы. Мы ездзілі на адпачынак у Крым, у Дубулты на Балтыйскае мора. Да мяне была вельмі строгая, але вельмі добрая. Ніколі не песціла, хоць і не зневажала, не ганяла з пугай. Мама часта была ў паездках, а я жыў у той час з бабуляй. Але з кожнай вандроўкі ў Грузію, Арменію, Чэхаславакію, Францыю, Венгрыю, Прыбалтыку мама прывозіла мне падарункі — нацыянальныя сувеніры. Сама ж пасля кожнай паездкі пісала і цыклы вершаў, навеяныя падарожжамі.



*«...Гэтую кашулю вышываю сыну па сваёй ахвоце, па свайму пачыну».*
**Знакаміты верш Еўдакіі Лось яе сын ведае на памяць. На гэтым фотаздымку 10-гадовы Дзіма ў той самай кашулі, якую для яго ссышла і вышыла мама. 1973 год.**

Дзмітрый Алегавіч кажа, што Еўдакія Якаўлеўна вельмі часта распавядала яму пра дзяцінства, пра свайго брата, які загінуў падчас вайны:

— Яны жылі ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці. Падчас акупацыі хату спалілі. Мая бабуля Наталля засталася з трыма дочкамі. Жылі ў зямлянках, есці не было чаго. Здаралася, капалі мерзлую бульбу на палях. А старэйшы мамін брат, які працаваў настаўнікам у школе, у 1941 годзе пайшоў дабравольцам на фронт. Яму было 19. Скончыў курсы малодшых камандзіраў у Омску, у званні лейтэнанта загінуў ва Украіне, пахаваны там жа. Мама пра яго вельмі многа расказвала і прысвяціла загінуламу брату шмат вершаў.

Многія пісьменнікі ва ўспамінах пра Еўдакію Лось адзначаюць, што яна з ахвотай іх падтрымлівала, дапамагала. А Уладзімір Караткевіч нейк нават назваў яе Жытніцай — «істотай з беларускага фальклёру, якая жыве ў каласах і памірае толькі тады, калі апошні чалавек сабраў свой ураджай. Яна дапамагае ўсім, і дух яе жыве нават у тым пучку жыта, які выносяць вясною на Юр'я ў поле».

**«Дзённікі і ліставанне Еўдакіі Лось надрукаваныя толькі фрагментамі. Чакае выдання і кніга ўспамінаў, складзеная яе сястрой».**

— Сапраўды, яна вельмі многім пісьменнікам дапамагала, — пацвярджае Дзмітрый Алегавіч. — Апекавалася Жэняй Янішчыц. Яна некаторы час, калі ёй было 20, нават жыла ў нашай кватэры, я яе памятаю добра. Маці Жэню настаўляла, падтрымлівала, давала творчыя парады. Галіна Каржанеўская таксама часта ў нас бывала. Нават ёсць такі вядомы фотаздымак, на якім паэткі разам: мая мама, Яўгенія Янішчыц, Галіна Каржанеўская, Раіса Баравікова і Ніна Галіноўская. Гэта я іх сфатаграфаваў у нас дома, калі мама святкавала дзень нараджэння.

Лёс склаўся так, што сам Дзмітрый Алегавіч выбраў прафесію, далёкую ад творчасці. Ён жартуе:

— Напэўна, сапраўды на дзецях Бог адпачывае. Хоць у школе і ў акадэміі іграў у аматарскім тэатры, мне нават раілі паступаць у тэатральна-мастацкі інстытут у Маскву, але я выбраў іншы шлях. Паступіў у акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў у Омску, і потым ужо не да вершаў было. Ды і не хацелася іх пісаць.

Дарэчы, яшчэ не ўсе рысы творчай індывідуальнасці Еўдакіі Лось вядомыя чытачу. Яе дзённікі і ліставанне надрукаваныя толькі фрагментамі, а архівы, што захоўваюцца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры і Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, не цалкам вывучаныя. Чакае выдання і кніга ўспамінаў пра Еўдакію Якаўлеўну, складзеная яе сястрой.

— Яна памерла амаль што 40 гадоў таму. Лічы, цэлае жыццё прайшло. А творы мамы дагэтуль друкуюцца, — кажа Дзмітрый. — Пра яе памятаюць, нячаста, але ўспамінаюць. Значыць, чалавек нездарма жыў на гэтым свеце.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*
**Фота з сямейнага архіва Дзмітрыя ЛАСЯ**

■

# ШАРМ ТЭАТРАЛЬНАЙ СТАЖЫРОЎКІ

## ФРАНЦУЗСКАЯ МОВА НА БЕЛАРУСКАЙ СЦЭНЕ

**Адзін дзень у жніўні ў нашым тэатры можна пачуць французскую мову. Як ні дзіўна, такое магчыма менавіта ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, на сцэне якога ўжо некалькі гадоў увасабляецца міжнародны праект «Французскі экспрэс». Маладыя акцёры кантактуюць з калегамі з іншых краін, удасканальваюць сваё майстэрства, а летняе тэатральнае зацішша дае ім магчымасць прадставіць вынікі супрацоўніцтва ў спецыяльным канцэрце. Чарговы адбыўся 26 жніўня, у беларускім тэатры гучала французская мова.**





Сцэны са спектакля «Тры Жызэлі» РТБД.

Але праект цікавы не толькі з прычыны французскага каларыту, які забяспечваецца ўдзелам тэатральнай асацыяцыі Demain le Printemps і міжнароднага грамадскага аб'яднання «Тэатра». Сёлета ў Мінск прыехалі ўдзельнікі не толькі з Францыі, але

**Удумайцеся: маладыя акцёры прыязджаюць да нас павучыцца! «Ёсць чаму», — вырашыў аднойчы рэжысёр Фабрыс Карэ.**

таксама з Канады і Чэхіі, каб займацца вакалам, танцамі, працаваць над сцэнічнымі рухамі і дыкцыяй. Удумайцеся: маладыя акцёры прыязджаюць да нас павучыцца! «Ёсць чаму», — вырашыў аднойчы рэжысёр Фабрыс Карэ. Ён ведае беларускую тэатральную школу, мае добрую думку пра акцёрскую падрыхтоўку ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Шмат гадоў ён арганізоўвае майстар-класы з удзелам замежных акцёраў у самых розных краінах. У Беларусі ў рамках праекта «Французскі экспрэс» у мінулыя гады прадстаўлялі спектаклі на тэму «Тэатральны вояж». Але бываюць адмысловыя вечарыны ці канцэрты, як апошні, што стаў вынікам акцёрскага трэнінгу. Месяца экспрэс-стажыроўкі дастаткова, каб паназіраць за прадстаўнікамі іншай культуры (г.зн. за намі) і праз мініяцюры паказаць сваё бачанне ці разуменне беларускага жыцця. Лепшае

**Па-французску, але зразумела, таму што мова тэатра — гэта мова мастацтва, якое даходзіць праз пачуцці.**

і цікавейшае трапляе ў канцэрт, дзе драматычныя нумары чаргуюцца з танцавальнымі ці вакальнымі. Чым нас звычайна прывабліваюць тэатральныя капуснікі? Якраз вольнай формай, гумарам, неардынарнымі знаходкамі і нястрыманай фантазіяй. Па-французску, але зразумела, таму што мова тэатра — гэта мова мастацтва, якое даходзіць праз пачуцці. Але для тых, каму важна разумець сутнасць сказанага, забяспечваецца сінхронны пераклад.

Што яшчэ важна, гэта не апошні раз: сумесны праект на базе Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі пад назвай «Тэатральная арка» будзе доўжыцца і парадуе новымі крэатыўнымі мерапрыемствамі цягам наступнага сезона. І, магчыма, дзе-небудзь у Парыжы таксама ўбачаць беларускі тэатр: у афішы ёсць спектакль на французскую тэму «Тры Жызэлі» (рэжысёра Аляксандра Гарцуева паводле Андрэя Курэйчыка). Каб не толькі яны да нас, але і мы да іх...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

# Творцы і Рэйтан

## Сучаснае мастацтва як спосаб прыцягнуць увагу да гістарычнай сядзібы ў Грушаўцы

**У Ляхавіцкім раёне прайшоў мастацкі фестываль «Дах», які спалучыўся з арганізаваным мясцовымі ўладамі фэстам «З крыніц спрадвечных». Разам яны нагадалі пра актыўны творчы дух гэтых мясцін, дзе дагэтуль застаецца гістарычная сядзіба аднаго з палітычных дзеячаў ВКЛ Тадэвуша Рэйтана. Менавіта гэтая сядзіба і прыцягвае ўвагу сучасных мастакоў.**

Спачатку ў Мінску ладзілі фестываль авангарднага мастацтва «Дах». Потым яго сталі прысвячаць памяці Тадэвуша Рэйтана, грамадскага дзеяча, пасла Вялікага Княства Літоўскага ў сойме Рэчы Паспалітай. Падавалася дзіўным: якое дачыненне прадстаўнік старажытнага рыцарскага роду мае да мастацкага авангарду? Зрэшты, калі адзін грамадскі ўчынак Рэйтана расцаніць як мастацкі акт, то можна разглядзець яго асобу як вынаходлівага творцы: магчыма, менавіта ён наладзіў перформанс, калі да з'яўлення такой формы было яшчэ вельмі далёка. Ён лёг каля дзвярэй і прапанаваў палітыкам пераступіць цераз сябе, калі яны сваімі рашэннямі не дапусцілі разбурэння краіны... Тым не менш у гісторыю Тадэвуш Рэйтан увайшоў не як мастак, а як патрыёт, гатовы ахвяраваць сабой дзеля радзімы. Каб радзіма не дапусціла знікнення памяці пра гэтую асобу, была створана арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана. Ініцыятары яе стварэння Зміцер Юркевіч і Алесь Родзін вырашылі, што фестываль «Дах» будзе апекавацца захаваннем гістарычнай сядзібы ў вёсцы Грушаўка на Брэстчыне, дзе нарадзіўся Тадэвуш Рэйтан.

Зміцер Юркевіч расказаў, што выклікае асноўны клопат на цяперашні момант:

— Арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана ўжо чатыры гады вядзе барацьбу за вяртанне яго імя беларускай культуры і за захаванне гістарычнай сядзібы ва ўласнасці дзяржавы, таму што былі планы яе перадаць у прыватную ўласнасць. Але цяпер у мясцовых улад ёсць ідэя стварыць у гэтай сядзібе краязнаўчы музей, дзе было б ушанавана імя Тадэвуша Рэйтана. Значную ролю ў прыняцці такога рашэння адыгралі мастацкія імпрэзы і летнікі, якія ладзяцца ў рамках фестывалю сучаснага мастацтва «Дах».

Сёлета з летнікам дапамагло грамадскае аб'яднанне ІКАМОС. У рамках фестывалю «Дах» праводзіліся майстар-класы, мастацкія выстаўкі, канцэрты. Але Зміцер Юркевіч мяркуе, што варта было б далучыць да работы гісторыкаў і правесці «Рэйтанаўскія чытанні», каб раскрыць таямніцы жыцця і смерці Тадэвуша Рэйтана, таму што вакол гэтай асобы існуе шмат міфаў. Арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана спадзяецца на актыўнасць грамадскасці ў цікавасці да лёсу сядзібы ў вёсцы Грушаўка: выдатнае месца для сустрэч, творчасці і паглыблення ў гісторыю ўсёй краіны...



**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ На закрытай прасторы

# Роўнасць паміж каханнем і небыццём

## САША ШАПО АДНОЙ ВЫСТАВАЙ ПАДВЁЎ ВЫНІКІ ЗА 17 ГАДОЎ

**Жанчына і каханне зноў становяцца цэнтральнымі матывамі — 18 жніўня ў Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава графіка і скульптара Сашы Шапо «Сюіта №45». Прысвечаная жонцы экспазіцыя ў якасці эпіграфа мае выраз са Старога Запавету: «Моцнае як смерць каханне». Магчыма, на гэтым трымаецца не толькі сэнс выставы, але і светабудова ўвогуле.**



Экспазіцыю, што ў самой назве мае адсылку да ўзросту (Аляксандру Шапо 45 гадоў), варта разглядаць, вядома ж, як падвядзенне вынікаў. 20 скульптур і 30 літаграфій, дзе самы ранні экспанат датуецца 1999 годам, а самы позні 2016-м, — гэта ілюстрацыя пэўнага перыяду мастака. Гратэск, эротыка, гумар — усё працятае шматзначнымі сімваламі і пачуццёвасцю. Што можна патлумачыць розумам і адчуць праз эмоцыі.

**Экспазіцыю, што ў самой назве мае адсылку да ўзросту (Аляксандру Шапо 45 гадоў), варта разглядаць, вядома ж, як падвядзенне вынікаў.**

Сам аўтар, якога называюць мастаком-філосафам (хоць які творца філосафам не з'яўляецца?), акцэнтуе ўвагу на тым, што ў асэнсаванні Быцця галоўныя паняцці — гэта каханне і небыццё, што часам адно да аднаго прыроўніваецца. І каханне тут — гэта не толькі адносіны паміж мужчынам і жанчынай, але і любоў увогуле, бо простых і сціслых паняццяў у мастацтве, а тым больш у філасофіі, няма.

Таму паняцце кахання (усё ж больш кахання, а не любові) паварочваецца і разглядаецца тут з усіх бакоў, базуецца ў вобразах і архетыпах жанчын, дапаўняецца цытатамі з Біբліі і адсылкамі да міфалогіі.

Некаторыя работы з выставы ўжо вядомыя беларускаму наведвальніку (і не толькі беларускаму, творчасць Аляксандра Шапо захоўваецца за мяжой таксама), нешта выстаўлена ўпершыню. У 2008 годзе мастак стаў прызёрам прэстыжнай Міжнароднай трыенале друкаванай графікі Кочы ў Японіі, яго скульптурныя работы

**Паняцце кахання паварочваецца і разглядаецца тут з усіх бакоў, базуецца ў вобразах і архетыпах жанчын, дапаўняецца цытатамі з Біբліі і адсылкамі да міфалогіі.**

штодзень бачаць жыхары беларускіх, украінскіх, літоўскіх і расійскіх гарадоў.

Таямнічыя жаночыя (і не толькі) вобразы майстра, яго асэнсаванне базавых паняццяў Быцця, яго пачуцці і яго каханне да 25 верасня выстаўляюцца ў залах Нацыянальнага мастацкага музея.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Наш Кодэкс

# ГЭТА ВЕЛЬМІ ЗРУЧНА



**Мікалай ГАЙБА, дырэктар дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку:**

— Ні ў адной краіне свету няма такога дакумента, як Кодэкс аб культуры: у ім аб'ядналі нарматыўныя прававыя акты з розных сфер, і гэта вельмі зручна.

Раней прымаўся нейкі іншы закон, датычны культуры, папярэдні скасоўваўся, а хтосьці мог быць не ў курсе. Кодэкс з'яўляецца вышэйшым за ўсе ранейшыя пастановы — калі нехта прапусціў пэўны важны дакумент, які рэгулюе яго сферу, зможа адшукаць усё ў кодэксе.

Напрыклад, некаторыя музеі знаходзяцца ў будынках, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Раней нам даводзілася спецыяльна шукаць дакументы па ахове гэтага помніка, яго ўліку ў іншых крыніцах. А цяпер яны, умоўна кажучы, сабраны ў адной кнізе: проста адкрываеш адпаведны раздзел і знаходзіш. Гэта, безумоўна, плюс.

Спрошчаны працэс стварэння новых музеяў, у тым ліку пад адкрытым небам. Усё часцей з'яўляюцца прыватныя, напрыклад музей праса ў Гродне, музей мёду. Таму гэта знайшло адлюстраванне ў кодэксе.

Пры стварэнні школьнага або прыватнага музея цяпер абавязкова павінна быць адзінка музейнага супрацоўніка. Бо часта музейная праца ў школах праводзіцца на грамадскіх пачатках — настаўнік захоўвае экспазіцыю, не маючы пасады. Цяпер жа захавальнік або іншы супрацоўнік у музеі павінен быць абавязкова. Таму, займаючыся такой працай, чалавек, натуральна, будзе атрымліваць дадатковыя грошы.

У Кодэксе прапісана, што будынак, у якім знаходзіцца музей, павінен адпавядаць пэўным нормам — мець адпаведны рамонт, асвятленне, водазабеспячэнне.

Раней быў закон аб экспазіцыях і музейных фондах. У ім распісвалася, як ствараюцца экспазіцыі, якое выбіраецца архітэктурна-праектнае рашэнне, якія тэрміны выканання работ і іншае. Усе гэтыя правілы захаваліся і таксама адлюстраваны ў дакуменце.

Кодэкс распрацоўваўся паўтара года. У музеі і іншыя ўстановы культуры накіроўваліся лісты з просьбай дасылаць свае папраўкі ў праект кодэкса. Таксама добра, што да прыняцця дакумент знаходзіўся на сайце Міністэрства культуры і кожны ахвотны мог з ім азнаёміцца. І неабходна на сайце дзяліцца думкамі ці звяртацца з прапановамі праз свае ўстановы культуры ■

■ Асоба

## Акадэмік Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ:

# «Кожны пісьменнік стварае сваю літаратуру»

**Яго паважаюць. З ім раяцца. Многія маладыя літаратуразнаўцы выбіраюць менавіта яго як навуковага кіраўніка іх дысертацый. І гэта цалкам лагічна: за плячыма Уладзіміра ГНІЛАМЁДАВА, доктара філалагічных навук, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — багаты даследчыцкі і творчы досвед. Ён выхаваў больш як чатыры дзясяткі аспірантаў, стварыў звыш дзясятка літаратуразнаўчых манаграфій, з грунтоўнымі раманамі, апошнім часам выступае ў друку і як пісьменнік. Мы гутарым з Уладзімірам Васілевічам пра важнасць быць шчырым у творчасці, неабходнасць перачытвання класікі і ўменне здзіўляцца як адну з важных рысаў чалавека.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Сёння часта кажуць пра вяртанне папулярнасці прозы вялікай формы. Вы таксама ў сваёй творчасці звярнуліся да жанру рамана, больш за тое, аб'ядналі іх у тэтралогію. Чаму аддалі перавагу гэтай форме?***

— Сапраўды, ёсць вяртанне да вялікай формы ў розных літаратурах свету, але мне падаецца што беларуская не спяшаецца ў гэтым пытанні. У нас выходзіць не так і шмат раманаў. Што ж да мяне, то, магчыма, пайшоў гэтым шляхам, бо літаратуразнаўства не давала ўсіх магчымасцяў асэнсаваць свой час, усё XX стагоддзе, сучаснікаў, гістарычныя асобы, змену пакаленняў, якія дае белетрыстыка. Я паспрабаваў — гэта было ў час перабудовы, шмат раіўся з прафесарам Уладзімірам Калеснікам, іншымі калегамі. Яны мяне натхнілі — і пачаў пісаць. Гэта ж цікава, прыгадаць тых, з кім калісьці жыў, аднавяскоўцаў, знаёмых, землякоў, іх непаўторныя характары. Нездарма ж пісьменнік Мілан Кундэра называе раман «замкам незабыўнага». Гэта памяць, якая заўсёды жывая. Яна ажыўляе людзей і калізіі нашага жыцця.

***— Як лічыце, чаму айчынныя аўтары ўсё ж такі не спяшаюцца пісаць раманы?***

— З аднаго боку раман дастае глыбіні ўнутранага свету персанажаў, а з другога — гэта жанр дзяржаўны, палітычны. І ў час, калі Беларусь стала незалежнай краінай, літаратура павінна падтрымаць яе незалежнасць менавіта раманамі. Якасным сучасным эпасам, праз які варта паказаць лёс народа на пакручастых калявінах гісторыі: паказаць набыткі, страты, прыгадаць мінулае, зазірнуць у будучыню, ацаніць нашы магчымасці. Гэта вельмі адказны жанр, працаёмкі, ён патрабуе ўсяго. Магчыма, таму пісьменнікі ахвотней бяруцца за навелы, апавяданні.

***— На набыткі якіх творцаў арыентуецеся? Хто для вас — ідэальны раманіст?***

— Ідэальных назваць цяжка. Можа, іх і няма. Хоць кожны пісьменнік у сваёй творчасці імкнецца да напісання ідэальнага твора. Я вельмі паважаю творчасць Кузьмы Чорнага, ён таленавіты пісьменнік-этык, які выдатна ведаў гісторыю, псіхалогію, адчуваў беларускі лёс. З замежных назваў бы Томаса Мана, ён звярнуў увагу не толькі на нашу свядомасць, псіхіку на паверхні, а пайшоў у глыбіню, у падсвядомасць. Сюды дадаў бы амерыканца Уільяма Фолкнера. Яго трылогія «Вёсачка. Горад. Асабняк» — дасканалы твор. Яшчэ прыгадаў бы Джэймса Джойса, Франца Кафку, Марселя Пруста. Захапляюся Іванам Буніным, хоць ён напісаў толькі адзін раман, але несумненна выдатны. У жанравым сэнсе і ў сэнсе паэтыкі ён мне блізкі, бо паказвае не толькі жыццё душы, інтэлекту, думкі. Гэта вельмі пачуццёвы, эмацыянальны твор. Мяне таксама цікавіць і бліжэйшая да нас сучасная літаратура. Вельмі радуюся, калі бачу творчую ўдачу пісьменніка. Напрыклад, усцешылі раманы Пітэра Зюскінда «Парфюмер» і «Імя ружы» Умберта Эка.

**«Класічныя творы напісаныя не толькі на патрэбу аднаго дня, але і на вялікую перспектыву, яны — неацэнная скарбніца нашай духоўнасці, памяці, перажытага».**

***— У чым, на вашу думку, палягае розніца ў творчых падыходах празаікаў XX і XXI стагоддзяў?***

— Сёння ўзрастае індывідуальны пачатак. Ва ўсім: у культуры, літаратуры, мастацтве, у жыцці. Панцке асобнасці, сваёй пячаткі, подпісу мае вялікае значэнне. Гэта пэўнага кшталту знак якасці. І кожны пісьменнік стварае сваю літаратуру. Раней руская, беларуская літаратура маглі ўспрымацца цэласна, як мацярык, прысутнічала нейкая саборнасць. А сёння літаратура складаецца з асобных малекул, якія нібыта звязаныя з іншымі, але кожная — свой свет уяўленняў, каштоўнасцяў, думак, перажыванняў. Хто на што здольны, хто як можа стараецца здзівіць чалавецтва. А здзівіць яго, мне думаецца, немагчыма. Але і ўменне здзіўляцца — гэта таксама талент. Чалавек, пазбаўлены гэтай здольнасці, варты жалю. Гэта сумны чалавек, залішне празаічны, ардынарны. Хацелася б пажадаць усім, каб у іх праявіўся талент любові да жыцця і свету і здзіўлення перад ім.

***— А вас лёгка здзівіць?***

— Мне здаецца, у мяне захавалася магчымасць здзіўляцца — таму, што робіцца навокал, калі здзяйсняецца тое, чаго чакаў. Але што тычыцца майго досведу і ўзросту, я не задавака, я пра сябе сціплай думкі. Няма сэнсу сябе раздуваць. Які ёсць — такі ёсць, заставайся сабой, карыстайся тым, што дала прырода, што адпусціў Бог, бацькі, дзяды. Будзь рады гэтаму, удзячны, лічы, што ты не абдзелены. Я лічу сябе звычайным чалавекам.

**«Сёння літаратура складаецца з асобных малекул, якія нібыта звязаныя з іншымі, але кожная — свой свет уяўленняў, каштоўнасцяў, думак, перажыванняў».**

***— Вы шмат працуеце з аспірантамі, маладымі літаратуразнаўцамі. А тут ці ёсць адрозненне паміж пакаленнямі навукоўцаў?***

— Вядома, сённяшняе пакаленне адрозніваецца ад папярэднікаў. Я не хачу сказаць, што яно лепшае ці горшае. Проста новае. Метадалогія літаратуразнаўства змянілася, ім даводзіцца асвойваць новыя падыходы, дысцыпліны, што суседнічаюць з літаратуразнаўствам. Сённяшнія аспіранты — таленавітыя, яны любяць і літаратуру, і навуку пра яе.

***— А ў якім кірунку варта праводзіць літаратуразнаўчыя даследаванні? Якія тэмы, аспекты яшчэ застаюцца недастаткова вывучанымі?***

— Працы хопіць усім. Трэба наноў пераглядзець гісторыю беларускай літаратуры, асабліва XX стагоддзя. З пункту гледжання дзяржаўнай незалежнасці, суверэннасці, нацыянальнай самабытнасці, міжнароднага культурнага супрацоўніцтва. Варта засведчыць, што мы — паўнавартасныя члены міжнароднай супольнасці. Таму трэба развіваць кампаратывістыку, пісаць пра сувязі нашай літаратуры з замежнымі — кантактныя, якія ёсць з блізкімі суседзямі і славянскім светам, і з далёкімі краінамі — Італіяй, Францыяй, Амерыкай. Варта прааналізаваць і тыпалагічныя сувязі, бо свет, культура развіваюцца па агульных, аб'ектыўных законах, якія ў розных культурах, краінах праяўляюць сябе аднолькава.

***— Сёння часта кажуць пра неабходнасць перачытвання класікі. Няўжо яе сапраўды варта штораз пераглядаць, праводзіць новыя даследаванні даўно вядомых твораў?***

— Класіка мае ўласцівасць працягваць жыццё праз стагоддзі. Як ні дзіўна, гэтыя творы з цягам часу крыху змяняюць сэнс. Магчыма, у семантычным свеце твора штосьці адбываецца, і мы адтуль здабываем новыя думкі, ідэі. Класіка — гэта тое, што жыве, яна ўвесь час нешта нам падказвае. Так, купалаўскую п'есу «Тутэйшыя» паставілі ў часы перабудовы — і твор аказаўся сучасным, рэжысёр яго прачытаў па-свойму ў адпаведнасці з выклікамі часу. Час выклікае ў класіцы новыя аспекты, якія мы раней не бачылі. Магчыма, нават сам аўтар, калі пісаў, іх не бачыў. Гэта таямніца слова, мовы. І сама мова адкрывае ў сабе іншыя сэнсы, падчас узбагачаецца тым, што сустракаецца з новымі рэчамі, з'явамі, шукае для іх новыя найменні, а часам звяртаецца ў архівы, у глыбіні памяці, мінулае. Таму класіка жыве. Гэтыя тэксты створаныя не толькі на патрэбу аднаго дня, але і на вялікую перспектыву, яны — неацэнная скарбніца нашай духоўнасці, памяці, перажытага.

***— У скарбонцы напісанага вамі — больш як дзясятак манаграфій. Якая з кніг для вас найбольш знакавая як для даследчыка?***

— Калі разглядаць работы манаграфічнага характару, то адзначу «Жыццё і творчасць Янкі Купалы». Лічу, што гэта карысная кніга, яна вытрымала некалькі перавыданняў. Тым не менш яе можна было б і ўзбагаціць. Мне здаецца неблагой і кніга пра паэзію «Ад старажытнасці да сучаснасці», тут я пастараўся асвятліць пытанні адметнасцяў паэзіі, беларускай перадусім, як яна развівалася, што сабой стылёва ўяўляе, разглядзець уклад буйных класікаў, такіх, як Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Пятрусь Броўка, Пімен Панчанка, Рыгор Барадулін, Васіль Зуёнак. Варта таксама больш пісаць пра такіх таленавітых сучасных пісьменнікаў, як Уладзімір Саламаха, Мікалай Чаргінец, Георгій Марчук, Генадзь Пашкоў, Алег Ждан, Алена Брава, Таццяна Сівец, Мікола Мятліцкі, Міхась Пазнякоў, Алесь Бадак.

**«У мяне захавалася ўменне здзіўляцца — таму, што робіцца навокал, калі здзяйсняецца тое, чаго чакаў».**

***— Над чым зараз працуеце?***

— Я хацеў бы прааналізаваць тое, як у нашай літаратуры адлюстравалася гісторыя. Пачынаючы ад «Слова пра паход Ігаравы» — я ўпэўнены, што гэты твор напісаў беларус, хоць тады яшчэ не было такой нацыі. Але ж нашы землі існавалі, было магутнае Полацкае княства. Нашы продкі — цікавы пасіянарны народ, і па ўсім відаць, што толькі зямляк мог гэта напісаць. Вельмі цікавыя і летапісы, а таксама творы, прысвечаныя гістарычным дзеячам, тая ж «Пахвала Вітаўту». Адметная літаратура XVI—XVII стагоддзяў, публіцыстыка, што адлюстравала царкоўна-рэлігійную палеміку. Закат надышоў, калі ў дзяржаўным выкарыстанні забаранілі беларускую мову, але літаратура зноў узнялася ў XIX стагоддзі, яе моцна падтрымаў Адам Міцкевіч з паплечнікамі — філаматамі і філарэтамі, значны ўнёсак зрабілі пачынальнікі сучаснай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя... Гісторыя ў літаратуры ў нас багата адлюстравалася. Яе аналіз быў бы разглядам і працэсу фарміравання беларускай нацыянальнай свядомасці, нашага менталітэту. Тэма глыбокая і маштабная, нельга ўсе пытанні вырашыць адразу, але цікава было б зрабіць заяўку.

Таксама хацеў бы напісаць пра чалавека, праблемы маралі, духоўнасці. Я калі падумаю пра сябе — бачу, што і сам нямала перажыў, шмат дзе пабываў, быў у розных жыццёвых пераплётах.

***— Наколькі асоба аўтара звязаная з яго творчасцю? Ці павінен даследчык літаратуры, разглядаючы здабыткі пэўнага пісьменніка, звяртаць увагу на яго асабістыя якасці?***

— Абавязкова. Біяграфія пісьменніка — адна з метадалагічных апораў даследчыка. Гэта ключык для разумення многіх яго твораў. «На ростанях» — гэта ж лёс Коласа, яго духоўная біяграфія. Тут можна згадваць іншых аўтараў, напрыклад Максіма Гарэцкага, Алеся Адамовіча. Біяграфія мае значэнне, таксама як і менталітэт аўтара, яго разуменне маралі, кахання. Важная і мера яго шчырасці: часта бывае, што пісьменнік вельмі закрыты, а ён павінен не саромецца называць рэчы сваімі імёнамі. І творца, які сёння хаваецца за нечым, для мяне мала цікавы. Я паважаю смеласць. Навошта здавацца лепшым, чым ты ёсць? Сёння людзі часта маюць патрэбу ў тым, каб паспавядацца, «дастаць» з сябе нешта з перажытага, даць сабе палёгку. Гэта тонкія рэчы, але несумненна важныя.

***— Ці павінен даследчык быць строгім да сябе?***

— Сваёй душы нельга даваць палёгкі. Гэта адна з характарыстык даследчыка. Гэта творца, які працуе не толькі з 9 раніцы да 5 вечара. Асаблівасць нашай працы ў тым, што ідэі, праблемы, думкі нас ніколі не пакідаюць.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** vesialuha@zviazda.by ■

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| | |
|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | **29 сентября 2016 г. в 14.00 г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет** |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 16, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел. (8-01797) 55-7-35, тел./факс (8-1797) 55-7-36<br>С момента опубликования извещения **до 16.00 27 сентября 2016 г.** в рабочие дни с $8^{00}$ до $13^{00}$ и с $14^{00}$ до $17^{00}$ |
| Порядок осмотра земельных участков на местности | В рабочие дни с $8^{00}$ до $13^{00}$ и с $14^{00}$ до $17^{00}$ |
| Условия проведения аукциона | Наличие не менее двух участников |
| Продавец | Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | Мядельский сельский исполнительный комитет:<br>**г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15-16, тел. (8-01797) 55-7-35, тел./факс (8-1797) 55-7-36** |
| Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе | Размер задатка: 10% от начальной цены. Документы: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации. Реквизиты: р/с 3641061900110 ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601 г. Молодечно, код 769, УНН 600380436, код платежа 04901 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона **в отношении лотов №1, №№3-6** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне |

| ЛОТ №1 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Новая, участок № 4 площадью 0,1320 га (кадастровый номер 624083103601000259).<br>**Начальная цена 30000 (тридцать тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне озера Нарочь на площади 0,1320 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Улица асфальтирована, имеется возможность газификации |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 2272 р. 79 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 1047 р. 34 к.<br>оформление градостроительного паспорта – 924 р. 49 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 63 р.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 237 р. 96 к. |

| ЛОТ №2 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Центральная, площадью 0,2289 га (кадастровый номер 624083103601000247).<br>**Начальная цена 12000 (двенадцать тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии емельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после принятия решения Мядельского сельского исполнительного комитета о предоставлении земельного участка осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне вне прибрежной полосы озера Мястро на площади 0,2289 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Имеется возможность газификации |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 1692 р. 61 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 646 р. 73 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 30 р.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 1015 р. 88 к. |

| ЛОТ №3 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в Азарки-Пудовинка, площадью 0,2500 га (кадастровый номер 624083100601000098).<br>**Начальная цена 5000 (пять тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи, напряжением до 1000 В на площади 0,0020 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Электрические сети, асфальтированный подъезд. Имеется возможность газификации |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 2072 р. 66 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 803 р. 27 к.<br>оформление градостроительного паспорта – 840 р. 36 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 54 р.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 375 р. 03 к. |

| ЛОТ № 4 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Азарки-Дворище, площадью 0,2258 га (кадастровый номер 624083100101000051).<br>**Начальная цена 5000 (пять тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи, напряжением до 1000 В на площади 0,0060 га, охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения на площади 0,0062 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Электрические сети, асфальтированный подъезд. Имеется возможность газификации |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 1922 р. 90 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 803 р. 27 к.<br>оформление градостроительного паспорта – 840 р. 36 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 54 р.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 225 р. 27 к. |

| ЛОТ № 5 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Россохи, У-1 площадью 0,2000 га (кадастровый номер 624083109901000060).<br>**Начальная цена 20000 (двадцать тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением его в водоохранной зоне озера Мядель на площади 0,2000 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Отсутствуют |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 2130 р. 03 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 803 р. 27 к.<br>оформление градостроительного паспорта – 840 р. 36 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 64 р.80 к.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 421 р.60 к. |

| ЛОТ № 6 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Россохи, У-4 площадью 0,1800 га (кадастровый номер 624083109901000058).<br>**Начальная цена 12000 (двенадцать тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением в водоохранной зоне озера Мядель на площади 0,1800 га, охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 В на площади 0,0209 га, охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В на площади 0,0043 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Электрические сети |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 1785 р. 83 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 803 р. 27 к.<br>оформление градостроительного паспорта – 840 р. 36 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 54 р.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 88 р. 20 к. |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 421/U-4237 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное здание хлебозавода), площадью 3290,9 кв.м, расположенное по адресу: г.п. Вороново, ул. Юбилейная, 1В |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 421355100001000087 (назначение – для обслуживания хлебозавода), площадью 0,3623 га, расположен по адресу: г.п. Вороново, ул. Юбилейная, 1В |
| **Начальная цена продажи** | 500 036 р. (пятьсот тысяч тридцать шесть рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 25 002 р. (двадцать пять тысяч два рубля) |
| **Продавец** | Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г.п. Вороново, ул. Калинина, 4, 8-01594-217-83 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | 100% предоплата |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 28 сентября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 22 сентября 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» Дополнительная информация http://grodnoino.by/**

**г. Клецк** **27 сентября 2016 года**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

| № лота | Месторасположение земельного участка, кадастровый номер | Вид аукциона | Характеристика инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Срок аренды, лет | Назначение участка | Условия продажи | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Клецк, ул. Комсомольская, № 622501000020032755 | На право заключения договора аренды | Электроснабжение; асфальтированный подъезд | 0,0035 | 20 лет | Для установки торгового павильона | Осуществление госрегистрации прав на земельный участок в двухмесячный срок после подписания договора аренды, разработка ПСД в течение 6 месяцев после утверждения протокола о результатах аукциона, занятие земельного участка в течение 6 месяцев со дня утверждения ПСД | 1000 | 100 | 1856,76 |

**1. Аукцион состоится 27 сентября 2016 г. в 11 часов в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, каб. 420.**

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели, юридические лица, граждане Республики Беларусь. Аукцион проводится при наличии двух или более участников. Участнику необходимо подать заявление в Клецкий райисполком с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, представляется документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении с отметкой банка, представляется копия паспорта, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителями индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 204; последний день приема документов **26 сентября 2016 г. до 11.00**. Заключительная регистрация участников – **27 сентября 2016 г. с 10.00 до 10.45**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. **Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3641207430710 в ЦБУ № 607 г. Клецк филиала № 620 г. Несвиж ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Клецка, код 523. Получатель – Клецкий райисполком, УНП 600198162.**

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за право заключения договора аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомится с объектом продажи. Контактный телефон в Клецке **(8-01793), 68211 сайт: www.kletsk.minsk-region.by**

# КУПІЦЬ НЫРКІ Ў МАГАЗІНЕ,

ці Якія прафесіі будучыні хутка з'явяцца і што яны ўнясуць у наша жыццё

**Новыя адкрыцці і тэхналогіі ўносяць змены ў рытм чалавечага жыцця, змяняецца і спіс актуальных прафесій. Касмічны гід, біяхакер, адвакат па робаэтыцы — вось толькі некалькі вакансій, якія будуць адкрыты ў найбліжэйшай будучыні, піша nat-geo.ru. Прагноз развіцця рынку працы прадставілі спецыялісты арганізацыі The Future Laboratory пры падтрымцы Microsoft. Яны склалі спіс з 10 прафесій, якія будуць запатрабаваныя ўжо ў 2025 годзе.**



## Дызайнер віртуальнага жылога свету

На думку аўтараў даследавання, віртуальнае жыццё ўсё больш будзе пераважаць над рэальным, а гэта запатрабуе большай увагі да элементаў віртуальнага свету. Людзі, якім не ўсё роўна, як выглядае іх наваколле, звернуцца па дапамогу да прафесіяналаў — так, як гэта адбываецца і сёння пры ўладкаванні сапраўднага дома.

## Адвакат па робаэтыцы

Падзел абавязкаў паміж робатам і чалавекам ужо ў нашы дні з'яўляецца спрэчным пытаннем. Напрыклад, секс з робатам неўзабаве будзе не менш, а то і больш распаўсюджаны, чым традыцыйны. Гэта, у сваю чаргу, спародзіць шэраг этычных праблем, а вырашаць іх будуць адвакаты па робаэтыцы. Ім таксама спатрэбіцца трактаваць прынятыя машынамі рашэнні і абараняць іх.

## Аглядальнік лічбавай культуры

Людзі ўсё менш чытаюць і пішуць, аддаючы перавагу візуальным вобразам. Фотахостынг і сеткі па абмене выявамі, такія як Pinterest або Instagram, растуць хутчэй, чым Facebook, Twitter і іншыя тэкставыя платформы. Для таго, каб карыстальнік не згубіўся ў багацці розных карцінак і відэаролікаў, тысячы прафесіяналаў будуць складаць агляды і рэкамендацыі.

## Біяхакер

Уменне бачыць у цемры, перадаваць думкі на адлегласці або ідэнтыфікаваць асобу па біячыпе з поўнай інфармацыяй — усё гэта вядома па фантастычных фільмах, і ўсё гэта цалкам магчыма ў будучыні. Для таго, каб надзяліць чалавека падобнымі здольнасцямі, спатрэбіцца хірургічнае ўмяшанне, але работы павінен праводзіць не звычайны ўрач, а высакакласны камп'ютарны спецыяліст. Гэтая прафесія называецца «біяхакінг»: тэрмін быў прыдуманы яшчэ ў 1988 годзе, і ўжо ў нашы дні ідэя мае мноства паслядоўнікаў.

## Дызайнер чалавечага цела

У будучыні людзі змогуць жыць па 100 і больш гадоў, а пошук органаў для перасадкі перастане быць праблемай дзякуючы развіццю 3D-друку і іншых тэхналогій. Паводле прагнозаў аўтараў даследавання, ужо праз 10 гадоў можна будзе зайсці ў краму і проста купіць сабе патрэбную частку цела, паколькі яна будзе мець этычнае паходжанне. Такім чынам, спатрэбяцца спецыялісты, якія дапамогуць зрабіць аптымальны выбар, зыходзячы з асаблівасцяў арганізма, колеру скуры і іншых фактараў.

## Адміністратар інтэрнэту рэчаў

У 1999 годзе была сфармуляваная канцэпцыя «інтэрнэту рэчаў» (Internet of Things, IoT). Гаворка ідзе пра вылічальную сетку для фізічных прадметаў («рэчаў»), кожны з якіх абсталяваны ўбудаванымі тэхналогіямі. Разумныя дамы, праца над якімі вядзецца з канца XX стагоддзя, да 2025 года будуць у дзясяткі і сотні разоў разумнейшыя; мноства высокатэхналагічных працэсаў павінны будуць працаваць бесперабойна і без удзелу чалавека. Адпаведна спатрэбіцца і спецыяліст, які будзе распрацоўваць сувязі паміж вялікай колькасцю прылад, прыдумляць новыя камбінацыі «рэчаў», а таксама вучыць людзей карыстацца ўсімі гэтымі дасягненнямі.

## Касмагід

У 2020—2025 гадах падарожжы ў космас стануць звычайнай турыстычнай прапановай, і адной са звязаных прафесій стане экскурсавод, або распрацоўшчык тураў. Ён не абавязкова будзе суправаджаць турыста падчас палёту: першачарговай задачай стане пракладанне найбольш цікавага і бяспечнага маршруту ў космасе, а тэхнічным забеспячэннем паездкі зоймуцца ўжо іншыя спецыялісты будучыні.

## Куратар асобы

Па меры развіцця сацыяльных сетак усё больш звестак і ўспамінаў, якія раней былі здабыткам толькі самога чалавека або яго блізкага асяроддзя, цяпер выносіцца на суд мільёнаў людзей. Аўтары агляду прафесій XXI стагоддзя прагназуюць, што неўзабаве спатрэбяцца спецыялісты, якія дапамогуць карыстальніку адаптаваць гэтыя патокі прыватнай інфармацыі для ўсеагульнага прагляду, сартуючы даныя па меры іх важнасці і сакрэтнасці.

## Інжынеры па аднаўленні натуральнага асяроддзя

Рэсурсы планеты імкліва вычэрпваюцца: ужо цяпер чалавек жыве ў доўг наступнага года. У будучыні ж антрапагеннае ўздзеянне яшчэ больш узрасце. У выніку, акрамя эколагаў і біёлагаў, ва ўмовах спустошанай прыроды будуць патрэбны спецыялісты па аднаўленні натуральных экасістэм, набліжаных да сапраўднай прыроды.

## Наватар устойлівай энергетыкі

Пераход на новыя энергетычныя мадэлі не павінен адставаць ад запатрабаванняў чалавецтва на электраэнергію. Але яны ўвесь час растуць, таму неўзабаве спатрэбяцца вынаходнікі новых спосабаў атрымання энергіі, а таксама спецыялісты па яе эфектыўным размеркаванні і эканоміі.

■ Невядомая планета

# ЗАПРАШАЕМ НА ВУДУ-КІРМАШ!



**Тога — невялікая краіна ў Заходняй Афрыцы. У яе сталіцы Крышане пражывае каля 750 000 чалавек, і тут знаходзіцца адзін з самых вялікіх, незвычайных і жудасных у свеце кірмашоў — Akodessewa Fetish Market, дзе можна купіць усё неабходнае для рытуалаў культу вуду. Амаль палова насельніцтва Тога — паслядоўнікі гэтага культу.**



Культ вуду ў Заходняй Афрыцы мае вельмі старажытныя карані. Ён з'яўляецца традыцыйнай афрыканскай рэлігіяй і асабліва распаўсюджаны ў прыбярэжнай частцы Заходняй Афрыкі ад Нігерыі да Ганы. Напрыклад, у Беніне амаль чвэрць насельніцтва належыць да паслядоўнікаў вудуізму. У свой час еўрапейскія каланізатары прыклалі нямала намаганняў, каб знішчыць гэты культ разам з іншымі традыцыйнымі афрыканскімі рэлігіямі, але традыцыі аказаліся нашмат мацнейшымі. З культам вуду справіцца было асабліва складана, бо вудуісцкія багі свае ў кожнага клана, у кожнай нацыянальнасці і кожнага племені, таму сам культ нагадвае тысячагаловага цмока. Вядома ж, адсекчы кожную такую галаву нават у самага заўзятага барацьбіта з мясцовымі рэлігіямі не было і няма ніякай магчымасці. Таму вельмі многія людзі дагэтуль працягваюць захоўваць веру ў тое, што вуду-талісманы і злавесныя абрады дапамогуць ім абараніць сябе і сваіх блізкіх ад праблем.

Кірмаш Akodessewa Fetish Market прапаноўвае шмат тавараў для правядзення неабходных абрадаў, і яго рэгулярна наведваюць усе мясцовыя знахары. Гэта не проста кірмаш з абрадавым таварам. Яго яшчэ можна назваць і своеасаблівай аптэкай, у якой лекамі з'яўляюцца розныя часткі целаў жывёл, гаючыя зёлкі і адмысловыя статуэткі. Адзін выгляд некаторых з гэтых «лекаў» здольны выклікаць дрыжыкі ў чалавека, мала знаёмага з рытуаламі вуду. Калі падыходзіш бліжэй да пыльных драўляных сталоў гэтага рынку пад адкрытым небам, першае, што кідаецца ў вочы, — гэта груды галоў, хвастоў і іншых частак розных жывёл. Відовішча не для слабанервовых. Да цікаўных турыстаў абавязкова падыдзе мясцовы знаўца вуду і прапануе правесці экскурсію па рынку і падрабязна расказаць, што і для чаго трэба. Гэтыя аповеды бываюць такімі пераканаўчымі, што турыст і вокам міргнуць не паспее, як стане ўладальнікам чыёйсьці сушанай лапы або нават галавы. На гэтым магічным кірмашы прадаўцы безумоўна валодаюць магіяй перакананння, і рэдкі турыст пакідае рынак, не набыўшы хоць бы маленькі сувенір.

У гандляроў ёсць тавар з усёй Афрыкі, і ў чым бы ні былі вашы праблемы, яны абавязкова знойдуць менавіта тое, што трэба для іх паспяховага вырашэння. Для мясцовых знахараў няма нічога немагчымага. Не дзіўна, што калі ўсе разумныя і больш традыцыйныя для цывілізаванага свету спосабы вырашэння праблем бываюць вычарпаныя, людзі звяртаюцца па дапамогу сюды. На гэтым рынку абавязкова прапануюць сродак, які дапаможа ад бясплоддзя, калі любая медыцына бяссільная; сродак, які зробіць з вас алімпійскага чэмпіёна; сродак, які гарантуе поспех вашаму бізнесу і г.д. Дасягнуць жаданага выніку вельмі проста: трэба ўсяго толькі ўцерці ў парэзы, зробленыя на скуры «пацыента», парашок з травы і высушаных частак жывёл. Але дзеля жаданай мэты можна і патрываць, і рызыкнуць ■


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| Продавец | **Минское районное потребительское общество,** г. Минск, ул. Бровки, 24 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин** | 104,4 кв.м | 600/С-103784 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, д. Заболотье |
| Составные части и принадлежности: сарай, уборная | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0820 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина. | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 38 500 руб. 00 коп.** (385 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание магазина №70** | 92,1 кв.м | 600/С-134991 | Минский р-н, Михановичский с/с, д. Михановичи |
| Составные части и принадлежности: две пристройки, сарай, крыльцо, рампа | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0581 га предоставлен на праве аренды сроком по 07.11.2041 для обслуживания здания магазина №70 с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 17 000 руб. 00 коп.** (170 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Здание магазина** | 71,1 кв.м | 600/С-150281 | Минский р-н, г. Заславль, ул. Приморская, 1А |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0156 га предоставлен на праве аренды сроком по 06.08.2042 для обслуживания здания магазина с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов). | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 14 900 руб. 00 коп. (снижена на 60%)** (149 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона по лоту №3 опубликовано **в газете «Звязда» от 23.04.2016.** | | | |
| **Аукцион состоится 30.09.2016** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 29.09.2016** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by** | | | |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| Продавец | **Мядельское райпо,** Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Здание магазина «Хозтовары»** | Здание специализир. розничной торговли | 165,7 кв.м | 633/С-13214 | Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Полевая, 10А |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен Продавцу пл. 0.0545 (га) на праве аренды (срок действия по 08.01.2113) для обслуживания зданий и сооружений магазина «Хозтовары». | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 10 000 руб. 00 коп.** (100 000 000 бел. руб.) | | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия. | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **30.09.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **29.09.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | | | |

**ОАО «Стройдетали»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 7 сентября 2016 года ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА**
**по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134, зал заседаний.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. Внесение изменений в устав общества.
2. О выплате дивидендов.

Списки акционеров на участие в собрании – по состоянию реестра на 1 сентября 2016 года.
Начало собрания **в 10.00.**
Время регистрации – **9.00 – 9.50.**
**Для регистрации акционерам иметь при себе паспорт.**
**Представителям акционеров – паспорт и доверенность.**
Справки по тел. (8-01771) 2-25-01, 2-25-10.
УНП 600246748

Усё пра Еву

## ■ Нататкі Яго жонкі

**Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса
«Маладосць»**

# МОЦНЫ ПОЛ



Часопіс «Маладосць» надрукаваў нядаўна пераклад артыкула амерыканкі Сандры Ньюман пра мужчынскія слёзы — з'яву, якой, канстатуе аўтарка, не існуе ў прыродзе гадоў дзвесце, бо яшчэ ў XVIII стагоддзі назіральныя асобы пачалі падазраваць, што мужчыны ўвогуле не маюць слёзных залоз.

Спадарыня Сандра ў сваім грунтоўным артыкуле канстатуе знікненне мужчынскага плачу і задаецца лагічным пытаннем: куды ж падзелася гэтае высакароднае дзейства, дзе яго можна шукаць? А папярэдне яна так падрабязна распісвае хныканні рыцараў, усхліпы парламентарыяў, плачы манахаў і рыданні закаханых, што нават чытачу-мужчыну не сорамна праслязіцца. Уніклівая амерыканка сабрала, здаецца, усе слёзы мужчынскага свету ў адну вялікую клятчастую насоўку і выціснула ў флакон з вузкім рыльцам. Праз яго туды сярод іншых трапілі слёзы цара Прыяма, занатаваныя Гамерам, слёзы заснавальніка езуіцкага ордэна Ігнацыя Лаёлы, засведчаныя ім самім у дзённіку, слёзы святога Аўгусціна, рыцараў караля Артура, спікера Эдварда Коўка... шмат розных іншых слёз. Пасля Сандра Ньюман падзяліла ўсе гэтыя слёзы на асобныя кроплі: падрабязна распісала, якая мужчынская сляза з якога вока выцякала і з якой прычыны.

Сандра Ньюман, я вам скажу, малайчынка. Знікненне мужчынскіх слёз яна звязала з узнікненнем дэпрэсіі, алкагалізму і іншай, прабачаюся, трасцы. І заклікала ўсіх — і мужчын, і жанчын — «адкрыць шлюзы»: аб'ядноўвацца і плакаць да мокрых рукавоў, бо «той пажынае з радасцю, хто сее са слязьмі».

Але Сандра Ньюман не сказала галоўнага: калі плакалі мужчыны, наўрад ці плакалі іх жанчыны. У іх проста не было ў тым патрэбы. Яны ведалі, што і іх слёзы шчодра выплакваюцца моцнымі «палавінкамі», таму не варта ім самім марнаваць на гэта час, а можна спакойна займацца цыраваннем панчох. Шчаслівыя выбранніцы моцных шчасліўцаў.

Вось! Вось жа яна, святая праўда і простая ісціна! Яна ў тым, што слёзы — гэта прыкмета сілы, а не слабасці, як нам упарта даводзілі і як магло здавацца ўсе гэтыя дзвесце гадоў, па працягу якіх рыдаюць, хныкаюць, усхліпваюць і заліваюцца слязьмі не мужчыны, а жанчыны. Жанчыны замест мужчын. Так-так, замест. І што тут яшчэ даказваць? Ну добра, я дакажу.

Вы самі ведаеце, з якіх прычын жанчыны лёгка пускаюць слязу. Набор наколькі разнастайны, настолькі ж і прымітыўны: падпаліла каструлю, а яна не хоча ачышчацца; не хапае грошай на новую сумачку, а ў каляжанкі, як на злосць, з'явілася такая, што хоць плач; у пад'ездзе перагарэла лямпачка — і як было не выцяцца нагою аб прыступку; сын паступіў — паступіў! — у каледж... Але якая, скажыце, жанчына будзе плакаць, а не валачы на сабе свайго мужа, калі на той самай прыступцы ён зламае нагу? Якая жанчына будзе плакаць, не маючы грошай, каб заплаціць за вучобу дзіцяці ў тым самым каледжы? Плакаць — у сэнсе «сядзець склаўшы рукі», расказваць пра свае беды Гамеру, занатоўваць іх у дзённік — ніякая жанчына не схільная і не здольная. Жанчыны над праблемамі не плачуць — яны, ледзь сутыкнуўшыся з імі, адразу пачынаюць іх вырашаць. А гэта само па сабе азначае, што жанчыны і ёсць моцны пол

■

## ■ Паміж намі

# ТАК БЫВАЕ,

## або Звычайная гісторыя, якая адбылася на пачатку лета

...Замкнуўшыся ў кабінеце, я прыхілілася да сцяны і заплакала — зусім па-дзіцячы, размазваючы па шчоках ручайкі з рэшткамі тушы (вадастойкай, між іншым). Мой каханы, яшчэ нядаўна такі блізкі і родны, цяпер здаваўся мне далёкай зоркай Сірыус, бліскучай і халоднай... Пасля яго паспешлівых уцёкаў адразу навалілася процьма праблем. Па-першае, трэба было заказаць талончык да ўрача, каб вызначыцца з тэрмінам і часам «Ч». Па-другое, адпрасіцца на пару дзён у шэфа, выдумаўшы якую-небудзь важкую прычыну — бо не хапала яшчэ, каб па офісе папаўзлі чуткі. Па-трэцяе, папрасіць у Лёшы (Аляксея Пятровіча) з суседняга кабінета прачытаць маю квартальную справаздачу, бо я цяпер у такім стане, што магу не заўважыць відавочных памылак, а Лёша — чалавек сур'ёзны і ўдумлівы, і праца для яго заўсёды на першым месцы, і на другім, і на трэцім... (якая я ўсё ж злючка!).

Рэальнасць здалася настолькі невыноснай, што вадаспад, які браў пачатак у маёй душы і выходзіў вонкі праз вочы, зноў узмацніўся. Я прыгадала, як тыдзень таму мой каханы выпадкова заехаў да мяне на працу. Ён сядзеў на падаконніку ў маім кабінеце і курыў цыгарэту «Кэмэл», страсаючы попел у вазон з архідэяй. Я глядзела на яго знізу ўверх. Не таму, што маё крэсла знаходзілася ніжэй за падаконнік, а таму, што гэта быў МОЙ КАХАНЫ, і я абагаўляла яго (падумаеш, архідэя)...

Ён пазіраў то на гадзіннік, то на «фольксваген», прыпаркаваны недалёка ад уваходу ў офіс. Гэта азначала, што маё маўчанне пачынае яго раздражняць.

Я пазірала на шуфляду стала, дзе ляжала некалькі накіраванняў на розныя аналізы, і на свой жывот, па якім яшчэ нічога нельга было заўважыць. І думала, як сказаць пра свой сакрэт. Спакойна, без лішняга хвалявання, каб ён ад радасці не зваліўся з падаконніка...

«Табе не здаецца, — пачала я здалёк, — што мы сталі рэдка сустракацца?»

Унізе бразнулі аўтамабільныя дзверцы. Мой каханы рэзка развярнуўся, выпісаўшы рукой мудрагелістую траекторыю, і прыліп носам да шкла. Вазончык з архідэяй, які аказаўся якраз паміж пунктамі А і В гэтай траекторыі, зваліўся на падлогу... Рука з цыгарэтай бездапаможна павісла ў паветры.

«Ну вось, прасіў жа цябе пераставіць гэты чортавы кветкі... Куды загадаеш цяпер страсаць попел?»

«Мы сталі рэдка сустракацца», — паўтарыла я, цудоўна разумеючы, што ніводнаму мужчыну не падабаецца, калі яго тыцкаюць носам у тое, пра што ён і так добра ведае.

«Ну, разумееш... Людзям часам трэба аддаліцца адно ад аднаго, каб потым сустрэцца, як у першы раз. Гэта адныўляе пачуцці...»

«Але ж мы і так бачымся два разы на месяц, — канькала я. — А нам неабходна часцей бываць разам, таму што... Таму што...»

«Ты цудоўна ведаеш, што я працую на дзвюх работах, — ён павысіў голас на адзін тон. — Са скуры лезу, каб дагадзіць і аднаму шэфу, і другому. Машына таксама патрабуе ўвагі — то рамонт, то тэхабслугоўванне... І ўвогуле — калі людзі паважаюць адно аднаго, яны імкнуцца не абцяжарваць адно аднаму жыццё, не ствараць лішніх праблем. Разумееш? Так што або ўспрымай мяне такім, які я ёсць, або... не ўспрымай зусім».

Ён яшчэ раз, але ўжо заклапочана, паглядзеў на гадзіннік, саскочыў на падлогу і паходкай дзелавога чалавека пайшоў да шафы. Мне захацелася кінуцца за ім, ухапіцца за руку, закрычаць, спыніць, нікуды не пусціць. Ды гарыце вы гарам, дзве работы разам з двума шэфамі і машынай! У мяне будзе дзіця, і я не хачу падарыць свету яшчэ адну сацыяльную сіротку.

Замест гэтага я спакойна падышла да шафы і расчыніла яе. Ён накінуў куртку, шчоўкнуў замком сумкі, адчыніў дзверы і ўздыхнуўшы, як мне падалося, з палёгкай, пацалаваў мяне ў лоб. «Не сумуй, яшчэ сустрэнемся».

...Ад установы, дзе кожны дзень дзясяткі дурніц, падобных да мяне, пакідалі сваіх ненароджаных дзяцей, у мяне засталося адчуванне холаду. Канец вясны быў вельмі вільготным і ветраным. У дадатак санітарка паклала на мой жывот грэлку з лёдам, ад чаго я ўсю ноч трэслася і ляскатала зубамі. Дзякуй суседцы па палаце — сваякі перадалі ёй гарачую каву ў тэрмасе і цёплы плед, якім мы накрываліся па чарзе...

Раніцай я не вытрымала і патэлефанавала яму. Ён спытаў: «Што табе трэба? Гавары хутчэй, у мяне людзі».

Я адказала, што мне холадна і я хачу, каб мяне сагрэлі.

«Гэта ўсё? — са здзеклівай ветлівасцю пацікавіўся ён. — Ці што-небудзь яшчэ?»



Я паклала трубку.

А потым пачаліся будні. Звычайныя, шэрыя і аднолькавыя, як кроплі вады. Свят для мяне не існавала. І калі яны ўсё ж надыходзілі, я адключала тэлефон і ўключала тэлевізар. Да таго ж я пачала катастрафічна худзець — знік апетыт. Некуды знікла і жаданне падабацца мужчынам. Не тое каб мужчыны здаваліся мне пачварамі. Проста ўсе яны аб'ядналіся ў адну бясполую істоту, якая не выклікала ніякіх эмоцый.

Некалькі разоў сябры спрабавалі выцягнуць мяне «ў людзі», папярэдне акультурыўшы мой знешні выгляд. Дарэмна. Мая прысутнасць наганяла нуду на любую кампанію. І ўрэшце яны махнулі на мяне рукой.

Так мінулі лета, восень і зіма. Я правяла іх, хаваючыся ад знаёмых, зводзячы да мінімуму зносіны з імі. А потым надышла вясна. Самая звычайная вясна, нічога асаблівага. Навокал усё зелянела. Я таксама хадзіла зялёная і хісталася ад ветру. Урач сказала: «Авітаміноз, мілачка. Купіце сабе лімонаў». Я паслухалася і паехала на рынак...

Лімон аказаўся такім кіслым, што ад яго на імгненне заклала вушы, а з вачэй пакаціліся слёзы. Але мяне ўразіла іншае — я адчула яго смак! Гэта адчуванне было такім новым, быццам я толькі сёння нарадзілася на свет.

...А ў метро да мяне нечакана падышоў Лёша (той самы, з суседняга кабінета) і вельмі сур'ёзна спытаў: «А ты ведаеш, што тут не дазваляецца есці лімоны?» Я паглядзела ў яго пранізліва блакітныя, як сакавіцкае неба, вочы і нечакана для сябе весела адказала: «Па-мойму, ты нешта пераблытаў. На дзвярах напісана, што ў метро забаронены ўваход з марожаным, а пра лімоны — ні слова».

Ён засмяяўся, падхапіў маю сумку, набітую «вітамінамі», і ў маёй галаве не з'явілася звыклых думак пра бясполую істоту, што таксама было дзіўна.

«Якая ты худзенькая, — здзівіўся ён. — Баюся, з сённяшняга дня мне давядзецца насіць цябе на руках».

«А як жа наконт машыны?» — удакладніла я.

«У мяне няма машыны», — адказаў ён.

«А ты выпадкова не працуеш на дзвюх работах?» — не супакойвалася я.

«Магчыма, я нешта страчваю ў тваіх вачах, але работа ў мяне адна», — мужна прызнаўся ён.

«Ура!» — сказала я.

«Чаму ўра?» — не зразумеў ён.

«Таму што ў мяне засталося толькі адно пытанне: ці няма ў цябе звычкі страсаць цыгарэтны попел у вазончыкі з кветкамі?»

Пагладзеўшы на мяне зацікаўлена, ён усміхнуўся: «Ведаеш, я ўвогуле не куру».

І далей мы пакрочылі разам. Таму што прайшла мая «хвароба». Таму што скончылася зіма, і жыццё пачалося спачатку. І аказалася, што яно цудоўнае... Так бывае. Трэба толькі дацярпець...

**Ала БЫВЫЛАВА**

■

## ■ Гісторыі з канверта

# Як на бочцы з порахам

«Людзі, якім я расказваю пра нашы з мужам адносіны, пацікаюцца здзіўлена плячыма: маўляў, як ты церпіш? Я і сама ўвесь час шукаю і не знаходжу адказу на гэтае пытанне. Пазнаёміліся мы пяць гадоў таму, абое былі ўжо не дзеці — мне 30, яму 34, у абаіх за спінай па няўдалым шлюбе. Пачалі сустракацца. Жэня неяк прызнаўся, што не верыць у жаночае пастаянства. У яго, маўляў, быў сумны вопыт, і нават не адзін. Я сказала, што пастараюся яго не расчараваць. Мне і насамрэч здавалася, што нарэшце сустрэла разумнага, моцнага, надзейнага мужчыну, з якім і ў агонь, і ў ваду.

Мы знялі кватэру, пачалі жыць разам. Якое гэта было шчасце — прачынацца разам з ім, гатаваць сняданак, чакаць з працы, размаўляць да паўночы, цалавацца да адурэння... Але... Чым больш блізкімі мы станавіліся, тым больш падазроным ён рабіўся. Я ўжо змірылася з пытаннямі «Дзе?», «Калі?», «З кім?» і амаль не рэагавала на іх. Нават прыемна было спачатку, што раўнуе. «Ты не можаш быць настолькі добрай, — гаварыў ён. — Ты прыкідваешся!» А я не прытваралася, я проста кахала яго... Праз некаторы час ён пачаў піць. Знікаў на два-тры дні, потым з'яўляўся сярод ночы і пераварочваў пакой у пошуках сведчанняў здрады. Ён чакаў ад мяне пэўнай рэакцыі, пакаяння ў грахах, але я заставалася спакойнай. Тады Жэня пачаў заляцацца да маіх сябровак. Мог пры мне



абняць каго-небудзь, пасадзіць на калені, мог за апошнія грошы павезці дадому на таксі... Магчыма, я не вытрымала б, але паміж усімі гэтымі выбрыкамі ў нас былі цудоўныя перыяды — з кветкамі, пяшчотнымі прызнаннямі, катаннем па начным горадзе... А потым у яго зноў пачынаўся «галівуд».

Апошнія паўгода я жыву як на парахавой бочцы — кожны дзень у чаканні выбуху. Пахудзела, часта раздражняюся па дробязях. Магчыма, вы будзеце смяяцца, але мне здаецца, што такім чынам ён выпрабоўвае мае пачуцці, таму што не можа паверыць у іх да канца. Вытрымаю, выцерплю — значыць, сапраўды кахаю... Але ж і я не жалезная. Столькі разоў спрабавала гаварыць з ім, тлумачыць, што мне ніхто не патрэбен, акрамя яго. Ён спачатку становіцца на калені і просіць дараваць, а праз некалькі дзён усё пачынаецца спачатку... Атрымліваецца нейкае замкнёнае кола, і як з яго вырвацца, не ведаю...

**Святлана**, *г. Гродна*

■







Хто на лёс няшчасны скардзіцца,
На таго і беды валяцца.

* * *

Каб кепска не было самому,
Балюча не рабі нікому.

* * *

Там добра гасціоецца, п'ецца і есца,
Дзе гумару, жартам і песням ёсць месца.

* * *

Пакуль заляцаўся — салаўём заліваўся,
А як ажаніўся — на спевы забыўся.

* * *

Прыемна ўвага і каню —
Усе шануюць дабрыню.

* * *

Мець грошы будзеш у запасе,
Калі на хлебе жыць ды квасе.

* * *

Хітруноў асцерагайся,
На адлегласці трымайся.

* * *

Хто ные, стогне ды ляжыць,
Да таго бяда бяжыць.

**Людміла ЮШЫНА,** *г. Гомель.*

Ганна АТРОШЧАНКА

## НЕЧАКАНЫ БАРТАР

*Іранеска*

Званок у дзверы быў доўгім і настойлівым. Цётка Вера, адклаўшы ўбок сваю вышыўку, паціху патупала ў калідор. Гучна запыталася:

— Хто там?

— Гандлярка. Адчыніце дзверы, калі ласка!

— Якая яшчэ гандлярка? — строга спытала жанчына.

— Вулічная. Не бойцеся! Адчыняйце. Можа, нешта і купіце ў мяне.

Пачуўшы за дзвярыма звонкі голас сваёй суседкі, Вера, крыху паразважаўшы, адчыніла. Бо чаго баяцца, калі і Наста там? Яна абы-куды не палезе.

І сапраўды: на лесвічнай пляцоўцы, побач з суседкай, стаяла чарнявая карабейніца. Вера неадназова бачыла, як такія ж вулічныя гандляркі з вялізнымі торбамі за плячыма гойсалі па гарадскіх дварах. Цыганкі настойліва прапанавалі свой тавар жанчынам, якія ў гэты час сядзелі на лаўцы. Чаго там толькі не было! І пасцельная бялізна, і дзіцячыя штонікі, і халаты на любы густ... Вядома ж, гараджанкі глядзелі, цікавіліся. Некаторыя нават штосьці і куплялі.

Суседка жвава павярнулася да Веры і залапатала:

— Вось, купіла сабе новы халат! І каштуе не надта шмат. Стары ўжо зусім стаў непрыдатны. Зірні!

Вера пахваліла суседку за набытую абноўку і зазначыла:

— Але ж мне гэтая рэч не патрэбна. У шафе ляжыць другі халат, зусім новы.

— Тады купляйце нешта іншае, — хуценька затараторыла маладая цыганка. — Вось гэтыя хатнія тапачкі. Зручныя, мяккія...

Вера кінула вокам на тавар і цвёрда адказала:

— Нічога мне не трэба. Усё, што вы прапанавалі, у нас ёсць. І грошай лішніх не маем на такое.

Цыганка пільна прыглядзелася да Веры і прапанавала:

— Тады давайце зробім абмен.

— Які? — здзівілася цётка.

— Я вам аддам дзве цёплыя коўдры, узімку мёрзнуць не будзеце. А вы мне... Зубы ж у вас, мяркую, залатыя?

Ад нечаканасці ў Веры аж мову заняло. Як можна было даўмецца да такога бартару? Жанчына моўчкі падалася ў прыхожую па венік. Убачыўшы гэта, спалоханая цыганка, падхапіўшы свае торбы, быццам мячык, пакацілася ўніз па лесвіцы...

*г. Гомель.*




Міхась МІРАНОВІЧ

### Несправядлівасць

— Чаму так заведзена,
Сват? —
Размова ідзе
Між мужчынамі. —
Хаця
Болей любім дзяўчат,
Ды жыць выпадае
З жанчынамі!



### Кабета ў хаце

Бабыль Пятрок
Казаў Ігнату:
— Каб адзіноту
Разагнаць,
І я б прывёў
Кабету
ў хату,
Ды потым
Як яе прагнаць?!



### У разведку

Ён шмат слоў крыўдных
Для кагось знайшоў:
— Не, у разведку
З ім бы не пайшоў!
Спытацца захацелася:
— Нябога,
А ці пашлюць
туды
Цябе
самога?..



### Саломы не хопіць

— Каб
знаў,
Саломкі
б там
Паслеў
падкласці.
А дзе б ты змог,
Дазволь спытаць,
Саломы гэтулькі
Дастаць?..



### Заканамернасць

Чамусь не можам
Зразумець,
Асэнсаваць
Зусім не ў
стане:
Чым больш
сяброў
Мы будзем
мець,
Тым менай ворагаў
Ў нас
стане!



### Не дачакалася

Бытуе версія
Такая,
Што шчасце
Кожнага чакае.
А што ж з маім,
Скажыце, сталася?
Чаму мяне
Не дачакалася?..

*г. Віцебск.*



## Спарышы для душы

Ці варта хваліцца былым,
Калі яно знікла, як дым?

Языком ён меле гожа,
Ды нічога сам не можа.



Наш грамадзянскі шлюб, пагодзішся са мной,
Ужо зрабіўся грамадзянскаю вайной.

Сам з сябе смяецца: «Вось дык я!
Злодзей змог кішэнь пачысціць злодзея!»

Віно — атрута, шкода, звада,
Чаго ж яму так горла рада?



Як смак знаходзіш у гарэлцы,
То не шукай яго ў талерцы.



Спаць прыемна летам
на дварах,
Ды не дрэмлюць ноччу
камары!



**Алесь КОРНЕЎ,** *г. Баранавічы.*




Малюнак Алега КАРПОВІЧА.

■ Подыум

# АЛЬТЭРНАТЫВА ШЛЮБНАЙ СУКЕНЦЫ

## У краіне ўпершыню прайшлі дні вясельнай моды

**У Еўропе паказы вясельнай моды праходзяць кожны сезон. Нарэшце гэта традыцыя дайшла і да нас. Упершыню ў Мінску, у рамках паказаў Wedding Days Belarus Fashion Week, беларускія вясельныя салоны прэзентавалі новыя калекцыі сукенак. Свае бачанне сучаснай нявесты прадставілі такія брэнды, як Papilio, Fler, Ганна Краснер, Florence, Vira Lilium, Merri, Strekoza.**

Вядома, вясельная мода крыху кансерватыўная. А-сілуэты, пышныя спадніцы, шлейфы, карункі... Але дызайнеры спрабуюць кожны раз прыўнесці нешта новае ў класічную белую сукенку.

Напрыклад, пагуляць з колерам. Для арыгінальных нявест, якія ўпэўнены, што белая сукенка — гэта занадта сумна, дызайнер Vira Lilium (Мінск) прапануе прымераць уборы перламутравых адценняў. Візіткай брэнду з'яўляюцца гарсэты, у якіх фігура набывае прывабную форму пясочнага гадзінніка і выглядае неверагодна вытанчана.

Яшчэ адзін колер, які можа стаць альтэрнатывай класічнаму беламу, — гэта цялесны. Сукенкі, выкананыя ў такім адценні і расшытыя белымі карункамі, прадставіла гандлёвая марка Fler (Мінск). Што да фасонаў, то брэнд падхапіў моду на глыбокія дэкальтэ і паўпразрысты верх. Ёсць і папулярныя ў апошнія гады сукенкі сілуэта «русалка». Праўда, Fler — бадай, адзіны салон, які забраў гэтую мадэль у наступны сезон: астатнія беларускія дызайнеры аддалі перавагу больш звыклым прамым і пышным спадніцам.

Гродзенскі салон Merri прадставіў элегантныя сукенкі ў рэтрастылі. Калекцыя «Restyling» — гэта адкрытыя спінкі, ручная вышыўка і акуратныя белыя гузікі спераду ліфа. Цікавы варыянт для нявест з добрай фігурай — сукенка з раздзельным карункавым верхам.

Для дзяўчат, якія любяць мінімалізм, салон Papilio (Брэст) прапануе ўборы са шчыльнага атласу амаль без дэкору. Здаецца, менавіта ў такіх сукенках выходзяць замуж сапраўдныя каралевы. А для прынцэс брэнд падрыхтаваў лёгкія шыфонавыя мадэлі з паўпразрыстымі ліфамі, упрыгожанымі карункамі ці танюткімі ніткамі шклярусу. У сукенцы адчуваеце сябе некамфортна? Можна пайсці замуж у касцюме са штанамі! У камплекце з кашуляй са шлейфам выглядае стыльна і арыгінальна. Салон прадумаў нават, у чым дзяўчатам сустракаць першую шлюбную ноч. Ці правесці фотасесію пад назвай «Зборы нявесты». Доўгія пеньюары па шыкоўнасці нічым не саступаюць вясельным сукенкам.

Што да аксесуараў, то беларускія дызайнеры рэкамендуюць нявестам у наступным сезоне выбіраць фату са шлейфам, абадкі з шыфонавымі кветкамі і белыя стужкі-чокеры.

**Кіраўнік аргкамітэта BFW Яніна ГАНЧАРОВА** расказала, што айчыннымі вясельнымі сукенкамі цікавяцца не ў адной Беларусі. На паказы толькі праз аргкамітэт акрэдытавалася каля 60 кампаній, у тым ліку з Расіі, Украіны, Літвы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*







Фота Надзеі БУЖАН.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## строительства объекта «Строительство группы жилых домов неповышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной». Дом № 1 по генплану (2 очередь строительства)

**Информация о застройщике:** «Приорбанк» Открытое акционерное общество («Приорбанк» ОАО), зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь 12 июля 1991 г., регистрационный номер 12.

Юридический адрес и местонахождение: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Режим работы: понедельник – четверг с $8^{30}$ до $17^{30}$, пятница с $8^{30}$ до $16^{15}$, обеденный перерыв с $12^{30}$ до $13^{15}$, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

В течение трех предшествующих лет «Приорбанк» ОАО как заказчик принял участие в строительстве следующих объектов недвижимости:

в 2015 году – «многоквартирный жилой дом № 2 по генплану в составе объекта «Строительство группы жилых домов неповышенной комфортности в квартале улиц Корш – Саблина — Л. Беды — Белинского — Восточной 1 очередь строительства», г. Минск».

**Информация об объекте строительства.**

**Цель строительства:** исполнение условий заключенного с Минским городским исполнительным комитетом договора от 12 октября 2009 г. № 258-Д на реализацию права проектирования и строительства группы жилых домов неповышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л.Беды – Белинского – Восточной.

**Этапы и сроки реализации объекта строительства:** первый пусковой комплекс строительства – общестроительные работы жилой части здания секции 5, 6, 7, 8, техническое подполье всего здания, технический этаж секции 5, 6, 7, 8, отделка мест общего пользования, сантехнические, электромонтажные, пусконаладочные и отделочные работы жилой части секции 5, 6, 7, 8 в полном объеме согласно проектной документации, наружные стены и технические помещения встроенных помещений под данными секциями, несущие конструкции и перекрытие пристроенной гараж-стоянки для организации дворовой территории; второй пусковой комплекс строительства – общестроительные работы жилой части здания секции 1, 2, 3, 4, технический этаж секции 1, 2, 3, 4, отделка мест общего пользования, сантехнические, электромонтажные, пусконаладочные и отделочные работы жилой секции 1, 2, 3, 4 в полном объеме согласно проектной документации, наружные стены и технические помещения встроенных помещений под данными секциями, несущие конструкции и перекрытие пристроенной гараж-стоянки для организации дворовой территории; третий пусковой комплекс строительства – гараж-стоянка общей площадью 6328,54 квадратного метра; четвертый – четырнадцатый пусковые комплексы строительства – административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра.

Первый пусковой комплекс строительства: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – июнь 2016 г.

Второй – четырнадцатый пусковые комплексы: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – май 2017 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертные заключения от 6 августа 2010 г. № 895-15/10 и от 4 февраля 2015 г. № 67-15/15, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Разрешение на производство строительно-монтажных работ:** разрешение на производство строительно-монтажных работ от 30 декабря 2015 г. №2-207Ж-001/15, выданное инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску.

**Местонахождение объекта строительства**: г. Минск, Советский район, в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Характеристика объекта строительства**: жилой дом состоит из 8 жилых секций, из которых 1, 5, 8 – 10-этажные и 2, 3, 4, 6, 7, 12-этажные. Конструктивная схема здания – монолитный каркас с шагами колонн от 2,3 м до 7,2 м со сплошными плоскими монолитными перекрытиями толщиной 200 мм. Здание с теплым техническим чердаком и техническими надстройками, в которых расположены машинные помещения лифтов и венткамеры подпора воздуха. Под домом запроектировано техническое подполье, в котором размещаются тепловые пункты, насосная пожаротушения, ЛВС. Техподполье имеет три самостоятельных выхода. Высота технического подполья 2,3 м обусловлена возможностью подключения здания к наружным сетям. Общая площадь квартир: однокомнатных от 43,15 до 54,09 кв.м; двухкомнатных от 63,51 до 78,39 кв.м; трехкомнатных от 83,48 до 100,02 кв.м. Количество квартир на этаже – 4. Высота жилого этажа от пола до пола 3 м. Во всех квартирах запроектировано устройство летних помещений (остекленных лоджий и балконов). В квартирах, расположенных на 6 этаже и выше, в качестве второго эвакуационного выхода приняты выходы на лоджии и балконы с глухими простенками шириной 1,2 м. На 1 этаже расположены встроенные административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра с входами со стороны основных транспортных и пешеходных потоков. Для маломобильной группы населения при входах в эти помещения предусматриваются пандусы. Входы в жилье осуществляются со стороны дворовой территории. На первом этаже 8 секции предусмотрены помещения товарищества собственников. Естественное освещение обеспечивается нормативным удалением дома от прилегающей застройки с учетом инсоляции, а также оптимальным соотношением площадей окон к площадям помещений. Дом оборудован лифтами, мусоропроводом. Кровля плоская с внутренним водостоком. Окна – из ПВХ профиля с двухкамерными стеклопакетами. Под дворовой территорией предусмотрено размещение подземного одноэтажного гаража-стоянки на 181 машино-место. Объемно-планировочное решение гаража-стоянки предусматривает устройство двух отсеков на 91 и 90 машино-места, разделенные противопожарной преградой с тамбур-шлюзом между ними. Каждый отсек имеет два выезда – один непосредственно наружу, второй – через соседний отсек. Выходы для людей предусмотрены через лестничные клетки и по въездным пандусам. В жилом доме предусмотрена аварийная противодымная вентиляция для удаления дыма при пожаре из коридоров и подача наружного воздуха из шахты лифтов. Вентиляция: в квартирах – естественная; во встроенных помещениях – естественная и механическая. Электроснабжение: разводка электропроводки с установкой электросчетчиков по квартирам и встроенным помещениям. Холодное и горячее водоснабжение: в квартиры и встроенные помещения устанавливаются счетчики холодной и горячей воды, регуляторы давления и устройства пожаротушения. Отопление: в квартирах – двухтрубная система отопления с установкой радиаторов и счетчиков учета тепла для каждой квартиры; во встроенных помещениях – горизонтальная однотрубная система отопления с установкой радиаторов и теплосчетчиков для каждой организации, потребляющей тепло. Телефонизация, радиофикация, телевидение: поквартирная разводка. Внутренняя отделка только мест общего пользования (общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы). Внутренняя отделка жилых помещений и встроенных помещений: стены, потолки, полы — без чистовой отделки. Дверные блоки: наружные – металлические; межквартирные – деревянные; межкомнатные – не устанавливаются.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства:** второй пусковой комплекс строительства – 20 единиц; 5 административно-торговых помещений; 10 машино-мест.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц следующие квартиры второго пускового комплекса строительства: двухкомнатные квартиры – 10 единиц; трехкомнатные квартиры – 10 единиц.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан и юридических лиц 5 административно-торговых помещений №№ 2, 3, 4, 6, 11.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан и юридических лиц 10 машино-мест.

**Цены на объекты долевого строительства:**

второй пусковой комплекс строительства: Стоимость 1 (одного) квадратного метра **двухкомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **2 200** (две тысячи двести) белорусских рублей. Стоимость 1 (одного) квадратного метра **трехкомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **2 200** (две тысячи двести) белорусских рублей;

стоимость 1 (одного) квадратного метра административно-торговых помещений составляет 1500 (одна тысяча пятьсот) долларов США, включая НДС, по официальному курсу белорусского рубля, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день внесения платежа. При единовременном заключении договоров создания объекта долевого строительства на все административно-торговые помещения №№ 2, 3, 4, 6, 11 стоимость 1 (одного) квадратного метра составляет 1200 (одна тысяча двести) долларов США, включая НДС, по официальному курсу белорусского рубля, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день внесения платежа;

стоимость 1 (одного) машино-места составляет **30 000** (тридцать тысяч) белорусских рублей. Первоначальный взнос – 20%. Оставшиеся платежи равными частями не позднее мая 2017 г.

Формирование стоимости квадратного метра вышеназванных квартир производится на основании сводного сметного расчета с учетом затрат застройщика.

**Условия оплаты:** при заключении договора дольщик вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров, на момент заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата для всех категорий участников долевого строительства составляет 100% от стоимости квартиры (цены договора) и должна быть внесена не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Первоначальный взнос для всех дольщиков составляет не менее 20% от стоимости машино-места (цены договора) и должен быть внесен не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата по договорам создания объекта долевого строительства будет осуществляться в белорусских рублях.

Первоначальный взнос для всех дольщиков составляет 100% от стоимости административно-торгового помещения (цены договора) и должен быть внесен не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата по договорам создания объекта долевого строительства административно-торговых помещений будет осуществляться в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

**Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке:** в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 4 декабря 2014 г. № 3079 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства объекта». Свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на него от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7546; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7547; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7548; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7550.

**Площадь и границы земельного участка:** земельный участок площадью – 2,2393 га, расположен в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Элементы благоустройства:** комплекс работ по благоустройству включает устройство подъездов, пешеходных связей, установку малых архитектурных форм, озеленение, организацию детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок, площадок для отдыха взрослых.

**Количество в строящемся объекте строительства самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода объекта строительства в эксплуатацию:** общее количество квартир – 327, в том числе: однокомнатные – 54 единицы; двухкомнатные – 128 единиц; трехкомнатные – 145 единиц. Общее количество встроенных общественно-торговых помещений – 11 единиц. Общее количество машино-мест – 181 единица.

**Общее имущество объекта строительства, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта строительства в эксплуатацию и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и вентиляционные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, сантехническое, электрическое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их деятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в собственность дольщиков, если финансирование этих объектов осуществлялось дольщиками и передаются застройщиком товариществу собственников.

**Предполагаемый срок ввода объекта строительства в эксплуатацию:** окончание строительства – 9 мая 2017 г.

**Договор строительного подряда:** договор строительного подряда от 29 декабря 2014 г. № 03.01-05/7 заключен застройщиком с ОАО «Стройтрест № 35».

**Условия приема заявлений и ознакомления с объектом долевого строительства:** прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3. Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик вправе заключить договор с другим претендентом. Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – Общество с ограниченной ответственностью «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» (ООО «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс»), расположенном по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3, или по телефону: 8 (017) 292 42 19.

УНП 100220190

---

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Полоцк-торг», Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Евфросиньи Полоцкой, д. 21** |

**Предмет аукциона:**

**Лот №1**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Мариненко, 5**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Магазин №56** | Торговое помещение | 197 м.кв. | 250/D-1103 |
| **Здание склада** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 117 м.кв. | 250/С-11397 |
| Составные части и принадлежности | Основная пристройка | | |

**Сведения о земельном участке:** земельный участок, площадью 0,0531 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания магазина №56

| | |
|---|---|
| **Обременения** | Арендатор. Подробная информация на сайте организатора аукциона |

**Начальная цена с НДС 20% – 72 216 рублей 00 копеек (снижена на 50%) (722 160 000 белорусских рублей)**

**Лот №2**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, пр-д Октябрьский, д. 9**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| **Административное здание** | 1942 кв.м | 250/С-29605 | д. 9 |
| Составные части и принадлежности | 3 пристройки – кондитерский цех, материальный склад и ремонтная мастерская | | |
| **Здание склада** | 948 кв.м | 250/С-29607 | д. 9/1 |
| Составные части и принадлежности | склад (продовольственный), склад (материальный), наружные сети электроснабжения | | |
| **Здание столярной мастерской** | 628 кв.м | 250/С-29606 | д. 9/2 |
| Составные части и принадлежности | подвал, 2 пристройки (склады), склад стройгруппы, пристройка (склад) | | |
| **Водопроводная сеть** | 133,2 м | 250/С-41537 | д. 9 |
| **Канализационная сеть хозфекальная** | 145,9 м | 250/С-41539 | |
| **Тепловая сеть** | 89 м | 250/С-41538 | |
| Составные части и принадлежности | участок теплофикационного дренажа | | |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,8383 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания производственной базы. Ограничения: водоохранная зона реки Полота, площадь 0,8383 га

| | |
|---|---|
| **Обременения** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона. |

**Начальная цена с НДС 20% – 365 850 рублей 00 копеек (снижена на 50%) (3 658 500 000 белорусских рублей)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона по Лоту №1 опубликовано в газете «Звязда» 13.07.2016 г.; по Лоту № 2 – 29.06.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **12.09.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **09.09.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИЕ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПРУП «ГРОДНОЭНЕРГОСБЕРЕЖЕНИЕ»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | **Частное предприятие по антикризисному управлению «НисаБел» (230023, г. Гродно, ул. Телеграфная, 5-7, e-mail: nisabel@mail.ru, тел.: (029) 866 10 00, 80152 72 11 73)** |
| **Продавец** | **ПРУП «Гродноэнергосбережение» (230001, г. Гродно, проспект Космонавтов, 60В, управляющий (029) 8661000)** |
| **Форма проведения торгов** | **Торги в форме аукциона** |
| **Дата, время и место проведения торгов** | **15 СЕНТЯБРЯ 2016 года в 14.00 по адресу: 230003, г. Гродно, проспект Космонавтов, 60В** |
| | **Лот № 1** |
| **Сведения о предмете торгов** | Административное здание (1798,8 кв.м) |
| | Покрасочное отделение (411,5 кв.м) |
| | Складские помещения (652,9 кв.м) |
| | Гараж (509,3 кв.м) |
| | Компрессорное отделение (154,4 кв.м) |
| | Незавершенное не законсервированное капитальное строение (1130,2 кв.м) |
| | Проходная с электрощитовой (27,8 кв.м) |
| | Благоустройство территории (асфальтобетонное покрытие, цементобетонное покрытие, газон луговой, ограждение с воротами) |
| | Водопроводная сеть |
| | Линия наружного освещения |
| | Бытовая канализация |
| | Ливневая канализация |
| | Инструмент, материалы, машины и оборудование, транспортные средства, неустановленное оборудование, не введенные в эксплуатацию ОС, готовая продукция, товары |
| **Место нахождение предмета аукциона** | г. Гродно, ул. Обухова, 16. Земельный участок с кадастровым номером 440100000002003721, площадь – 1,2691 га, назначение – эксплуатация и обслуживание зданий и сооружений предприятия, вид имущественного права – постоянное пользование |
| **Начальная цена** | 700 000,00 (семьсот тысяч), в т.ч. НДС 20% |
| **Размер задатка для участия по лоту № 1** | 50 000,00 (пятьдесят тысяч) ) рублей |

| | |
|---|---|
| | **Лот № 2** |
| **Сведения о предметет торгов** | **Грузовой автомобиль «Фиат Дукато»** |
| **Начальная цена** | 2000,00 рублей, в т.ч. НДС 20% |
| **Размер задатка для участия в торгах по лоту № 2** | 500,00 (пятьсот) рублей |
| **Порядок проведения торгов** | Шаг аукциона составляет от 5% от начальной цены предмера аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает в себя НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) не позднее 30 дней со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (Пять) процентов.<br>Оплата вознаграждения и возмещение затрат за организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (покупателем) помимо оплаты стоимости предмета аукциона в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения аукциона.<br>Организатор торгов имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов и отказаться от его проведения |
| **Сроки приема задатка и порядка зачисления задатка** | Заявки принимаются с 9.30 до 17.00 по факсу (80152) 71-41-29, 74-41-02 и (или) электронной почте nisabel@mail.ru до 14.09.2016. Задаток перечисляется на р/с № 3012140195051 в ОАО «БАНК БЕЛВЭБ», БИК 153001226, получатель – ПРУП «Гродноэнергосбережение», УНП 590004154 |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявление на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка, документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах. Документы предоставляются **в срок до 17.00 14.09.2016.** Сроком поступления заявления является дата регистрации в журнале регистрации |
| **Публикации извещений о проведении торгов по продаже имущества ПРУП «Гродноэнергосбережение»** | По лоту № 1: Первые торги 22 марта 2016 г. газета «Звязда» от 20 февраля 2016 г. Первые повторные торги 28 апреля 2016 г. газета «Звязда» 9 апреля 2016 г., 28 мая 2016 г., в газете «Звязда» от 22.07.2016 г.<br>По лоту № 2: Первые торги 10 июня 2015 г. газета «Звязда» от 5 мая 2015 года № 82 (27940), первые повторные торги газета «Звязда» от 5 марта 2016 № 43 (28153), газета «Звязда» от 09.04.2016, в газете «Звязда» от 22.07.2016 г. |

## Запрашальнік

# ПРАЗ КРУГЛАЕ Ў СССР

### На Магілёўшчыне адкрылі ўнікальны музей, прысвечаны савецкаму мінуламу

**Бюсты правадыроў камуністычнага руху, патэфоны, першыя фотаапараты, грошы, нават сеткі, з якімі савецкія грамадзяне хадзілі ў краму — у незвычайным музеі знайшлося месца для 3 тысяч рэчаў часоў СССР. Такі падарунак сабе і ўсім, каму цікавая савецкая эпоха, зрабіла круглянская ПМК-266.**

— Ідэя належыць непасрэдна нашаму начальніку Мікалаю Патрончыку, а мы ўсе з задавальненнем яе падтрымалі. Экспанаты сабралі вельмі хутка, нават далёка не выязджаючы з раёна. Людзі, калі чулі, для якіх мэт мы ўсё гэта збіраем, аддавалі без шкадавання. Або прадавалі за сімвалічную цану. У аднаго пенсіянера, напрыклад, захавалася статуэтка Сталіна ў поўны рост. Ён спачатку не хацеў аддаваць, але потым пагадзіўся. Экспанат убачыць шмат людзей, ды і захаваецца ён лепш. Мы скампанавалі ўсе рэчы па раздзелах, і цяпер яны самі расказваюць, як мы жылі, — паведаміў **намеснік начальніка ПМК-266 па сацыяльных пытаннях Уладзімір АЛЯХНОВІЧ**.

Экспазіцыя вяртае ў эпоху татальных чэргаў, павальнага захаплення фотамастацтвам і добрага пазітыўнага кіно. Нават зроблена ў выглядзе кадраў з кінахронікі. Тут сабрана добрая калекцыя савецкіх грошай, фотаапаратаў, радыёл, магнітафонаў. Адзін з раздзелаў прысвечаны дзейнасці самой ПМК, якая адзначыла сёлета паўстагоддзя. Уласна кажучы, яна таксама родам з СССР.

Руплівыя захавальнікі гісторыі знайшлі месца нават для дэманціраванага з плошчы райцэнтра помніка Леніну. Пасля рэканструкцыі ён заняў месца побач з будынкам музея, запрашаючы павандраваць па савецкай мінуўшчыне.



Фота БелТА.

Дарэчы, гэты музей не адзіны на тэрыторыі этнатуркомплексу «Мікалаеўскія сажалкі», які размешчаны на месцы былой вёскі Лыскаўшчына ў Круглянскім раёне. Гэта месца вядома яшчэ і тым, што тут правёў апошнія гады свайго жыцця і быў пахаваны вядомы рускі мастак Мікалай Неўраў. ПМК-266 аднавіла домік, дзе ён жыў, і цяпер там можна ўбачыць мемарыяльную экспазіцыю і копіі яго славутых карцін. Побач створаны яшчэ і этнаграфічны музей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*zigulya@zviazda.by*



Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, г. Мінск.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** Карамелька. Кіно. Карт. Шакал. Хутар. Навар. Аграрн. Сава. Удача. Журнал. Жыта. Ананас. Багаж. Біс. Аорта. Напітак.

**Па вертыкалі:** Аіда. Апока. Егер. Актрыса. Аліва. Тхор. Кана. Талачын. Арэнда. Акула. Гну. Сажа. Вата. Жабрак. Асадак. Насып. Гора. Жбан.

Даты | Падзеі | Людзі

## 27 ЖНІЎНЯ

**1856** год — нарадзіўся Іван Франко, вядомы ўкраінскі пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч. Аўтар вершаваных зборнікаў «З вяршынь і нізін», «Завялае лісце», паэм «Майсей», «Смерць Каіна» і інш.

**1871** год — нарадзіўся Тэадор Драйзер, амерыканскі пісьменнік, публіцыст. Аўтар раманаў «Сястра Кэры», «Джэні Герхард», «Тытан», «Амерыканская трагедыя» і іншых. У 1927 годзе Драйзер прыняў запрашэнне наведаць СССР і прынясць удзел у святкаванні дзясятай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. У пачатку лістапада ён прыбыў у Савецкі Саюз і 7 лістапада быў на Краснай плошчы. Падчас свайго 77-дзённага падарожжа Драйзер пабываў у Ленінградзе, Кіеве, Харкаве, Растове-на-Доне, Баку, Тбілісі, Адэсе і іншых савецкіх гарадах, сустракаўся з Уладзімірам Маякоўскім і Сяргеем Эйзенштэйнам. Пасля паездкі апублікаваў кнігу «Драйзер глядзіць на Расію».

**1877** год — нарадзіўся Чарльз Ролс, брытанскі гоншчык і авіятар, сузаснавальнік кампаніі «Ролс-Ройс». Ён быў вельмі захоплены дасягненнямі тэхнічнага прагрэсу, аўтамабілямі і лятальнымі апаратамі: пастаянна ўдзельнічаў у гонках на самых разнастайных і па сучасных мерках нярэдка неймаверных машынах. Разагнаўшы аўтамабіль да 30 міль у гадзіну, ён паставіў першы нацыянальны рэкорд хуткасці. Яму заўсёды было мала дасягнутага, гэта яго і загубіла. 12 ліпеня 1910 года ён прымаў удзел у спаборніцтве на дакладнасць прызямлення на біплане. Яго біплан разваліўся ў паветры і разам з пілотам упаў на зямлю. Ролс стаў першым брытанцам, які загінуў у авіякатастрофе.

**1896** год — 120 гадоў таму нарадзілася Фаіна Ранеўская, легенда савецкага кіно. Яна была актрысай ад Бога. Актрысай, якая запаміналася гледачам нават па эпізадычных ролях, — на жаль, кіно палюбіла яе толькі ў якасці «характарнага персанажа». Яна не выканала ніводнай вялікай ролі сусветнага рэпертуару, аднак Брытанская энцыклапедыя менавіта яе імя ўключыла ў дзясятку найвялікшых акцёраў XX стагоддзя.



**1940** год — амерыканская кампанія CBS прадэманстравала першую сістэму каляровага тэлебачання, прыдатную для практычнага прымянення. Аднак першая ідэя эфірнай перадачы каляровых малюнкаў належала рускаму інжынеру Аванесу Адамяну, які сфармуляваў яе яшчэ ў 1907-1908 гадах. У 1925 годзе ім ужо была распрацавана сістэма трохколернага тэлебачання, тэхнічна рэалізаваная англійскім вынаходнікам Дж. Бэрдам у 1928 годзе.

### Было сказана

**Аркадзь Куляшоў, народны паэт Беларусі:**

*Карэнне ў дрэва ёсць апроч ствала,*
*Апроч карэнняў прагных ёсць насенне.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.09 | 20.11 | 14.02 |
| Віцебск — | 5.56 | 20.04 | 14.08 |
| Магілёў — | 5.59 | 20.01 | 14.02 |
| Гомель — | 5.59 | 19.55 | 13.56 |
| Гродна — | 6.25 | 20.26 | 14.01 |
| Брэст — | 6.29 | 20.23 | 13.54 |

## Месяц

*Апошняя квадра 25.08—31.08.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксея, Аркадзя, Васіля, Мікалая, Уладзіміра, Фёдара.*
***К.** Монікі, Цэзара, Юзафа.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +27..+29°С | КІЕЎ +28..+30°С | РЫГА +20..+22°С |
| ВІЛЬНЮС +23..+25°С | МАСКВА +20..+22°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +15..+17°С |

## УСМІХНЕМСЯ

— А з чаго вашу каўбасу робяць?
— Не скажу.
— Чаму?
— Каб гэта вымавіць, трэба гадоў пяць на хімічным факультэце вучыцца.

**— Дарагая, як адрэагавалі твае бацькі на наша рашэнне пажаніцца?**
**— Вельмі невыразная сітуацыя.**
**— Гэта значыць?**

**— Тата маўчыць, а мама чакае, калі ён выкажацца, каб вельмі рашуча запярэчыць яму!**

Як кажа цётка Ганна, сапраўдную жанчыну ніякім мужам не сапсуеш.

**Запіс у школьным дзённіку:**
**«Ваш сын адзіны, хто ўзяў у паход гарэлку! Дзякуй вам за сына!»**



Малюнак Уладзіміра ЧУГЛАЗАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3312.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12